Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

9 ЛІПЕНЯ 2008 г.
СЕРАДА
№ 125
(26238)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 367

АБ ВЫЗВАЛЕННІ Г.М. НЯВЫГЛАСА АД ПАСАДЫ КІРАЎНІКА АДМІНІСТРАЦЫІ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Вызваліць Нявыгласа Генадзя Мікалаевіча ад пасады Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сувязі з пераводам на іншую работу.

Залічыць генерал-лейтэнанта Г.М. Нявыгласа ў распараджэнне Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

8 ліпеня 2008 г.
г. Мінск.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 368

АБ ВЫЗВАЛЕННІ В.У. ШЭЙМАНА АД ПАСАДЫ ДЗЯРЖАЎНАГА САКРАТАРА САВЕТА БЯСПЕКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Вызваліць Шэймана Віктара Уладзіміравіча ад пасады Дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь у сувязі з пераводам на іншую работу (пункт 4 часткі другой артыкула 35 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь).

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

8 ліпеня 2008 г.
г. Мінск.

З выпіскай — пачакаць

Аб актыўнай выпісцы з бальніц пацярпелых ад выбуху падчас святочнага канцэрта «Мы — беларусы!» гаварыць заўчасна.

Як паведамляе прэс-цэнтр Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, у панядзелак са стацыянарных устаноў на амбулаторнае лячэнне быў пераведзены толькі адзін чалавек замест чатырох, як планавалася. Учора, у аўторак, не выпісаны ніводны пацыент.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Ва Ўрадзе

ДЗЯРЖЗАКУПКІ ДЭБЮРАКРАТЫЗАВАЦЬ

У вынесеным на ўчарашняе абмеркаванне Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі праекце ўказа, які рэгулюе дзяржзакупкі ў рэспубліцы, распрацоўшчыкамі ўлічаны дадзеныя Прэзідэнтам краіны Аляксандрам Лукашэнкам даручэнні па гэтым пытанні. Сутнасць апошніх — максімальна дэбюракратызаваць працэс дзяржзакупак і ўзмацніць адказнасць за выкананне патрабаванняў, што прадугледжаны заканадаўствам. Пасяджэнне прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага.

Як адзначыў намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур, у праекце ўказа былі захаваны ўсе базавыя прынцыпы і падыходы, якія склаліся ў рэспубліцы і адпавядаюць міжнароднай практыцы сістэмы дзяржзакупак, а менавіта заказчык расходуе бюджэтныя сродкі выключна на падставе выбару пастаўшчыка з некалькіх прэтэндэнтаў. Выходзячы ж з даручэнняў кіраўніка краіны, прынцыповыя змяненні ўносяцца ў схему дзеяння заказчыка. Раней, заўважыў Андрэй Тур, заказчык павінен быў прайсці доўгую працэдуру ўзгадненняў, каб ажыццявіць закупку. У якасці прыкладу ён узгадаў, што пры закупках на суму звыш 8 тысяч базавых велічынь (200 мільёнаў рублёў) заказчыку неабходна было ўзгадніць яе з вышэйстаячым органам. У тым жа выпадку, калі тавары, што набываліся, уваходзілі ў вызначаны Ўрадам і Прэзідэнтам пералік, то закупку патрэбна было ўзгадняць з рэспубліканскай ці абласной камісіяй па павышэнні канкурэнтаздольнасці эканомікі, а таксама перадаць паўнамоцтвы па яе правядзенні ў адпаведную рэспубліканскую міжведамасную камісію ці «Белрэсурсы». Калі кошт закупкі складаў звыш 200 тысяч базавых велічынь (7 мільярдаў рублёў), неабходна было прайсці ўзгадненні двойчы, пры гэтым пасля конкурсу неабходна было зацвердзіць вынікі ва Ўрадзе. Пры закупцы на суму звыш 500 тысяч базавых велічынь (17 мільярдаў рублёў), акрамя вышэйзгаданых узгадненняў, заказчык узгадняў яе з кіраўніком дзяржавы. Зразумела, усё гэта рабіла працэс закупкі вельмі грувасткім і доўгім і адбівалася як на яе аператыўнасці, так і на гаспадарчай дзейнасці арганізацыі. Паводле слоў намесніка міністра, працягласць некаторых працэдур дасягала 7—8 месяцаў. Што ж датычыцца самога заказчыка, то ён у пэўнай ступені быў пазбаўлены самастойнасці ў выбары пастаўшчыка, адказнасць перакладвалася на плечы тых органаў, якія забяспечвалі ўзгадненне закупкі.

У прапанаваным праекце ўказа павышаецца роля і адказнасць заказчыка і вышэйстаячых органаў дзяржкіравання праз сістэму рэгістрацыі і праз нормы, якія скасоўваюць дзейнасць рэспубліканскіх (абласных) міжведамасных камісій па закупках для патрэб аховы здароўя, сельскай гаспадаркі, перапрацоўчай прамысловасці, сілавых структур. У цэлым, падкрэсліў Андрэй Тур, прапанаваная і падрыхтаваная праектам сістэма дзяржзакупак забяспечыць спрашчэнне працэдур закупак і скароціць працягласць конкурсаў да трох месяцаў.

Разам з тым некаторыя прапановы, што ўчора агучваліся, не знайшлі падтрымкі ў прэм'ера. У прыватнасці, Сяргей Сідорскі лічыць мэтазгодным узважыць усе «за» і «супраць», прымаючы рашэнне аб адмене 15-працэнтнай прэферэнцыяльнай папраўкі да цаны тавару расійскай ці беларускай вытворчасці. Ён заўважыў, што замежныя вытворцы спрабуюць заваяваць беларускі рынак шляхам дэмпінгу: «У нас ёсць прэцэдэнты, калі замежныя кампаніі, каб завалодаць рынкам, гадамі дэмпінгуюць». Акрамя таго, кіраўнік Урада зазначыў, што пры ажыццяўленні дзяржзакупак трэба працаваць з самімі кампаніямі, а не з іх пасрэднікамі, таму што замежныя фірмы прапануюць заказчыкам прэферэнцыі пры закупках, а пасрэднікі на гэта не ідуць. Не згодзен прэм'ер і з тым падыходам, што для правядзення дзяржзакупак пры міністэрствах стварацца камерцыйныя прадпрыемствы. «Для ажыццяўлення дзяржзакупак ніякіх ЗАТ пры міністэрствах быць не павінна, — лічыць Сяргей Сідорскі. — Інакш гэта будзе зноў пасрэднік у працэдуры закупак». За гэтыя працэдуры, на думку прэм'ера, павінен адказваць міністр.

Андрэй Тур таксама праінфармаваў прысутных, што ва ўказе прадугледжваецца пашырэнне санкцый за парушэнне парадку дзяржзакупак для заказчыкаў, камісій па закупках і адказных асобаў. Ён удакладніў, што з улікам адмены абавязковага ўзгаднення прадугледжваецца 13 відаў санкцый са штрафам ад 5 да 50 базавых велічынь.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

У Беларусі ўстаноўлены абмежаванні на водпуск дызельнага паліва, якое рэалізоўваецца за наяўны разлік праз АЗС, што належаць РУП «ВА «Беларуснафта»

Установленая норма водпуску — 100 л на адну транспартную адзінку.

У Белнафтахіме патлумачылі, што абмежаванне ўведзена распараджэннем па РУП «ВА «Беларуснафта» і дзейнічае з 5 ліпеня. У канцэрне ўдакладнілі, што ў апошнія тры месяцы спажыванне дызпаліва ў Беларусі ўзрасло на 45 працэнтаў. З аднаго боку, гэта было выклікана пачаткам масавых палявых работ у рэспубліцы, з другога — яго вывазам за межы Беларусі вялікагрузным аўтатранспартам.

За парушэнні тэрмінаў выплаты зарплаты аштрафаны за 6 месяцаў 653 кіраўнікі арганізацый

Дзяржаўныя інспектары працы ў студзені—ліпені правялі больш як 7,3 тыс. праверак выканання найманымі нікамі тэрмінаў выплаты заработнай платы. Як паведамілі ў дэпартаменце дзяржінспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі, парушэнні заканадаўства аб працы выяўлены ў 836 арганізацыях розных формы ўласнасці.

Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 210 наймальнікаў, яны аштрафаваны ў памеры Br171,2 млн. Вынесены пастановы аб прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці 653 кіраўнікоў і іншых службовых асобаў з прымяненнем да іх санкцый у выглядзе штрафу на суму звыш Br157,7 млн.

Дэпартамент дзяржінспекцыі працы сумесна з абласнымі, Мінскім гарадскім камітэтамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, а таксама з упраўленнямі Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва ў першым паўгоддзі правёў 5,1 тыс. праверак выканання мінімальных гарантый памераў аплаты працы ў арганізацыях недзяржаўнай формы ўласнасці. У выніку выяўлена 7 арганізацый, што дапусцілі парушэнні заканадаўства аб працы ў частцы выплаты мінімальнай месячнай заработнай платы.

Акрамя таго, у арганізацыях недзяржаўнай формы ўласнасці за пяць месяцаў праведзена больш як 4 тыс. праверак парадку прымянення Адзінай тарыфнай сеткі работнікаў пры ўстанаўленні аплаты працы. Службовыя асобы 73 арганізацый, якія не выканалі патрабаванні Дэкрэта № 17, прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці, да іх прыменены санкцыі ў выглядзе штрафу на суму Br31,3 млн.

Кар. БЕЛТА.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 9.07.2008 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
1 долар ЗША	2 123,00	USD	23,5024
1 еўра	3 339,27	10 UAH	51,0367
1 латвійскі лат	4 747,85	1000 BYR	11,0652
1 літоўскі літ	966,96	EUR	36,8323
1 чэшская крона	141,42	*Курс у гандлёвых кампаніях (на 8.07.2008 г.)*	
1 польскі злоты	1010,18	USD	2135 / 2210
1 расійскі рубель	90,33		
1 украінская грыўня	459,52		

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08125>

Мікалай ФЯСЬКОЎ:

«У ТЭСТАХ НЕ БЫЛО НІВОДНАГА ЗАДАННЯ, ЯКОЕ Б ВЫХОДЗІЛА ЗА МЕЖЫ ШКОЛЬНАЙ ПРАГРАМЫ»

«Сённяшнія абітурыенты не разумеюць, што такое АБЕЛІСК і ТЭЛЕГРАМА»

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Тэсціраванне скончана. З учарашняга дня абітурыенты забіраюць сертыфікаты і падаюць дакументы. Да 11 ліпеня можна падаваць дакументы ў «творчыя» ВНУ, да 13 ліпеня — у ВНУ сілавых структураў. Прыём астатніх будзе праходзіць ужо з гэтай суботы. Завершыцца ўступная кампанія 4 жніўня.

НА ЗДЫМКУ: З сертыфікатамі ў руках выпускніца мінскай школы № 65 Улада МІГУН яшчэ больш упэўнена ў сваіх сілах.

Абітурыенты могуць уздыхнуць з палёгкай. Самае страшнае — цэнтралізаванае тэсціраванне — ужо за плячыма. З ліпеня Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў паставіў апошнюю пячатку ў апошнім сертыфікаце, а 7 ліпеня ўсе сертыфікаты (у тым ліку тых абітурыентаў, якія ўдзельнічалі ў тэсціраванні ў рэзервовы дзень) былі перададзены ў пункты правядзення тэсціравання.

Як паведаміў учора **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ,** для ўдзелу ў выпрабаваннях зарэгістравалася 179 264 абітурыенты, што на 86 тысяч менш, чым летась. Сярод іх толькі 44,8 працэнта — выпускнікі адукацыйных устаноў 2008 года, астатнія 17,8 працэнта — выпускнікі ПТВ і ССНУ 2008 года і 37,4 працэнта — выпускнікі мінулых гадоў. Не з'явіліся ў асноўны дзень 3,8 працэнта абітурыентаў ад ліку тых, якія зарэгістраваліся. У рэзервовы дзень выпрабаванні праігнаравалі 284 чалавекі.

— Яшчэ раз паўтараю, што ў тэстах не было ніводнага задання, якое б выходзіла за межы школьнай праграмы, — падкрэсліў Мікалай Сцяпанавіч. — Пакуль што рэктары ўніверсітэтаў у цэлым задаволеныя якасным складам сваіх студэнтаў. Калі ж якасць будзе зніжацца, то гэта не віна тэсціравання, прычыну трэба будзе шукаць ва ўзроўні падрыхтоўкі абітурыентаў. Вынікі ж сёлетняга тэсціравання паказалі, што найбольш падрыхтаваныя — выпускнікі гімназій і ліцэяў. Яны маюць перавагі над іншымі катэгорыямі абітурыентаў у сярэднім на 15—20 тэставых балаў.

— А чаму б тады не распрацаваць тэставыя заданні асобна для розных катэгорый абітурыентаў?..

— Тады б трэба было распрацоўваць тэсты і для абітурыентаў, улічваючы іх тэмпераменты (для флегматыкаў — адзін тэст, для сангвінікаў — іншы). Як тут быць аб'ектыўным, як вызначыць мяжу складанасці?.. Я лічу, што вынікі цэнтралізаванага тэсціравання ў дастатковай ступені дазваляюць дыферэнцыяваць абітурыентаў у адпаведнасці з узроўнем іх падрыхтоўкі і правесці якасны конкурсны адбор людзей, якія хочуць прадоўжыць навучанне ў ВНУ. Адна маці сказала, што каб яе дачцэ далі больш часу на выкананне тэста па біялогіі, дык яна б магла стаць студэнткай медыцынскага ўніверсітэта, а так давядзецца падаваць дакументы на біялагічны факультэт. Калі дзяўчына па тэмпераменце флегматык, магчыма, ёй і лепш разглядаць клеткі пад мікраскопам на ўроках біялогіі са школьнікамі, а не адказваць за жыццё іншых людзей, дзе часам патрэбна імгненная рэакцыя.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Хто падпаліў сена?

Такое пытанне ўзнікла пасля пажару ў складах СВК «Някрашанскі» Акцябрскага і КСУП «Свяцілавічы» Веткаўскага раёнаў. Там згарэла і пашкоджана агнём 110 тон кармоў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Прыемнае з карысным

ХОБІ НА ПЕНСІІ

Любому з нас у розныя перыяды жыцця бывае цеснавата ў межах таго, што мы ўмеем. Скажам, чаму б бухгалтару не асвоіць... мастацтва ландшафтнага дызайну, а журналісту — асновы надомнага масажу? А колькі людзей вымушаны пасля выхаду на пенсію застацца ў чатырох сценах замест таго, каб заняцца раскрыццём нераскрытых талентаў?.. Тым больш, што новае хобі можа з цягам часу стаць крыніцай дадатковага даходу ці хоць бы крыніцай эканоміі...

Адным словам, калі ў вас ёсць мара навучыцца чаму-небудзь новаму, асвоіць нарэшце занятак, на які раней не хапала часу, шукайце сустрэчы са спецыялістамі **Цэнтра сацыяльнай падтрымкі пры Беларускім саюзе жанчын** у Мінску. Варта заўважыць, што падобныя цэнтры вельмі хутка могуць з'явіцца і ў іншых гарадах рэспублікі.

Па-першае, нягледзячы на тое, што цэнтр быў адкрыты пры «жаночым саюзе», яго дзверы расчынены і для мужнай паловы. Па-другое, працэс навучання новым карысным справам для пэўных сацыяльных катэгорый, напрыклад, для шматдзетных і маламаёмасных сем'яў бясплатны, а для астатніх — істотна танейшы, чым у цэлым па горадзе...

Калі аднойчы сюды завітала пенсіянерка Ніна Міхайлаўна, яна не мела на мэце нічога канкрэтнага. Проста падумала: ну што ў 67 гадоў дома сядзець? Дзеці выраслі, прыйшоў час заняцца чым-небудзь новым. Так і спытала ў работніка цэнтра: а што ў вас наогул ёсць? Яе спрабавалі зацікавіць вышыўкай з вязанням, флярыстыкай, а яна выбрала для сябе... курсы хатняга масажу. «Вы ўяўляеце, — сказала тады работнікам цэнтра Ніна Міхайлаўна, — гэта ж я змагу цяпер усім сваім суседкам масаж рабіць! Як жа я «пабагацею» на новых сяброўках!..».

Паводле слоў дырэктара Цэнтра сацыяльнай падтрымкі Наталлі ПЯСЕЦКАЙ, асноўны накірунак тутэйшай работы — адукацыйны. Хлопцы і дзяўчаты, мужчыны і жанчыны любога ўзросту могуць «з нуля» на працягу, скажам, трох месяцаў асвоіць справу хатняга цырульніка (дарэчы, з асновамі манікюру і педыкюру). Ёсць курсы хатняга касметолага, хатняга масажыста, камп'ютарныя курсы для пачаткоўцаў. Працягласць навучання у цэлым залежыць ад асабістага жадання, скажам, ад таго, наколькі дасканала вы хочаце авалодаць працэсам.

У школе здароўя можна атрымаць спецыяльнасць інструктара па фітнэсе, а можна далучыцца да здаровага ладу жыцця, даведацца, што і як варта рабіць, каб быць адукаваным у гэтым сэнсе. У апошнім выпадку юрыст патлумачыць, як не трапіць на вуду шарлатанаў — распаўсюджвальнікаў лекавых сродкаў і біядабавак, не зарэгістраваных на тэрыторыі нашай краіны. Іншыя спецыялісты навучаць правільнаму харчаванню, асновам масажу, аздараўленчай гімнастыкі, натуральных спосабаў падтрымкі цела і духу ў выдатнай форме. Акрамя таго, удзельнікі групы здароўя атрымліваюць магчымасць проста папіць чайку, паразмаўляць аб чым заўгодна, што для больш сталых людзей не менш важна, чым новыя веды.

Вялікай папулярнасцю карыстаюцца заняткі па арганізацыі малога і сярэдняга бізнэсу, падчас якіх вопытныя спецыялісты тлумачаць любыя нюансы сістэмы маркетынгу, продажу, работы з кліентамі, нават пралічваюць з канкрэтным кліентам найбольш перспектыўныя і выгадныя накірункі дзейнасці. «Тым, хто толькі пачынае займацца малым прадпрымальніцтвам, бывае цяжка самастойна ва ўсім разабрацца, асабліва калі ўлічыць досыць частыя змяненні нашага заканадаўства, — кажа Наталля Пясецкая. — І наогул: куды, груба кажучы, бегчы з пачатку? Што найперш атрымліваць — гігіенічнае пасведчанне або сертыфікат? Спецыялісты даюць адказы на ўсе пытанні».

Дарэчы, сама Наталля Юр'еўна вядзе курсы кройкі і шыцця, пакольк і вельмі добра разбіраецца ў гэтай справе — у яе свая швейная фірма. Цэнтр сацыяльнай падтрымкі спадарыня Пясецкая ўзначаліла менш як паўгода таму, і ўсё, аб чым было сказана вышэй, створана з яе лёгкай рукі.

У планах — і досыць своеасаблівыя накірункі, падказаныя часам. Так, мяркуецца распачаць работу з будучымі матулямі і татамі: «рыхтавацца да родаў» не абавязкова выключна ў медыцынскіх установах.

Маладым бацькам прапануецца дашкольная падрыхтоўка дзяцей ва ўзросце ад 2,5 гадоў, а з верасня школьнікаў запрашаюць курсы рэпетытарства па розных дысцыплінах.

Сумесная беларуска-шведская камп'ютарная праграма стартуе ў хуткім часе для цяжкіх падлеткаў. Гэта будзе сур'ёзнае навучанне якому-небудзь карыснаму занятку — стварэнню сайтаў, напрыклад.

Бясплатную кансультацыю можна атрымаць у псіхолага і юрыста. Псіхолаг яшчэ праводзіць семінарскія заняткі і трэнінгі для групы работнікаў якога-небудзь прадпрыемства або фірмы.

— Наогул мы можам адгукнуцца на любое жаданне чалавека навучыцца чаму-небудзь новаму, — тлумачыць Наталля Пясецкая. — Калі арганізуецца група ахвотнікаў-аднадумцаў, мы знойдзем для іх лепшых выкладчыкаў і арганізуем заняткі. Калі нам раптам перастане хапаць «вытворчых плошчаў», будзем шукаць дадатковыя...

P.S. *З 1 жніўня пачнецца запіс ахвотнікаў пачаць навучанне з 1 верасня.* ***Тэл. 293 47 90.***

Святлана БАРЫСЕНКА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ДАЖДЖЛІВАЕ НАДВОР'Е ЗАХАВАЕЦЦА ДА ВЫХАДНЫХ

Фота Пятра ФАМІНА.

Учора з боку Польшчы ў Беларусь завітаў даволі актыўны атмасферны фронт, які выклікаў у сталічным рэгіёне часам вельмі моцныя дажджы, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

Ужо сёння на тэрыторыю краіны пачнуць паступаць паветраныя масы з боку Балтыйскага мора, таму ападкі будуць мець кароткачасовы характар. Разам з тым у сераду і чацвер невялікія навальнічныя дажджы будуць гаспадарыць на большай частцы краіны. А вось у пятніцу кароткачасовыя дажджы з навальніцамі чакаюцца толькі па ўсходняй палове краіны. Тэмпература паветра ўначы з серады да пятніцы 9—15, удзень 19—25 градусаў цяпла.

На выхадныя паветраныя патокі зменяцца на паўднёва-заходнія, таму да нас завітае больш цёплае паветра з боку поўдня Еўропы. Тэмпература паветра ўначы ў суботу 10—16, удзень 22—28, па паўднёвым захадзе да 30 градусаў. Істотна пацяплее ў нядзелю, калі ўначы чакаецца да 15—20 градусаў, удзень 25—30, а па паўднёвым усходзе нават да 32 цяпла. Кароткачасовыя дажджы з навальніцамі ў выхадныя чакаюцца толькі па паўночным захадзе краіны.

Сяргей КУРКАЧ.

НА АТРАКЦЫЁНЕ ПАЦЯРПЕЛІ ШАСЦЁРА

Вечарам у панядзелак у сталічным парку культуры і адпачынку імя Чалюскінцаў на адным з атракцыёнаў пацярпелі 6 жыхароў Мінска.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, надзвычайнае здарэнне адбылося каля сямі гадзін вечара. На атракцыёне «Ланцуговая карусель», што належыць таварыству з дадатковай адказнасцю, раптоўна сарвалася вертыкальная нясучая апора часткі ўмацавання пасадачных месцаў, якая крушылася. У выніку падзення траўмы рознай ступені цяжкасці атрымалі шэсць чалавек, чацвёра з якіх — няпоўнагадовыя. Двое з пацярпелых змешчаны ў бальніцу.

Фота Пятра ФАМІНА.

Зараз праверкай гэтага здарэння займаецца пракуратура Першамайскага раёна. Тэхнічная экспертыза вузлоў атракцыёна, які быў выраблены ў 1989 годзе ў Чэхаславакіі, павінна даць адказ на пытанне аб яго спраўнасці на момант здарэння.

Ігар ГРЫШЫН.

БРОНЗА — З КАНТЭЙНЕРА, ЦУКЕРКІ — З АЎТАМАБІЛЯ

Зніклі. У першым выпадку кошт бронзавых нарыхтовак, што знаходзіліся ў кантэйнеры аднаго з цэхаў Гомельскага завода станочных вузлоў, складаў звыш трох мільёнаў рублёў. А ў другім — кошт 57 каробак кандытарскіх вырабаў пацягнуў больш як на 1300 тысяч рублёў. Іх вадзіцель аднаго з прыватных прадпрыемстваў перавозіў з Мінска ў Гомель, і калі прыехаў у пункт прызначэння, недалічыўся ўказанай колькасці каробак. Выпарыліся яны, ці што, чухаў вадзіцель сваю патыліцу. А што сам недзе «варону злавіў», не падумаў...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

НЯЎДАЛЫ СПУСК

У Мінску апоўдні на вуліцы Галадзеда ўпала з вышыні 36-гадовая жанчына.

Непрацуючая мінчанка спрабавала на вяроўцы спусціцца з акна сваёй кватэры, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама. Між іншым, яе кватэра знаходзіцца на пятым паверсе. Аднак справіцца са спускам не змагла — сарвалася і ўпала ўніз. Няшчасная атрымала цяжкія цялесныя пашкоджанні, ад якіх загінула на месцы здарэння. Праверкай гэтага факта займаецца пракуратура Заводскага раёна.

Ігар ГРЫШЫН.

«ПРЫЗАВЫЯ» ТЭЛЕВІЗАРЫ АД «ЗВЯЗДЫ» — У КОЖНУЮ ВОБЛАСЦЬ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Учора у сценах рэдакцыі прайшоў традыцыйны штоквартальны розыгрыш прызоў сярод падпісчыкаў, якія аформілі сабе газету на II паўгоддзе (альбо 3-і квартал) 2008 года.

Прыемна, што ўсе, амаль тры дзесяткі звяздоўскіх падарункаў, знайшлі сваіх гаспадароў у самых розных кутках нашай краіны. Адметна, што на гэты раз разыгрывалася адразу 7 каляровых тэлевізараў «Віцязь» — па адным у кожную вобласць. А самым галоўным прызам стаў халадзільнік «Атлант».

Як і заўсёды, вяршыцелямі лёсу чытачоў «Звязды» сталі нашы госці. На гэты раз шчасліўчыкі ў латарэі вызначаліся з лёгкай рукі начальніка Мінскага аб'ядынанага цэха паштовай сувязі Алены Аляксандраўна ШЧУК і нашай падпісчыцы, настаўніцы сталічнай школы-інтэрната № 10 Валянціны Сямёнаўны ЁРШ.

Падрабязнасці розыгрышу і спісы пераможцаў — у наступным нумары газеты.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

«У ТЭСТАХ НЕ БЫЛО НІВОДНАГА ЗАДАННЯ, ЯКОЕ Б ВЫХОДЗІЛА ЗА МЕЖЫ ШКОЛЬНАЙ ПРАГРАМЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мікалай Сцяпанавіч акрэсліў таксама і асаблівасці цэнтралізаванага тэсціравання гэтага года.

— Па-першае, конкурсны адбор у ВНУ (за выключэннем Міністэрства культуры, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства абароны) ажыццяўляецца толькі па выніках трох выпрабаванняў цэнтралізаванага тэсціравання. Па-другое, сертыфікаты мы афармлялі толькі тым абітурыентам, якія маюць тэставы бал, што адпавядае адзнацы вышэй за два балы па дзесяцібальнай сістэме адзнакі. Па-трэцяе, мы вярнуліся да агульнапрынятай практыкі ўстанаўлення пераведзенай шкалы (асобна па кожным прадмеце і толькі пасля правядзення цэнтралізаванага тэсціравання). І, нарэшце, уведзена плата за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні.

Што тычыцца структуры і зместу тэстаў, то з улікам прапаноў Дзяржаўнай камісіі па кантролі за правядзеннем уступных выпрабаванняў у ВНУ і ССНУ была праведзена ўніфікацыя тэставых заданняў. У структуры тэстаў павялічылася доля заданняў у частцы В і скарацілася ў частцы А.

— Гэта змена дазваляе больш аб'ектыўна ацаніць веды кожнага абітурыента. Бо нярэдка пры праверцы тэстаў мы сутыкаемся з тым, што абітурыенты ставяць «крыжыкі», нават папярэдне не чытаючы заданне. Напрыклад, пасля таго, як абвясцілі вынікі па рускай мове, нам патэлефанаваў мужчына з Віцебска, які заявіў, што яго сын не мог здаць мову, на якой маці, у чым прычына, яна сказала, што «чытаць трэба больш». Залатыя словы, бо сапраўды, што тут гаварыць, калі замест «мастацкі стыль», многія пішуць «художны»…

ЗНАЧЭННІ ТЭСТАВАГА БАЛА, ПАЧЫНАЮЧЫ З ЯКОГА АДЗНАКА ЎСТУПНАГА ВЫПРАБАВАННЯ ПА ПРАДМЕЦЕ ЛІЧЫЦЦА СТАНОЎЧАЙ:

— беларуская мова — 13 балаў;
— руская мова — 13 балаў;
— матэматыка — 8 балаў;
— гісторыя Беларусі — 17 балаў;
— сусветная гісторыя навейшага часу — 17 балаў;
— Чалавек. Грамадства. Дзяржава — 16 балаў;
— фізіка — 8 балаў;
— геаграфія — 18 балаў;
— біялогія — 18 балаў;
— хімія — 16 балаў;
— замежная мова — 16 балаў.

Да ліку ж абітурыентаў, якія набралі дзесяць і менш тэставых балаў адносяцца ў асноўным выпускнікі мінулых гадоў, якія не прайшлі раней па конкурсе, і выпускнікі ПТВ (70 працэнтаў).

У ходзе тэсціравання 37 абітурыентаў былі пазбаўленыя магчымасці стаць студэнтамі, бо парушылі ўстаноўленыя правілы (карысталіся шпаргалкамі, выдавалі сваякоў замест сябе, нават спрабавалі зарэгістравацца двойчы). Дарэчы, для таго, каб пазбавіцца такіх «двайнікоў», у будучым плануем распрацаваць новую камп'ютарную праграму, якая дазволіць абітурыентам праходзіць рэгістрацыю на цэнтралізаванае тэсціраванне ў рэжыме «on-line».

Надзея ДРЫЛА.

ПРЫЗЫ І ПАДАТКІ

Рэгулярна ўдзельнічаю ў рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду». Пакуль што нічога не выйграў, але надзеі не пакідаю. Мяне цікавіць вось што. Калі я што-небудзь выйграю, ці патрэбна мне будзе потым здаваць дэкларацыю ў падатковую інспекцыю? Акрамя пенсіі, іншых даходаў не маю, нідзе не працую.

Паўлаў Д.М., *г. Маладзечна*

Згодна з пунктам 11 артыкула 23 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падаходным падатку з фізічных асобаў» ад 21.12.1991 са зменамі і дапаўненнямі па стане на 26.12.2007 г., не падлягаюць дэкларыванню даходы, якія поўнасцю не абкладаюцца (вызваляюцца ад падаткаабкладання) або вызваляюцца ад падаткаабкладання ў межах, устаноўленых пунктам 1 артыкула 12 гэтага Закона.

Пунктам 1 артыкула 12 Закона ўстаноўлена, што не падлягаюць падаткаабкладанню (вызваляюцца ад падаткаабкладання) пенсіі (падпункт 1.2), а таксама даходы, якія не з'яўляюцца ўзнагароджаннямі за выкананне працоўных і іншых абавязкаў, атрыманыя ад арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, у тым ліку ў выглядзе прызоў, у межах ста пяцідзесяці базавых велічынь у суме ад усіх крыніц на працягу падаткавага перыяду (падпункт 1.17).

Падатковым перыядам, згодна з артыкулам 11 Закона, прызнаецца каляндарны год.

Базавая велічыня на цяперашні час складае 35 000 рублёў (пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 02.11.2007 г. № 1446). Адпаведна сто пяцьдзесят базавых велічынь складаюць суму 5 250 000 рублёў.

Кошт такога, напрыклад, прыза, як халадзільнік, складае, згодна з апошнімі Правіламі рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду», 873 580 рублёў, што адпавядае амаль 25 базавым велічыням.

Такім чынам даходы, якія вы можаце атрымаць ў выглядзе прыза па выніках гэтай рэкламнай гульні, дэкларыванню не падлягаюць, паколькі пенсія вызваляецца ад падаткаабкладання поўнасцю, а кошт прыза не перавышае ста пяцідзесяці базавых велічынь. Аднак, калі на працягу года вы яшчэ атрымаеце ад іншых арганізацый ці індывідуальных прадпрымальнікаў прызы або даходы, якія не з'яўляюцца ўзнагароджаннямі за выкананне працоўных і іншых абавязкаў, і іх агульная сума перавысіць сто пяцьдзесят базавых велічынь, то дэкларавацъ даходы будзе патрэбна.

Для заспакаення вы можаце атрымаць кансультацыю па пытанні дэкларавання атрыманых даходаў у падатковай інспекцыі па месцы свайго жыхарства.

Кватэрнае пытанне

Уласны дом? Ва ўласнасць і кватэры

Прыватны дом нашых бацькоў сёлета плануюць зносіць. І мы ўжо ведаем, дзе яны атрымаюць кватэру. Адно — бацьку і маці яе як быццам даюць ва ўласнасць, а сям'і брата — паводле дагавора найму. Ці законна гэта?

Г. Сазонік.

У адпаведнасці з арт. 104 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь ў выпадку зносу аднакватэрнага блочнага жылога дома, пабудоў і збудаванняў пры ім, якія належаць на момант зносу грамадзяніну на праве ўласнасці, у сувязі з канфіскацыяй зямельнага ўчастка для дзяржаўных патрэб, указанаму грамадзяніну сумесна з членамі яго сям'і даецца за кошт адпаведных прадпрыемстваў, установ, арганізацый, якім адводзіцца зямельны ўчастак, па выбары грамадзяніна права на:

атрыманне ва ўласнасць добраўпарадкаванай кватэры, якая адпавядае патрабаванням Жыллёвага кодэкса (жылое памяшканне выдзяляецца ў межах ад 15 да 20 кв. метраў агульнай плошчы на аднаго чалавека. Жылое памяшканне можа быць выдзелена з перавышэннем максімальнай нормы выдзялення агульнай плошчы, калі яно складае аднапакаёвую кватэру або прызначана для пражывання грамадзян рознага полу, акрамя мужа і жонкі, а таксама ў выпадку выдзялення дадатковай плошчы. Грамадзянам, якія пакутуюць на цяжкія формы хранічных захворванняў, звыш мінімальнай нормы выдзялення агульнай плошчы жылога памяшкання выдзяляецца дадатковая плошча ў выглядзе пакоя або ў памеры пятнаццаці квадратных метраў агульнай плошчы. Пералік захворванняў, якія даюць права на атрыманне дадатковай плошчы, устанаўліваецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання па ахове здароўя);

будаўніцтва і (або) атрыманне ва ўласнасць жылога дома, пабудоў і збудаванняў пры ім, раўнацэнных тым, што зносяцца, па добраўпарадкаванні і агульнай плошчы;

перанос і аднаўленне пры наяўнасці тэхнічнай магчымасці дома, які зносіцца, пабудоў, збудаванняў і насаджэнняў пры ім;

атрыманне грашовай кампенсацыі за дом, які зносіцца, пабудовы, збудаванні і насаджэнні пры ім, што вызначаецца на падставе заключэння экспертызы аб кошце жылога дома, пабудоў, збудаванняў і насаджэнняў пры ім.

Выдзяленне членам сям'і ўласніка дома, што зносіцца, жылых памяшканняў паводле дагавора найму жыллёвым заканадаўствам, якое дзейнічае, не прадугледжана.

Спрэчкі, звязаныя з прызнаннем права ўласнасці на жылое памяшканне, атрыманае ў сувязі са зносам дома, які належыць грамадзяніну на праве ўласнасці, разглядаюцца ў судовым парадку.

Віктар САВІЦКІ.

Спорт-тайм

БЕЛАРУСКІ ШАБЛІСТ — ЧЭМПІЁН ЕЎРОПЫ!

На чэмпіянаце Еўропы па фехтаванні ў Кіеве 23-гадовы беларус Аляксандр Буйкевіч у турніры шаблістаў у фінальным паядынку перамог расіяніна Аляксея Якіменку — 15:11.

Астатнія нашы шаблісты выступілі наступным чынам: Валерый Прыёмка — 27-е месца, Дзмітрый Лапкес — 35-е, Аляксей Рамановіч — 38-е сярод 55 фехтавальшчыкаў. Напярэдадні турніру прэзідэнт Еўрапейскай канфедэрацыі фехтавання (EFC) расійскі алігарх Алішэр Усманаў аб'явіў аб павелічэнні прызавога фонду маючага адбыцца чэмпіянату Еўропы ў два з паловай разы — са 100 тыс. да 250 тыс. еўра. Такім чынам, чэмпіёны Еўропы ў асабістым заліку атрымаюць па 10 тыс. еўра, сярэбраныя прызёры — па 6 тыс., бронзавыя — па 3 тыс.

МАКАРАЎ ПЕРАМОГ НЕМЦАЎ

Чэмпіён Алімпіяды-2004 беларус Ігар Макараў выйграў у нямецкім Браўншвейгу Адкрыты чэмпіянат Германіі ў вагавой катэгорыі звыш 100 кг.

Прычым у паядынку за «золата» ён адолеў свайго суайчынніка Аляксандра Вахавяка. У паўфінале беларускія суперцяжкавагавікі выйгралі ў лідараў расійскай каманды. Макараў зламаў супраціўленне трохразовага чэмпіёна свету Аляксандра Міхайліна, а Вахавяк кінуў на ілопн Рустэма Арсланава.

ЗА МЕДАЛЬ — МЯСА ПАЖЫЦЦЁВА!

На ўшанаванні нацыянальнай жаночай баскетбольнай зборнай краіны, якое адбылося ў нядзелю, генеральны дырэктар ЗАТ «Беластміт» (гандлёвая марка «Мясаград») Барыс Цыпорын заявіў аб тым, што ў выпадку выйгрышу камандай медалёў любой вартасці на Алімпіядзе-2008 кожны гулец будзе пажыццёва забяспечаны мяснымі і каўбаснымі вырабамі ад «Мясаграда». Акрамя таго, паабяцаў, што такі лёс чакае кожнага беларускага спартсмена, якому ўдасца падняцца на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару ў Пекіне.

МТЗ ГРАМІЦЬ НАВІЧКА

Пасля матчаў 13-га тура чэмпіянату Беларусі па футболе барысаўскі БАТЭ па-ранейшаму ўзначальвае турнірную табліцу.

9-ю перамогу ў цяперашнім першынстве з лікам 3:1 барысаўчане атрымалі ў гасцях над брэсцкім «Дынама». Сталічны МТЗ-РІПА таксама не пакінуў шанцаў сваім сапернікам, разграміўшы ў сябе дома навічка вышэйшага дывізіёна магілёўскі «Савіт» — 6:2. Барысаўчане лідзіруюць з 31 ачкамі, у трактаразаводцаў 26, на трэцім месцы ідзе «Віцебск» (25), які згуляў учынію — 1:1 на сваім полі з «Нафтанам». Вынікі астатніх сустрэч 13-га тура: «Лакаматыў» (Мінск) — «Гомель» — 0:0, «Тарпеда» (Жодзіна) — «Граніт» (Мікашэвічы) — 0:2, «Дарыда» (Мінскі раён) — «Смаргонь» — 0:1, «Днепр» (Магілёў) — «Нёман» (Гродна) — 2:1, «Дынама» (Мінск) — «Шахцёр» (Салігорск) — 1:0. Адзначым таксама, што салігорскія футбалісты свой матч чэмпіянату краіны правялі раней, а напярэдадні згулялі ў другім раўндзе розыгрышу Кубка Інтэртота ў гасцях у аўстрыйскага клуба «Штурм». У Грацы падапечныя Юрыя Вяргейчыка ўступілі з лікам 0:2. Паядынак у адказ адбудзецца 13 ліпеня ў Салігорску.

ГАМБІТ-НАКАЎТ

Расіянін Мікалай Сахын стаў чэмпіёнам свету па «шахматабоксе» (чэсбоксінгу), у якім спартсмены чаргуюць чатыроххвілінныя адрэзкі шахматнай партыі з троххвілінныміі баксёрскімі раўндамі. У фінале чэмпіянату свету, які завяршыўся ў Берліне, Сажын перамог немца Франка Штольта.

Заснавальнікам чэсбоксінгу ў 2003 годзе стаў галандскі мастак Йепе Рубінг, які пазычыў ідэю ў французскага аўтара коміксаў Энкі Білаля. У цяперашні час спартсмены пачынаюць бой за шахматнай дошкай, а праз чатыры хвіліны працягваюць сапернічтва па правілах бокса. Баксёрскі раўнд доўжыцца тры хвіліны. Перад тым, як вярнуцца за шахматную дошку, сапернікі здымаюць пальчаткі і надзяваюць навушнікі, каб ім не перашкаджаў шум балельшчыкаў. Паядынак працягваецца 11 раўндаў — шэсць шахматных і пяць баксёрскіх.

Пераможца можа вызначыцца па ачках, накаўтам, а таксама калі адзін сапернік паставіць другому мат. Акрамя таго, удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваныя за вельмі доўгае абдумванне шахматных ходаў або за парушэнне правілаў бокса.

НАШЫ НА «ТУР ДЭ ФРАНС»

У французскім Брэсце стартавала самая прэстыжная шматдзённая велагонка ў свеце — «Тур дэ Франс», якая вядзе свой летапіс з 1903 года.

Другі год запар у супершматдзённы бяруць удзел беларусы Аляксандр Кучынскі з італьянскай каманды «Ліквігас» і Канстанцін Сіўцоў з дружыны «Хай Роўд» (ЗША). 25-гадовы Сіўцоў пакуль займае 95-е месца ў агульным заліку, уступаючы лідару 1 хвіліну 52 секунды.

Абзац

■ Прычынай спынення ўсіх энергаблокаў стаў выхад са строю мікрасхемы, якая забяспечвае работу станцыі па ўсяму ланцужку, адзначыў міністр энергетыкі Беларусі Аляксандр Азярэц. Ён патлумачыў, што менавіта гэта стала прычынай таго, што аварыя на 8 блоку не была лакалізаваная, а прывяла да адключэння яшчэ сямі блокаў. Аляксандр Азярэц упэўнены, што «такога больш не паўтарыцца ні на Лукомльскай ДРЭС, ні на любой другой станцыі».

■ У Буда-Кашалёўскі райаддзел па надзвычайных сітуацыях учора паступіла паведамленне аб узгаранні аўтамабіля «Івека», які перавозіў каля 20 т піва і напояў. Як аказалася, у аўтамабілі загарэлася шына, затым полымя ахапіла паўпрычэп. Вадзіцель не змог самастойна справіцца з агнём і звярнуўся па дапамогу да супрацоўнікаў МНС. Полымя было лакалізаванае, найбольш пацярпеў паўпрычэп, часткова знішчана прадукцыя. Высвятляюцца прычыны здарэння. Адна з папярэдніх версій — закліньванне тармазных калодак.

■ За выдзяленне віртуальнага ўчастка зямлі плошчай 600 кв.м у цэнтры Рэчыцы гомельскі прадпрымальнік аддаў $8 тыс. У такую суму ацаніў вырашэнне пытання мясцовы жыхар, які вызваўся дапамагчы, спаслаўшыся на сувязі ў мясцовых органах улады. Падчас перадачы хабару ад камерсанта ён быў затрыманы супрацоўнікамі праваахоўных органаў. Мужчына аказаўся раней судзімым за разбой. Узбуджана крымінальная справа.

■ У Крыме падчас атрымання хабару на суму звыш 5 млн даляраў затрыманы старшыня Партэніцкага пасялковага Савета (Вялікая Алушта). За гэтыя грошы прадстаўнік улады павінен быў пасадзейнічаць у выдзяленні 17 га зямлі, што належыць пасялковаму савету. Яго тут жа назвалі хабарнікам-рэкардсменам. Дарэчы, змясцілі яго ў платную камеру павышанага камфорту. Штомесячнае пражыванне ў такой камеры каштуе для зняволенага 300 даляраў.

■ Сёлета на пачатак года на ўліку ў ДАІ ў Беларусі стаіць больш за 376 тыс. «жыгулёў», якія належаць прыватным аўтаўладальнікам. На другім месцы — «Фальксваген» (каля 276 тыс.). У пяцёрку лідараў уваходзяць «Масквіч» і «Запарожац», якіх у насельніцтва адпаведна 179 і 107 тысяч. Па звестках Дзяржаўтаінспекцыі, сярод машын расійскай і ўкраінскай вытворчасці нямала такіх, якія стаяць на ўліку, аднак на іх даўно ніхто не ездзіць. У дзесятку лідараў уваходзяць «Аўдзі» (каля 152 тыс.), «Форд» — каля144 тыс., «Опель» — каля 135 тыс., «БМВ» — больш за 106 тыс., «Рэно» — каля 80 тыс., «Мерседэс-бэнц» — 64 тыс. У нашай краіне 227 «Поршаў», 182 «Лінкальны». 167 грамадзян краіны ездзяць на «Ягуарах», 137 — на «Кадзілаках». На дарогах Беларусі вам могуць сустрэцца 42 «Хамеры». Нядаўна ў ДАІ зарэгістраваны першы «Ферары» 2008 года выпуску. 4 жыхары краіны маюць «Бентлі», 7 — «Мазэраці». Цяпер у краіне каля 2,1 млн легкавых аўтамабіляў. За апошнія 2—3 гады жыхары Беларусі сталі купляць на 60 працэнтаў больш новых аўтамабіляў.

■ Надрукаваны рэйтынг самых крымінальных гарадоў Расійскай Федэрацыі: першае месца ў ім займае Сургут, другое — Цюмень, трэцяе — Перм. Абедзве сталіцы — Масква і С.—Пецярбург — знаходзяцца за межамі першай сотні (112-е і 122-е месцы апаведна). Узровень крымінальнасці вызначаецца па колькасці зарэгістраваных злачынстваў на душу насельніцтва. Для параўнання: у Сургуце здзяйсняецца штогод 493 злачынствы на кожныя 10 тыс. жыхароў, у Маскве — усяго 198. У першай дзесятцы апынуліся таксама Сыктыўкар, Беразнікі Пермскага краю, Хабараўск, Чыта, Якуцк, Іркуцк і Абакан.

■ На спецыяльным аўкцыёне ў Балгарыі былі спушчаныя з малатка калекцыйныя лімузіны савецкай эпохі. На іх перавозілі такіх вядомых палітыкаў, як Гарбачова, Кастра, Мітэрана і інш. Усяго пакупнікам было прапанавана 66 машын, з якіх 20 лімузінаў «Чайка». Стартавы кошт «Чаек» складаў ад 8,5 тыс. да 11,5 тыс. еўра. У таргах прынялі ўдзел больш за сто чалавек. Адзін з іх набыў адразу восем лімузінаў. Усе выручаныя грошы — больш за 260 тыс. еўра — будуць накіраваныя на куплю новых аўтамабіляў для Нацыянальнай гвардыі краіны.

■ У Крыме ахвярамі шалёнай бадзяжнай кошкі сталі пяць чалавек. Каля аднаго з сёлаў бяздомная жывёліна «акупавала» дарогу і нападала на кожнага, хто асмельваўся зайсці на яе тэрыторыю. Пяцёра атрымалі драпіны і ўкусы рук і ног, цяпер яны праходзяць лячэнне. Кошку злавілі, яна аказалася хворай на шаленства. Дарэчы, у Беларусі толькі ў чэрвені зарэгістравана 68 выпадкаў шаленства жывёлы. У іх ліку 51 дзікая жывёліна, 10 — хатнія гадаванцы, 7 сельскагаспадарчых жывёлін.

Поўны абзац

■ Тыдзень таму на Дзень Канстытуцыі ва Ўкраіне прэзідэнт краіны Віктар Ющчанка разам з усімі саджаў кусты каліны. Толькі пасадзілі, як заггасы недалічыліся некалькіх рыдлёвак, аб чым праведалі журналісты. Кожная рыдлёўка каштавала 250 грыўняў. Куды падзеўся прэзідэнцкі рэквізіт, прэс-служба каментаваць згадзілася не адразу. Толькі нядаўна было заяўлена, што рыдлёўкі не гублялі, а прэзідэнт сам падарыў іх сваім падначаленым, якія ўсё ж вярнулі інструмент. Увогуле ў сакратарыяце ўкраінскага прэзідэнта больш за 20 рыдлёвак. Але элітных, па 50 даляраў, толькі 5.

■ Паўгадзіны мыцця пры тэмпературы 40 градусаў па Цэльсію вытрымаў рыжы кот Арыён у адным галандскім горадзе. Кот пайшоў пагуляць з дому гаспадыні, зайшоў да суседкі і залез у пральную машыну. Жанчына без усялякіх падазрэнняў заклала ў машыну бялізну і ўключыла праграму мыцця пры сарака градусах. Праз паўгадзіны яна пачула нейкія гукі, што даносіліся з машыны — там нехта скробся. Калі з машыны вылез мокры кот, яна ацаніла яго стан як «падобны на ап'яненне». Тэрмінова быў выкліканы ветэрынар. Пасля ўколаў, таблетак і мазэў стан ката палепшыўся, ён толькі часта міргае вачыма з-за таго, што ў іх трапіў мыйны сродак. Ды хвост крыху прышчаміла.

■ Дэпутатам Нацыянальнай асамблеі Бутана забаранілі прыносіць на пасяджэнні парламента ноўтбукі — з-за апасення, што «слугі народа» будуць прысвячаць працоўны час камп'ютарным гульням і разгляду пікантных карцінак. Нягледзячы на тое, што многія дэпутаты пратэставалі і спрабавалі сцвярджаць, што ноўтбукі намнога зручнейшыя, чым папяровыя дакументы, ім строга забаранілі прыносіць партатыўныя камп'ютары на пасяджэнні.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

КАНДАЛІЗУ РАЙС СУСТРЭЛІ Ў ПРАЗЕ ВЕЛІЗАРНАЙ МІШЭННЮ

Актывісты арганізацыі «Грынпіс» у аўторак, 8 ліпеня, разгарнулі на пагорку Лётная ў Празе велізарны плакат з малюнкам мішэні.



Такім чынам «грынпісаўцы» дэманструюць свой пратэст супраць рашэння чэшскага ўрада дазволіць размяшчэнне на тэрыторыі краіны элементаў супрацьракетнай абароны ЗША. Акцыя актывістаў прымеркаваная да аднадзённага візіту ў Прагу дзяржсакратара ЗША Кандалізы Райс, якая павінна падпісаць са сваім калегам Карэлам Шварцэнбергам дагавор аб размяшчэнні аб'ектаў ПРА.

ПАД'ЕЗДЫ ДА КІЕВА БЛАКАВАЛІ ТЫСЯЧЫ ГРУЗАВІКОЎ



Тысячы грузавых машын у аўторак сабраліся на ўязных дарогах у сталіцу Украіны. Такім чынам аўтаперавозчыкі пратэставалі супраць забароны на праезд у горад у дзённы час суток. Па даных арганізатараў акцыі, у ёй бяруць удзел да 5 тысяч грузавікоў.

З раніцы аўтамабілі ўжо выбудаваліся ў калоны на подступах да Кіева, абяцаючы заблакаваць уезд у сталіцу з Жытомірскай трасы і стварыць заторы на мастах праз Днепр. Дэлегацыі фірмаў аўтаперавозчыкаў узялі таксама ўдзел у мітынгу пратэсту побач з будынкам мэрыі, якая і вынесла забарону.

АМЕРЫКАНСКІЯ СТУДЭНТЫ ЎПІВАЮЦЦА ДА СМЕРЦІ

Смерць ад празмернага п'янства стала даволі тыповай для амерыканскіх студэнтаў каледжаў. Такую выснову зрабіла The Associated Press на аснове праведзенага даследавання.

Так, згодна з афіцыйнымі звесткамі, у перыяд з 1999 па 2005 год памерлі ад атручвання алкаголем 157 чалавек універсітэцкага ўзросту. Штогадовая колькасць такіх смярцей за сямігадовы перыяд вырасла амаль удвая — з 18 у 1999-м да 35 у 2005 годзе. 83 ахвяры алкаголю не дасягнулі 21 года — афіцыйнага ўзросту, у якім амерыканцы могуць пачаць піць.

Даследаванне 2006 года паказала, што навучэнцы каледжаў ва ўзросце ад 18 да 22 гадоў часцей напіваюцца да непрытомнасці, чым іх аднагодкі, якія не вучацца. АР таксама ўстанавіла, што групай асабліва рызыкі з'яўляюцца першакурснікі, прычым 11 з 18 смяротных выпадкаў з іх удзелам, зафіксаных у прэсе, адбыліся падчас першага семестра заняткаў.

Асабліва небяспечнымі лічацца звязаныя з алкаголем звычаі, да прыкладу, выпіванне 21 чаркі на дваццаць першы дзень нараджэння, і разнастайныя алкагольныя гульні і спаборніцтвы.

АМЕРЫКАНЕЦ НА ЗВЯЗЦЫ ПАВЕТРАНЫХ ШАРОЎ ПРАЛЯЦЕЎ ПАМІЖ ШТАТАМІ

Адно з самых авантурных вандраванняў распачаў у выхадныя амерыканец Кент Коўч — ён здзейсніў пералёт са штата Арэгон у штат Айдаха на велізарнай звязцы паветраных шароў. Працягласць незвычайнага падарожжа склала каля 380 кіламетраў.

Для ўвасаблення сваёй даўняй дзіцячай мары 48-гадоваму ўладальніку аўтазаправачнай станцыі ў горадзе Бэнд спатрэбілася 150 гіганцкіх святочных шароў, напоўненых геліем. Яны былі прывязаныя да звычайнага садовага крэсла.



Палёт працягваўся дзевяць гадзін, пасля чаго «паветраплавальнік» пачаў зніжаць хуткасць, страляючы па шарах са свайго драбавіка, і ў выніку паспяхова прызямліўся на лужку ў штаце Айдаха, дзе яго ўжо сустракалі дзесяткі мясцовых жыхароў.

Варта адзначыць, што гэта ўжо трэці такі палёт непапраўнага летуценніка і «вар'ята», як заве Коўча яго жонка. Аднак, не ўсе такія прадпрыемствы заканчваліся ўдала. У красавіку 2008 года загінуў святар Адэлір дэ Карлі, які спрабаваў пабіць рэкорд па знаходжанні ў паветры на геліевых шарах.

Сталічныя аб'езды

З 8 ліпеня закрываецца рух транспарту па праспекце Машэрава на ўчастку ад вуліцы Цімірязева да Заслаўскай. Гэта звязана з выкананнем работ па рэканструкцыі праезнай часткі праспекта.

Як паведаміў карэспандэнту «Мінск—Навіны» намеснік начальніка ўпраўлення ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Канстанцін Страх, рух транспарту тут адноўіцца не раней чым 31 снежня. Дзяржаўтаінспекцыя просіць загадзя выбіраць маршрут руху ў гэтым раёне. ДАІ таксама папярэджвае аб магчымых заторах на перакрыжаваннях вуліц Цімірязева і Клары Цэткін, Цімірязева і Арлоўскай, праспекта Машэрава і вуліц Цімірязева, Даўмана. Рух грузавога транспарту абмяжоўваецца ад скрыжавання праспекта Машэрава і Старавіленскага тракта.

Ігар ГОЛАД, «Мінск—Навіны».

Красаваў мак на агародзе...

Цвіў ён прыгожа на 21 квадратным метры прысядзібнага ўчастка жыхаркі Жлобіна, абяцаючы ў будучым нядрэнны ўраджай. Гэта і прыцягнула ўвагу работнікаў міліцыі. Расліны вагой у паўтара пуда былі спаленыя, а гаспадыню чакаюць непрыемнасці.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Дружба не ведае межаў

Ветэраны партызанскага руху традыцыйна сустрэліся ля Кургана Дружбы, які 50 гадоў таму быў насыпаны на стыку граніц Беларусі, Латвіі і Расіі. І ўжо на наступны год тут сустрэліся героі вайны. З беларускага боку курган знаходзіцца ў Верхнядзвінскім раёне.

Нашы самадзейныя артысты і творчыя калектывы паказалі ветэранам цудоўную канцэртную праграму. Удзельнічалі ў ёй і беларускія памежнікі. Добра, што такія штогадовыя сустрэчы арганізоўваюцца, нягледзячы на тое, што былыя ўдзельнікі вайны даўно ўжо жывуць у розных краінах. Але вядома, што дружба не ведае межаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоятся 08.08.2008 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Адрес земельного участка	Площадь	Срок аренды	Цель использования	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1. ул. Криулина в р-не остановки Детский сад	0.0035 га	3 года	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000002004713	217 000	22 000
2. ул. Надточеева	0.2132 га	50 лет	Строительство и обслуживание Дома лыжника	740100000001004579	68 913 000	6 891 000
3. Привокзальная площадь	0.0041 га	3 года	Установка и обслуживание модуля обменного пункта	740100000002004712	277 000	28 000
4. ул. Фатина в р-не д. № 8 ограничения в использовании	0.0056 га (водоохранная зона р. Днепр 0.0056 га)	3 года	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000006002251	325 000	33 000
5. ул. Челюскинцев	0.0020 га	3 года	Строительство и обслуживание метеорологической автоматической станции	740100000003005393	189 000	19 000
6. пр-т Шмидта в р-не д. № 52, д. № 52а	0.0056 га	3 года	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000005003778	355 000	36 000

ПРИМЕЧАНИЕ:

1. Для участия в аукционе необходимо в срок, указанный в извещении, подписать соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и предоставить в уполномоченную организацию следующие документы: а) заявление на участие в аукционе; б) заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет № 3642017441709 Могилевского городского исполнительного комитета в ОАО «СБ Беларусбанк», код 536, УНН 700123787 (разовый платеж); в) копию документа, содержащего идентификационные сведения (для физических лиц); г) доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица, паспорт; д) документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица; е) копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, индивидуального предпринимателя.

2. Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с предметом аукциона.

3. Победитель обязан возместить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Центр по землеустройству») по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 08.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – **04.08.2008** года до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона – **08.08.2008** года с 15.20 до 15.50 в каб. 206.

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63

УНН 700008723

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже земельных участков в частную собственность, который состоится 12 августа 2008 года

в **16.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний. Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Центр по землеустройству») по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 08.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – **06.08.2008** года до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона – **12.08.2008** года с 15.20 до 15.50 в каб. 206.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении предоставить в уполномоченную организацию следующие документы: а) заявление на участие; б) заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет № 3642017441709 Могилевского городского исполнительного комитета в ОАО «СБ Беларусбанк», код 536, УНН 700123787; в) документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица; г) доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену.

Победитель аукциона обязан: оплатить в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность стоимость объекта аукциона; возместить затраты, связанные с подготовкой аукциона и документацией, необходимой для его проведения.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами.

Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

Покупатель, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка с наибольшей стоимостью.

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	пер. 4-й Павлова, 2	0.1006 га	740100000007004457	5 342 000	534 000
2	пер. 4-й Павлова, 4	0.1006 га	740100000007004459	5 342 000	534 000
3	пер. 4-й Павлова, 6	0.1006 га	740100000007004461	5 342 000	534 000
4	пер. 4-й Павлова, 8	0.1006 га	740100000007004463	5 342 000	534 000
5	пер. 4-й Павлова, 10	0.1006 га	740100000007004422	5 342 000	534 000
6	пер. 4-й Павлова, 12	0.1006 га	740100000007004425	5 342 000	534 000
7	пер. 4-й Павлова, 14	0.1006 га	740100000007004428	5 342 000	534 000
8	пер. 4-й Павлова, 16	0.1006 га	740100000007004430	4 679 000	468 000
9	ул. Бирюзовая, 42

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

9 ліпеня 2008 г. № 25 (128)

КРУГЛЫ СТОЛ

БЫЦЬ УЛАДАЙ — ЗНАЧЫЦЬ ПРАЯЎЛЯЦЬ ХАРАКТАР

Саветы — не часовая з'ява першаснага ўзроўню. Гэта пастаянная мясцовая ўлада, улада народная, неабходная людзям. З такога сцвярджэння пачаў сваё выступленне перад старшынямі Саветаў дэпутатаў пярвічнага ўзроўню, якія з'ехаліся ў Мінск на вучобу, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Анатоль МАЛАФЕЕЎ. Ён нагадаў прысутным, што для павышэння ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва 12 студзеня мінулага года Прэзідэнтам быў падпісаны Указ № 21. Праблемы рэалізацыі памянёнага дакумента і сабраліся абмеркаваць удзельнікі сустрэчы.

За паўтара года зроблена ўжо нямала, адзначыў Анатоль Аляксандравіч. Шмат цікавых напрацовак сёння можна пабачыць у Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай абласцях. Тым не менш, нявырашаных пытанняў яшчэ хапае.

— Даўно наспела неабходнасць у стварэнні спецыялізаванай камп'ютарнай праграмы «Сельскі Савет», дзе б вы змаглі ўбачыць усю карціну ў цэлым, а не проста адасобленыя статыстычныя даныя, — прапанаваў выступоўца. — Увогуле, неабходна скараціць колькасць разнарадак і даручэнняў, якія дасылаюць вам профільныя арганізацыі і структуры (органы ўнутраных спраў, санітарная служба і г.д.). Напрыклад, ведаю, што ад вас патрабуюць прадстаўляць звесткі, колькі на вашай тэрыторыі было адлоўлена бадзяжных сабак. Вы што, самі іх ловіце? Вы ж улада, у рэшце рэшт! І не забывайцеся на гэта! Хто павінен кантраляваць сітуацыю з шаленствам? Санітарная служба. Хто павінен адлоўліваць бадзяжных сабак? Служба жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Значыць, яна і справаздачу павінна рабіць! Яна, а не вы! У вас ёсць дадатак да Ўказа № 21, дзе прапісана, што вы можаце і абавязаны рабіць, а што — не. Вучыцеся паказваць характар. На сваёй тэрыторыі вы павінны быць гаспадарамі. Безумоўна, ёсць устаноўленая статыстычная справаздачнасць — ад яе вы нікуды не падзенецеся. Але ёсць і іншая, неўстаноўленая...

Гаворачы аб праблемах забеспячэння сельскага насельніцтва пітной водой, Анатоль Малафееў параіў слухачам звярнуць асобную ўвагу на санітарны стан грамадскіх калодзежаў і на якасць вады ў іх.

— У Віцебскай вобласці сёння актыўна ідзе працэс перадачы калодзежаў на баланс ЖКГ, — паведаміў Анатоль Малафееў. — Хоць яны і «адбрыкваюцца» ад гэтага, але ў рэшце рэшт нікуды не падзенуцца. Нягледзячы на станоўчыя зрухі, сёння яшчэ сустракаюцца сельсаветы, дзе грамадскія калодзежы застаюцца безнаглядзенымі, безгаспадарнымі. Іх абавязкова трэба перадаваць! З'ездзіце на Віцебшчыну, паглядзіце станоўчыя прыклады, вазьміце нешта на ўзбраенне.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

РАЗГРУЗИТЬ СОВЕТЫ ОТ ДЕЛ. НОМЕНКЛАТУРНЫХ...



Фото Анатолия КЛЕЩУКА.

Когда специальная комиссия, созданная в рамках работы Совета по взаимодействию органов местного самоуправления, изучала на базе Гомельской области вопрос о делопроизводстве на низовом уровне власти, мало кто предполагал, что выводы, сделанные ею, получат такой резонанс. Из достаточно сухого, на первый взгляд формального вопроса, который обсуждался 5 июня в г. Молодечно, на выездном заседании Совета по взаимодействию, выросла целая проблема, требующая детального изучения и принятия соответствующих решений. Ведь, как выяснилось, практически 70 процентов рабочего времени председатели сельских Советов тратят на «бумаготворчество», зачастую расходуя силы на подготовку информации, сбор которой вовсе не входит в их компетенцию...

Геннадий Новицкий.

Продолжение разговора состоялось уже в Минске, в конце июня, в ходе совещания по вопросам совершенствования делопроизводства и создания корпоративной компьютерной сети в местных Советах депутатов, которое проводилось под руководством **председателя Совета Республики Геннадия НОВИЦКОГО.**

Для более эффективной работы местных Советов депутатов (и в первую очередь, сельских и поселковых) сегодня необходимо оптимизировать делопроизводство, уменьшив документооборот настолько, насколько это возможно, считает Геннадий Новицкий. Еще более важная задача — создание корпоративной компьютерной сети местных Советов депутатов, применение современной технологии хранения, обработки и передачи информации, уход от бумажных носителей и управление процессом в оперативном режиме реального времени.

— Первые шаги для этого на местах уже сделаны — там появилось какое-то оборудование, по одному-два компьютера, а то и больше. Но, к сожалению, во многих сельисполкомах они используются как пишущие машинки. Поэтому необходимо немедленно заняться созданием определенных программ, которыми активно пользовались бы на местах. А дальше переходить к развитию корпоративных сетей — в районе, области, республике — которые позволили бы всем нам более эффективно работать, — считает Геннадий Новицкий.

С чего начать? Как упорядочить делопроизводство и сократить документацию, большая часть которой «приживалась» в сельисполкомах годами, а то и десятилетиями? Какими должны быть первые шаги по переходу на электронные способы ведения дел и обмена информацией? По словам **ответственного секретаря Совета по взаимодействию органов местного самоуправления Алексея СТЕПАНЕНКО,** сегодня над проблемой оптимизации номенклатурных дел для сельских Советов первичного уровня уже работает Департамент по архивам и делопроизводству Министерства юстиции.

— Номенклатура формировалась десятки лет назад, когда в сельском Совете работало по 5—7 человек. В последние годы там остался всего один человек — председатель Совета. Если мы, не выходя за пределы своих полномочий, сократим номенклатуру дел по линии представительной власти процентов на 30—40, это однозначно повлечет упорядочение делопроизводства. Например, та же похозяйственная книга за последние три года стала чересчур сложной, она изобилует разными уточнениями, а это никому не нужно, — считает Алексей Степаненко. — К работе Департамента по архивам необходимо подключить практиков с мест, представителей первичного, базового уровней. А позже (когда мы сократим номенклатуру дел) и представителей Министерства статистики — чтобы определиться, с каким перечнем информации должны работать сельские Советы.

Но и сегодняшняя номенклатура дел, их количество и содержание, продиктованы прежде всего требованиями Министерства статистики, на что обратил особое внимание Геннадий Новицкий. Он предложил уже в ближайшее время включить представителей Минстата в рабочую группу, которая должна будет выработать конкретные предложения по обозначенному вопросу.

— Я не ожидаю от нашей работы грандиозного эффекта и не осмелюсь утверждать, что после этого в два раза сократится количество дел в Советах, — заметил он.

(Окончание на 2-й стр.)

АДКРЫТЫ ФОРУМ

ДАТАЦЫЙНЫХ БЮДЖЭТАЎ СТАЛА БОЛЬШ

Пасля прымянення нормаў Указа № 21 аб'ём бюджэтаў пярвічнага ўзроўню павялічыўся ў 1,3 раза. Аднак гэтыя бюджэты застаюцца датацыйнымі, не вырашаецца пытанне перадачы спецыялізаваным арганізацыям вуліц сельскіх населеных пунктаў, нізкімі тэмпамі ідзе перадача на баланс арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі сістэм водазабеспячэння і водаадводу населеных пунктаў і іншых аб'ектаў нерухомасці. Гэтыя не новыя, але па-ранейшаму нявырашаныя праблемы былі ўзняты на сесіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў падчас разгляду пытання аб выкананні даручэнняў, што ўтрымліваюцца ва Ўказе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва».

Міхаіл ШАБАН, начальнік фінансавага ўпраўлення Гродзенскага аблвыканкама:

— Са 199 бюджэтаў пярвічнага ўзроўню толькі 7 — не датацыйныя. Колькасць датацыйных бюджэтаў у параўнанні з мінулым годам павялічылася больш чым удвая. У агульнай колькасці датацыйных бюджэтаў 76,6 працэнта складаюць бюджэты з узроўнем датацыі звыш 50 працэнтаў, у 2007 годзе — 61,2 працэнта.

Асноўная прычына павелічэння колькасці датацыйных бюджэтаў — змяненне структуры даходаў бюджэтаў пярвічнага ўзроўню. Указам № 21 устаноўлена 16 відаў падаткаў і непадатковых плацяжоў, што залічваюцца ў гэтыя бюджэты ў адпаведнасці з нормамі заканадаўства і Указа № 21 сфарміраваны іх даходы. Яны складаюцца з падатковых і непадатковых даходаў, а таксама бязвыплатных паступленняў. Падатковыя даходы ў агульным аб'ёме сёлета складаюць 38,6 працэнта супраць 82,2 працэнтаў ў 2007 годзе, альбо зменшыліся на 44,2 працэнтнага пункта. Гэта абумоўлена тым, што падаходны падатак з фізічных асобаў (адна з асноўных даходных крыніц бюджэту пярвічнага ўзроўню) не аднесены Указам № 21 да іх даходных крыніц.

У мэтах кампенсацыі даходаў у бюджэты пярвічнага ўзроўню сёлета перададзена частка мясцовых падаткаў і збораў, тым самым папоўніўшы іх базу на 5384,9 мільёна рублёў супраць 253,7 мільёнаў рублёў у мінулым годзе. У сярэднім з 7 да 12,5 працэнтаў узрасла ў агульным аб'ёме бюджэтаў удзельная вага падатку на ўласнасць. Прадугледжаны рост непадатковых даходаў у 4,6 раза, што плануецца забяспечыць за кошт атрымання даходаў ад здачы ў арэнду маёмасці, зямельных участкаў.

Бязвыплатныя паступленні, якія з'яўляюцца трэцяй часткай у структуры даходаў пярвічнага ўзроўню, складаюць 60,4 працэнта. Абсалютны памер гэтых паступленняў склаў 12915,7 мільёна рублёў, што на 43,5 працэнта больш, чым летась.

Што датычыцца расходаў бюджэтаў пярвічнага ўзроўню, то іх расходныя паўнамоцтвы ў структуры бюджэту вобласці скарацілі ся з 1,7 працэнта ў 2006 годзе да 1 працэнта ў 2008-м. Гэта вынік таго, што ўсе расходы па фінансаванні сацыяльнай сферы, значная частка расходаў па аказанні жыллёва-камунальных паслуг насельніцтву і ўтрыманню інфраструктуры перададзены на раённы і абласны ўзроўні. Найбольшую вагу ў расходах бюджэтаў пярвічнага ўзроўню складаюць расходы на ўтрыманне выканаўчых і распарадчых органаў. На ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскіх Саветаў сёлета прадугледжана 1,3 мільярда рублёў.

Міністэрствам фінансаў сумесна з аблвыканкамамі вывучана практыка прымянення Указа № 21. Прапануецца дапоўніць яго наступнымі палажэннямі.

У мэтах далейшага ўмацавання рэсурснай базы і зніжэння датацыйнасці бюджэтаў пярвічнага ўзроўню пашырыць пералік даходных крыніц, што фарміруюць бюджэты сельсаветаў, пасёлкаў гарадскога тыпу і гарадоў раённага падпарадкавання.

Фінансаванне гаспадарча-пітнога водазабеспячэння і расходы па кампенсацыі затрат па агульных аддзяленнях лазняў населеных пунктаў на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ажыццяўляць з раённых бюджэтаў. Кампенсацыя часткі затрат па ўказаных расходах праз бюджэты пярвічнага ўзроўню патрабуе ад прадпрыемстваў ЖКГ вядзення раздзельнага ўліку, павелічэння дакументаабароту. Акрамя таго, распыленне сродкаў па некалькіх бюджэтах не дазваляе прадпрыемствам ЖКГ аператыўна і эфектыўна іх выкарыстоўваць.

Казімір БАНЦЭВІЧ, начальнік упраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Гродзенскага аблвыканкама:

— З мэтай максімальнага спрашчэння прыёму-перадачы сістэм водазабеспячэння і водаадводу арганізацыям жыллёва-камунальнай гаспадаркі прапануецца наступны парадак.

Перадачы падлягаюць аб'екты водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі ў сельскіх населеных пунктах, якія забяспечваюць прадастаўленне паслуг насельніцтву і знаходзяцца ў спраўным тэхнічным стане. Мэтазгоднасць прыёмкі аб'ектаў водазабеспячэння і каналізацыі, якія менш чым на 50 працэнтаў забяспечваюць патрэбнасці насельніцтва і аб'ектаў сацыяльнага і культурна-бытавога прызначэння, разглядаць у кожным канкрэтным выпадку.

Пры перадачы сістэм водазабеспячэння, якія забяспечваюць насельніцтва і вытворчасць, мэтазгодна выкарыстоўваць комплексны падыход і перадаваць іх, як правіла, у поўным складзе (артэзіянскія свідравіны, сеткі і збудаванні).

Аб'екты, што перадаюцца, павінны быць забяспечаны неабходнай дакументацыяй, уключаючы акты адводу зямельных участкаў, тэхнічныя пашпарты і інш. Калі дакументацыя адсутнічае, то яна вырабляецца ўласнікам за кошт яго сродкаў альбо сродкаў, спецыяльна прадугледжаных на гэтыя мэты, да перадачы аб'екта. Аб'екты, што знаходзяцца ў няспраўным тэхнічным стане, перадачы не падлягаюць і павінны быць прыведзены ўласнікам у рабочы стан.

Працэс перадачы аб'ектаў тармозіцца шэрагам аб'ектыўных прычын. Тэхнічны стан большасці з іх вельмі нездавальняючы. Артэзіянскія свідравіны «пяскуюць», яны патрабуюць капітальнага рамонту, адсутнічае агароджа зонаў санітарнай аховы, высокі знос сетак (як правіла, стопрацэнтны), каналізацыйныя помпавыя станцыі не працуюць, іх абсталяванне разукамплектавана. Трэба капітальна рамантаваць і ачышчальныя збудаванні. Для прывядзення аб'ектаў у здавальняючы стан патрабуецца каля 8 мільярдаў рублёў. Адсутнічае тэхнічная дакументацыя па аб'ектах, якія перапрадаюцца.

Для далейшай эксплуатацыі прымаемых сетак і збудаванняў патрабуецца спецыяльная тэхніка на суму 5 мільярдаў рублёў. Дадатковыя эксплуатацыйныя расходы жыллёва-камунальных арганізацый па прынятых аб'ектах складуць 3,5 мільярда рублёў у год.

Валерый КОКАШ, генеральны дырэктар камунальнага праектна-рамонтна-будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства «Гроднааблдарбуд»:

— Перадача вуліц населеных пунктаў, якія не з'яўляюцца дарогамі агульнага карыстання, на баланс любой арганізацыі, у тым ліку і дарожнікам, нічога не дасць, паколькі Указам № 21 устаноўлена: «З бюджэтаў пярвічнага ўзроўню фінансуюцца: добраўпарадкаванне населеных пунктаў на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі... а таксама іншыя расходы, у адпаведнасці з праграмамі жыллёвага і дарожнага будаўніцтва». На жаль, у бюджэтах пярвічнага ўзроўню такія сродкі не закладзены, а яны патрабуюцца немалыя. Для таго, каб прывесці ў парадак хоць бы праезную частку гэтых вуліц на працягу шасці гадоў, патрабуецца штогод на рамонты 40—45, а на ўтрыманне — 5—6 мільярдаў рублёў.

У 1998 годзе ўжо была падобная сітуацыя з перадачай унутрыгаспадарчых дарог у сетку мясцовых дарог агульнага карыстання. Тады нам да 4,5 тысячы км дарог далучылі яшчэ 6,5 тысячы км, у тым ліку больш за 2 тысячы км так званых «армянскіх» асфальтаў пабудовы 1986—1991 гадоў і 1,5 тысячы км грунтовых дарог. Пры гэтым дадатковае фінансаванне выдзелена не было, у выніку ўсяляхіх рэформаў яно не павялічылася, а скарацілася амаль удвая. Такім чынам, працягласць дарог узрасла у 2,4 раза, а сродкаў з разліку на 1 км стала менш у 4 разы.

На сёння 80 працэнтаў дарог маюць скончаныя міжрамонтныя тэрміны, на 60 працэнтах дарог рэканструкцыя ці капітальны рамонт наогул не праводзіліся (гэта 1285 км грунтовых дарог, у тым ліку 346 км па населеных пунктах) альбо ажыццяўляліся 18 і больш гадоў таму пры нарматыўным тэрміне 12 гадоў. За гэты перыяд удалося падтрымаць, г.зн. выканаць паверхневую апрацоўку альбо танкаслойнае пакрыццё на 20 працэнтах «армянскіх» асфальтаў і 18 працэнтаў грунтовых дарог перавесці ў гравійныя. А найбуйнейшыя мясцовыя дарогі, якія забяспечваюць сувязь з раённымі цэнтрамі і выхады на рэспубліканскія дарогі, даслужваюць другі, а то і трэці тэрмін без рамонту, што не можа не выклікаць нараканні насельніцтва і суб'ектаў гаспадарання.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

БАЛОТЫ — БАГАЦЦЕ ПАЛЕССЯ

Рупліўцы экатурызму на Палессі могуць атрымаць фінасавую падтрымку .

У рамках міжнароднага праекта Праграмы развіцця ААН (ПРААН) і Глабальнага экалагічнага фонду па ахове водна-балотных угоддзяў на Беларускім Палессі аб'яўлены конкурс міні-грантаў.

Адна з яго мэтаў — матэрыяльная дапамога існуючым і патэнцыяльным прадпрымальнікам, якія ўжо аказваюць ці збіраюцца аказваць паслугі ў сферы экатурызму.

Разлічваць на атрыманне міні-грантаў могуць жыхары рэгіёна Палесся, а дакладней Бярозаўскага, Драгічынскага, Пінскага, Лунінецкага і Столінскага раёнаў Брэсцкай вобласці, а таксама Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

Каб атрымаць грошы, у заяўцы трэба дакладна абгрунтаваць галоўнае: які будзе ўклад у развіццё экатурызму на Палессі ў выніку асваення сродкаў гранта. Нагадаем, максімальны памер дапамогі (у залежнасці ад значнасці і ўнікальнасці праекта) можа скласці 2500 долараў ЗША на заяўку.

Тэрмін падачы заявак — да 20 ліпеня 2008 года па адрасе: 220048, г. Мінск, вул. Калектарная 10, оф. 537, факс (017) 226 59 54 (з адзнакай «для Арцюшэўскага А.Г.») ці па **e-mail artushevsky@bk.ru**. Адбор заявак будзе праведзены да 1 жніўня 2008 г., тэрмін рэалізацыі праектаў — да 10 лістапада 2008 года.

Пазнаёміцца з умовамі конкурсу можна ў аддзеле спорту і турызму райвыканкама па месцы жыхарства, а таксама ў адміністрацыі заказнікаў «Сярэдняя Прыпяць», «Спораўскі» і «Званец».

Леанід ТУГАРЫН.

ТРЫМАЦЬ ЦІ НЕ ТРЫМАЦЬ — ВОСЬ У ЧЫМ ПЫТАННЕ...

Вёска Пішчалава, што ў Аршанскім раёне, прытулілася ля горада. Мясцовасць адметная, усё больш пагоркамі, таму і дарогі, і хаты то на ўзвышшы, то ў нізіне. Вёска — цэнтр гаспадаркі СВК «Пішчалаўскі», дзе ў асноўным пражываюць механізатары і спецыялісты. Сельгаспрадпрыемства не вызначаецца эканамічнай устойлівасцю, заробкі тут невысокія.

Частка вяскоўцаў папаўняе бюджэт сям'і выпрабаваным спосабам: трымаюць карову на падворку і прадаюць малако — як дзяржаве, так і ў прыватным парадку. Як ідзе гэты працэс у вёсцы сёлета?

У Пішчалаўскім сельскім Савеце і ў канторы зрабілі наступную раскладку.

Вясной выгналі ў поле з падворкаў Пішчалава 27 кароў. Летась па вясне было 45. Дзесяць гадоў таму — 70. Словам, скарачэнне пагалоўя буйной рагатай жывёлы працягваецца.

Як патлумачылі жыхары Пішчалава, скарачэнне кароў на падворках адбываецца па многіх прычынах. На першым месцы нават не закупачныя цэны на малако і не надбаўкі, а асемяненне жывёлы. Менавіта з-за таго, што значная колькасць кароў апошнія гады заставалася ялаўкамі, і скарацілася іх колькасць. Ялаўку вясковец трымаць не будзе, бо нявыгадна, карова не акупляецца. І гэткіх кароў збываюць. Здадуць ялаўку на мясакамбінат, а купіць першацёлку — то сродкаў не хапіла, то кармоў своечасова не назапасілі. Так і застаралася сям'я без каровы.

Яшчэ адна важкая прычына скарачэння пагалоўя кароў — паша на няўдобіцах.

У час майго наведвання каровы стаялі ля ракі ў высокай траве. Гэты травастой трэба было б тэрмінова падкасіць, але, як кажуць вяскоўцы, не робіцца тое гадамі. Летась і пазалетась грамада збірала грошы на паліва для механізатара, каб падкасіў траву на выпасах. Можа, адзін раз і падкасілі за ўсе гады, і то няякасна. А звычайна карову можна не знайсці ў траве каля ракі — з галавой хаваецца. Ды толькі гэта трава ўсё больш неядомая для кароў. Гаспадыні лічаць, што і ад дрэннай пашы каровы застаюцца ялаўкамі. На выпасе не пад'ядуць, а толькі стомяцца. І надоі па гэтай прычыне на гаспадарскіх падворках невысокія.

Прадаюць з падворкаў дзяржаве малако і цялят у асноўным па дзвюх прычынах: каб атрымаць сена і зерне ў адпаведнасці з прададзенай прадукцыяй. Што датычыцца закупачнай цаны на малако, то яе лічаць недастатковай. Больш ахвотна збываюць малако ў горадзе слоікамі па 800—900 рублёў за літр тыя вяскоўцы, хто з транспартам. Хто не можа даехаць да гарадскога пакупніка — той прадае дзяржаве.

Па словах вяскоўцаў, выплаты надбавак на ўтрыманне кароў у залежнасці ад колькасці здадзенага дзяржаве малака не з'яўляюцца істотнымі і не стымулююць сельскага жыхара на пашырэнне гаспадаркі. Цяпер даплаты на кожную карову ідуць асобна. І калі здадзена 997 літраў замест 999, то ўжо і не належыць даплата 30 тысяч рублёў на карову. Людзям выгадна было, калі плацілі надбаўку за кожны літр... Словам, больш тлуму з тымі надбаўкамі ў бухгалтэрыі і ў гаспадарскай галаве, чым грошай (вось што давялося пачуць). Праўда, усе, хто заслужыў тую надбаўку, атрымалі яе ў першым квартале.

Звычайна сем'і, якія намагаюцца палепшыць свой дабрабыт, трымаюць па дзве-тры каровы.

Дзве каровы на падворку ў сям'і Папыльчанкаў. Ёсць тут і конь, і дробная жыўнасць. Гаспадар працуе механізатарам, а гаспадыня толькі ўвайшла ў пенсійны ўзрост.

— Праўда, аперацыю перанесла, і трэба было б берагчы сябе, менш працаваць, але ж на адну пенсію не пражывеш,— расказвае Ніна Валянцінаўна. — Ды і дзецям трэба дапамагчы. Малодшая дачка вось толькі школу заканчвае.

Звычайная вясковая хата стаіць на пагорку. Перад хатай — кветнік. Далей — хлявы, пуні і вялікі агарод. Доўгія рады цыбулі, у цяпліцы — памідоры. І, безумоўна, бульба.

— Хачу, каб на стале ў мяне быў дастатак. Са свайго падворка маем амаль усё: малочныя прадукты, агародніну, вяндліну, сала, — расказвае Ніна Валянцінаўна.

У гэтай сям'і тры дачкі, зяці, два ўнукі. Усе шмат працуюць на гаспадарку і таму няблага жывуць.

Лад жыцця Папыльчанкаў нагадвае хутарскі, даўніх часоў, дзе людзі вызначаліся працавітасцю. Тут нават у цяжкія хвіліны не за гарэлку хапаюцца, а за прылады працы, ды каля жывёлы топчуцца, дзе і стрэсы, і перажыванні самі сабой знікаюць. Дарэчы, гаспадыня больш за два дзесяткі гадоў працавала даяркай у мясцовым калгасе, узнагароджана медалём. А яе маці Вольга Міхайлаўна, у мінулым таксама даярка, мае ордэн Працоўнай Славы.

Папыльчанкі навучылі сваіх дзяцей працаваць, выбіраць сваю лінію паводзінаў у грамадстве, ставіцца з павагай да старэйшых (у сям'і жыве і маці гаспадыні). Гэтаму ж вучацца і ўнукі.

Усё лета з бабуляй і дзедам гаспадарыць унук Ілля. Ён з раніцы шчыруе: кароў у поле завядзе, на лужку каня навяжа. А на сенакосе разам з дарослымі да ночы складвае сена ў стажок. Расце гаспадар. Старэйшыя вучаць яго, як жыць у дарослым свеце, зарабляючы ўменнем, стараннем і розумам.

Грамадскі статак Пішчалаўскага сельсавета. У траве карову можна і не знайсці...

Каб падняць дзяцей, трымае дзве каровы на падворку і сям'я Ціханскіх. Гаспадыня Іна Віктараўна — галоўны бухгалтар СВК «Пішчалава», гаспадар Алег Іванавіч — эканаміст. І тым не менш заробку не хапае, каб вывучыць сыноў. Старэйшы вучыцца ў сталіцы. Неабходны дадатковы заробак бацькам, каб яго падтрымаць. Малодшы закончыў школу. Зноў жа трэба думаць, як дапамагчы яму атрымаць прафесійную адукацыю. Таму і трымаюць кароў, апрацоўваюць амаль тры гектары зямлі, дзе вырошчваюць збожжавыя, караняплоды і травы. Ціханскія родам з горада, закончылі сельскагаспадарчую акадэмію, прыехалі па размеркаванні ў Пішчалава і прыжыліся: навучыліся і кароў даіць, і сена сушыць, як прыроджаныя вяскоўцы.

Усё лета з бабуляй і дзедам гаспадарыць унук Ілля.

Малако дастаецца нялёгка. Але і ў цяжкасцяў ёсць свой прывабны бок. Сям'я радуецца на сыноў: старанныя ў вучобе, працавітыя, добрыя памочнікі. Усё ўмеюць рабіць па гаспадарцы. Уласна кажучы, выраслі такімі дзякуючы прыкладу бацькоў.

Вольга ШУТАВА.
Фота аўтара.

РАЗГРУЗИТЬ СОВЕТЫ ОТ ДЕЛ. НОМЕНКЛАТУРНЫХ...

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

— Но мы должны посмотреть, что можно сократить, определиться, что нам не нужно, а что нужно. Если все нужно — то возникнет вопрос о штатах сельисполкомов, так как двух человек для работы с таким объемом документов явно не достаточно.

Но проблема с нарастающим объемом документооборота может быть решена и другим способом — путем создания корпоративной компьютерной сети местных Советов депутатов. В Могилевской области, кстати, уже ведется работа по объединению в единую корпоративную информационную сеть существующих информационных сетей облисполкома и его структурных подразделений.

— Создав единое информационное пространство органов государственного управления, мы сможем обеспечить эффективное взаимодействие всех уровней власти. А также значительно повысить контроль за реализацией принятых управленческих решений, существенно сократить сроки их доставки, — считает **председатель Могилевского областного Совета депутатов Владимир ПАНТЮХОВ.** — Эта корпоративная информационная сеть объединит в себе локальные сети областного, городских, районных исполкомов и Советов депутатов. И конечно, если будет принято такое решение, сельских Советов.

Вместе с тем для участия в проектировании, внедрении и, самое главное, эксплуатации корпоративной информационной сети необходимы специалисты в области информационных технологий, на которых впоследствии будут возложены функции по поддержанию в режиме постоянной готовности всей системы в целом. И в ближайшее время этот вопрос в Могилевской области будет решен.

— Промедление в создании корпоративной информационной сети приведет к персональному клонированию затрат и в течение ближайших 5 лет вырастет на порядок, — уверен Владимир Пантюхов.

В свою очередь, Министерством сельского хозяйства и продовольствия в рамках программы «Электронная Беларусь» внедрен проект «Автоматизированная информационная система агропромышленного комплекса района», который позволяет объединить райсельхозпрод и все сельскохозяйственные организации той или иной территории. В прошлом году создано 80 таких систем,

Как упорядочить делопроизводство и сократить документацию, большая часть которой «приживалась» в сельисполкомах годами, а то и десятилетиями?

в этом году их будет еще 118.

— Когда председатели райисполкомов увидели, как после внедрения проекта работают управления сельского хозяйства (а это и электронная почта, и система «оперативка», и бухгалтерский учет, и отчетность), то с помощью нашего информационно-вычислительного центра построили у себя локальные вычислительные сети (4 райисполкома) и подсоединились к системе. А на базе двух районов (Шкловского и Горецкого) подсоединили и все сельские Советы, — рассказал **начальник отдела маркетинга, информации и диспетчерской связи Главного управления внешнеэкономической деятельности Министерства сельского хозяйства и продовольствия Владимир ЛОГУНКОВ.** — Сейчас эти райисполкомы оперативно (!) работают как с сельскохозяйственными организациями, так и с сельскими Советами. Наш информационно-вычислительный центр в состоянии взять на себя и функции обслуживания сети. Это очень важно, так как если проблему не исправлять по горячим следам, компьютеры через 3—4 месяца превратятся в груду железа.

Многие участники совещания согласились с тем, что сегодня все местные электронные программы — какими бы хорошими и прогрессивными они ни казались — необходимо согласовывать с глобальными государственными задачами в данной отрасли, интегрироваться с проектами, которые уже ведет Министерство связи, чтобы потом не было «себе дороже». Сейчас, например, готовится проект постановления о создании единой государственной системы электронного документооборота между госорганами. Работает и система мониторинга финансово-экономической деятельности, которую можно адаптировать к другим видам отчетности.

— Сколько номенклатурных дел будет в сельском Совете, 90 или 10, в принципе проблемы не решает, — считает **заместитель начальника центра информационных технологий ГУ «Главное хозяйственное управление» Управления делами Президента Республики Беларусь Владимир ЯНКОВСКИЙ**. — Как бы ни сокращали документ, он все равно вернется — в другом виде или под другим названием. Здесь важна не борьба с отчетностью, а упорядочение самого процесса. Если мы создадим такую технологию работы с документами, которая займет минимум времени, — это будет более эффективно.

Участники совещания так же предложили четко проработать, какая конкретно информация нужна сельским Советам, как ее собирать, как отправлять и как получать — чтобы не перегрузить первичные органы власти очередным «потоком».

■ ■ ■

В ходе совещания было принято решение создать рабочую группу для подготовки проекта предложений по всем поставленным вопросам.

— Перечень мероприятий, исполнители и сроки исполнения в этом проекте должны быть определены уже конкретно, — потребовал Геннадий Новицкий.

Наталия КАРПЕНКО.

ЧЫТАЙЦЕ НА САЙЦЕ

У Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, створанага пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, з'явіўся свой афіцыйны сайт: http://www.sovreg.gov.by/

Новы сайт складаецца з шасці асноўных раздзелаў: «Аб Савеце», «Прававыя асновы дзейнасці Савета», «Планаванне работы Савета», «Узаемадзеянне з мясцовымі Саветамі дэпутатаў і органамі дзяржаўнага кіравання», «Міжнароднае супрацоўніцтва Савета», «СМІ аб рабоце Савета і органаў мясцовага самакіравання». Наведвальнікі сайта змогуць азнаёміцца з апошнім навінамі і анонсамі падзей, якія датычацца дзейнасці Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, з публікацыямі цэнтральных і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі аб рабоце Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў.

Паважаная рэдакцыйная калегія газеты «Звязда»!

Звяртаюся да Вас, як да «роднай газеты на роднай мове», як да цікавага і змястоўнага выдання, якое заўсёды чытаем з задавальненнем і ўвагай. Звяртаюся з просьбай.

Хачу праз Вашу газету выказаць цёплыя словы ўдзячнасці цудоўным людзям — старшыні Касцяневіцкага сельскага Савета Вілейскага раёна Мінскай вобласці Германенку Валерыю Ўладзіміравічу і сакратару Шавялёвай Наталлі Леанідаўне. Нядаўна ў нашай сям'і здарылася вялікае гора — памёр бацька. (Мая матуля жыве ў в. Навасёлкі гэтага сельсавета. Я жыву ў г. Віцебску, працую настаўнікам роднай мовы і літаратуры.) Нам давялося звяртацца ў сельскі Савет пры вырашэнні арганізацыйных пытанняў. Гэтыя чулыя і адказныя людзі дапамаглі нам у цяжкі час, аднесліся з вялікай увагай.

Здаецца, што тут незвычайнага? Чалавек выконвае сваю работу. Але ж і работу можна выканаць фармальна, згодна з інструкцыямі, а можна — з цеплынёй, з душой, з павагай да чалавека.

Калі ласка, паважаная рэдакцыя, надрукуйце падзяку гэтым добрым людзям за іх клопат і сумленныя адносіны да сваіх абавязкаў.

Да пабачэння.

З павагай ІВАНОВА Вольга Францаўна.

БЫЦЬ УЛАДАЙ — ЗНАЧЫЦЬ ПРАЯЎЛЯЦЬ ХАРАКТАР

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Пакуль што даволі марудныміэтэмпамі праходзіць працэс перадачы нетранзітных дарог і вуліц сельскіх населеных пунктаў. Анатоль Аляксандравіч нагадаў, што па просьбе Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання Савет Міністраў прыняў рашэнне аб перадачы такіх дарог і вуліц на баланс ЖКГ. Магілёўская вобласць вырашыла перадаваць іх дарожнікам. «Перадаваць дарогі трэба. Ім неабходны гаспадар. Інакш яны так і застануцца неўпарадкаванымі, а вінаваціць у гэтым будуць вас», — папярэдзіў выступоўца прысутных.

...Пра нарматыўныя дакументы, якімі неабходна карыстацца пры фарміраванні бюджэту пярвічнага ўзроўню, а таксама пра асаблівасці фарміравання бюджэту на 2009 год старшыням сельскіх і пасялковых выканкамаў расказала **начальнік аддзела рэгіянальных бюджэтаў галоўнага ўпраўлення бюджэтнай палітыкі Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь Зоя КРУГЛІКАВА.** У прыватнасці, яна нагадала пра агульнарэспубліканскую палітыку зніжэння падатковай нагрузкі, што абавязкова выклікае пэўныя страты ў мясцовых бюджэтах. Для таго, каб іх кампенсаваць, паведаміла Круглікава, у 2009 годзе раённыя бюджэты атрымаюць не 30, а 33 працэнты падатку на дабаўленую вартасць.

— Ва ўмовах паніжэння падатковай нагрузкі і росту расходаў агульная задача мясцовай улады сёння — прыцягненне дадатковых даходаў, павелічэнне колькасці падаткаплацельшчыкаў, у першую чаргу за кошт стварэння новых вытворчых прадпрыемстваў,— адзначыла Зоя Мікалаеўна. — Плюс — напаўненне бюджэтаў за кошт іншых даходных крыніц, напрыклад, за кошт рэалізацыі зямлі праз аўкцыёны.

У праекце бюджэту на 2009 год прадугледжаны сродкі на знос старых дамоў (згодна з Указам № 70) — 13 млрд рублёў. «Аднак я звяртаю вашу ўвагу на тое, што неабходна прымаць усе магчымыя меры па максімальным выкарыстанні старога жылля, хай сабе і на дровы», — падкрэсліла Круглікава. Яна расказала аб выніках работы Мінфіна па падрыхтоўцы дапаўненняў ва Ўказ № 21. У прыватнасці, для прывядзення ў адпаведнасць Указа № 21 з Указам № 667 прапануецца дапоўніць пералік расходаў, якія фінансуюцца з бюджэтаў пярвічнага ўзроўню, расходамі, звязанымі з адводам і дзяржаўнай рэгістрацыяй зямельных участкаў для правядзення аўкцыёнаў, расходамі на арганізацыю, падрыхтоўку і правядзенне аўкцыёнаў па продажы нерухомай маёмасці, што знаходзіцца ў камунальнай уласнасці, зямельных участкаў і аукцый, расходамі на права заключэння дагавароў арэнды зямельных участкаў, а таксама расходамі, звязанымі з дзяржаўнай рэгістрацыяй спынення права на зямельны ўчастак у выпадку, прадугледжаным заканадаўствам.

Падводзячы вынік свайму выступленню, Зоя Круглікава яшчэ раз адзначыла, што ў сённяшніх умовах старшыням сельскіх і пасялковых выканкамаў неабходна дакладная ведаць, якія падаткі і ў якім памеры збіраюцца на іх тэрыторыі.

З гэтым пакуль што не зусім атрымліваецца разабрацца ў **старшыні Вольнаўскага сельскага Савета дэпутатаў Баранавіцкага раёна Вячаслава РУДАМАНА,** які працуе на сваёй пасадзе ўсяго паўгода.

Бюджэт яго сельвыканкама на гэты год складае 32 млн рублёў, аднак ні памеру датацыі, ні даходных крыніц старшыня агучыць не змог. «Бюджэт — гэта аснова асноў», — патлумачыў Анатоль Малафееў і параіў старшыні разам з бухгалтарам дасканала разабрацца ва ўсіх нюансах фарміравання бюджэту. Што тычыцца рэалізацыі падпункта 8.2 Указа № 21, дарогі і водаправоды на тэрыторыі сельсавета пакуль не перададзены — няма адпаведнай дакументацыі. Затое актыўна вядзецца знос старых дамоў (указ № 70). Усяго па сельсавеце іх 82, 12 ужо разабралі (для гэтага наймаюць спецыялізаваную брыгаду). «Спонсарам» выступае мясцовая гаспадарка. Увогуле, адзначыў Вячаслаў Рудаман, што тычыцца вырашэння пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва, мясцовы Савет працуе ў цеснай сувязі са сваім сельскагаспадарчым прадпрыемствам.

...Бюджэт Сялецкага сельскага выканкама Мсціслаўскага раёна на гэты год складае 92,6 млн рублёў. Асноўнымі даходнымі крыніцамі з'яўляюцца: зямельны падатак, падаткі на нерухомасць, даходы ад здачы ў арэнду маёмасці, што знаходзіцца ў камунальнай уласнасці сельвыканкама, дзяржпошліна за рэгістрацыю актаў грамадзянскага стану і за натарыяльныя дзеянні. Сёлета на баланс ДРБУ перададзена 12 км нетранзітных дарог сельсавета (з 17,3 км) і пад'езды да могілак. Пачаліся работы па перадачы водападводных сетак на баланс УКВП «Водаканал» (усяго іх 6,7 км).

...Бюджэт Любашаўскага сельвыканкама Ганцавіцкага раёна складае 97 млн рублёў. Узровень датацыі — 24 працэнты. Самыя прыбытковыя даходныя крыніцы — падатак з продажаў (каля 34 млн рублёў), падатак на нерухомасць з фізічных асобаў (24 млн) і збор з нарыхтоўшчыкаў дзікай і сельскагаспадарчай прадукцыі (толькі за мінулы год у бюджэт сельвыканкама паступіла 16 млн рублёў). У межах выканання Ўказа № 70 за 2007 год на тэрыторыі сельсавета было знесена 25 старых дамоў. Аднак шэраг праблем у мясцовай улады выклікалі пустыя дамы.

«Перадаваць дарогі трэба. Ім неабходны гаспадар. Інакш яны так і застануцца неўпарадкаванымі, а вінаваціць у гэтым будуць вас», — папярэдзіў выступоўца прысутных.

— У нас у сельсавеце ёсць пусты дом, у якога няма ні гаспадара, ні спадчынніка, — падзяліўся набалелым **старшыня Любашаўскага сельскага Савета Уладзімір ГАРДЗЕЙ**. — Мы вытрымалі ўсе належныя працэдуры, атрымалі праз суд гэты дом на свой баланс. Цяпер нам яго трэба прадаць. Ёсць нават чалавек, які хацеў бы яго набыць. Аднак няма дакладнага і простага механізму продажу пустых дамоў. Так, для продажу праз аўкцыён дом спачатку неабходна зарэгістраваць (а для гэтага патрэбна зрабіць дакументы на зямлю, што каштуе каля 880 тысяч рублёў), зрабіць ацэнку дома (а яе нельга рабіць без тэхпашпарта) і г.д. Карацей кажучы, каб выставіць дом на продаж, нам трэба затраціць каля 1,5 млн сваіх грошай. Але гэта яшчэ не ўсё. Агенцтва нерухомасці (былое БТІ) вызначае даволі высокую цану на дом (не менш за 10 млн), а ў нас няма механізму зніжэння гэтай цаны. Вось мы і «завязлі». Задорага ніхто браць не хоча. А калі мы самі знізім цану на дом — давядзецца апраўдвацца перад кантралюючымі органамі. Падумаюць, што я ўзяў хабар і некаму за бясцэнак прадаў дом, які знаходзіцца ў сельвыканкама на балансе.

Бурныя дэбаты прысутных выклікала скарга Ўладзіміра Гардзея на тое, што яму даводзіцца плаціць РЭСу за абслугоўванне сетак вулічнага асвятлення. Аказалася, што такая практыка ёсць у многіх сельскіх і пасялковых саветах.

Сваім вопытам падзяліўся **старшыня Козенскага сельвыканкама Мазырскага раёна Алег БОБР:** «Мы заключылі дагавор з РЭСам, дзе прапісана, што сельвыканкам толькі закупляе лямпачкі, а абслугоўвае сеткі — сам РЭС, на бясплатнай аснове. Старшыня сельвыканкама прымае заяўкі на абслугоўванне і перадае іх электрыкам».

Карыстаючыся магчымасцю, Алег Анатольевіч агучыў праблему, якая, на яго думку, сур'ёзна перашкаджае эфектыўнай рабоце сельвыканкамаў: «У мяне за апошні тыдзень перад ад'ездам на курсы не было ні аднаго дня, каб я ўвесь яго прысвяціў непасрэдна сваёй рабоце. То прадстаўніцтва з рэспублікі завітае, то дзяржкантроль, то экалогія з санстанцыяй, то энагляду з энергазбытам. Працаваць няма калі. Увесь тыдзень толькі і робіш, што прымаеш розныя камісіі і праверкі».

Безумоўна, далёка не ўсе прысутныя паспелі выступіць падчас сустрэчы. Па яе завяршэнні старшыні сельскіх і пасялковых Саветаў абменьваліся вопытам у нефармальнай абстаноўцы.

Інга МІНДАЛЁВА.

КАЛЯРОВАГА МЕТАЛУ ХАПАЕ?

Вось каля Маларыты аператыўнікі ў 18.30 тармазнулі аўтамабіль, на якім беспрацоўны з в. Дзівін Кобрынскага раёна перавозіў 1,5 тоны лому каляровых металаў, а праз нейкую гадзіну на гэтым месцы затрымалі яшчэ аднаго беспрацоўнага з в. Легаты, які таксама без дакументаў вёз больш за паўтары тоны такога ж лому.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ПЫТАЛЬНІК

ПРЫПЫНАК АДМЕНЕНЫ, БО НА ПРАЦЯГУ КВАРТАЛА З ЯГО АДПРАЎЛЯЛАСЯ 0,1 ЧАЛАВЕКА Ў СУТКІ

Паважаная рэдакцыя маёй любімай «Звязды»! Не адно дзесяцігоддзе з'яўляюся вашай падпісчыцай і чытачкай. Чытаю кожную рубрыку, кожны артыкул і радуюся, што ёсць у нашай рэспубліцы такая цудоўная газета. Вельмі ўсхваляваў мяне Сяргей Расолька і яго артыкул «Усё для камфорту і зручнасці пасажыраў» і «Павялічана частата руху цягнікоў» ад 31 мая і 3 чэрвеня, дзе расказваецца аб паляпшэнні абслугоўвання пасажыраў Беларускай чыгункі.

Але ці ўсё так цудоўна насамрэч? Паважаны спадар Сяргей! Можа б вы пацікавілі ся і паспрабавалі адказаць на пытанне жыхароў Глыбоцкага, Міёрскага і Шаркаўшчынскага раёнаў Віцебскай вобласці, якія карысталіся прыпынкам Палевачэ, што быў адменены для цягнікоў Мінск — Полацк і Віцебск — Друя — Лынтупы. Чаму адмянілі прыпынак? Ён быў вельмі зручны і необходны для ўсіх нас, на ім заўсёды былі пасажыры: студэнтам было зручна пасля заняткаў дабірацца дадому з Віцебска і Мінска, мы маглі паехаць у абласны дыягнастычны цэнтр і ў той жа дзень вярнуцца назад, вазілі мы і вучняў на экскурсіі ў Мінск...

Цяпер, калі ў нашай вёсцы будуецца аграгарадок і робіцца ўсё для людзей, у нас адабралі і тое нямногае, што ёсць. Дык хто ж будзе адраджаць вёску, калі да яе нельга дабрацца? Бліжэйшы прыпынак у в. Зябкі, але гэта ад нас за 10 км. Хай сабе летам, па чыгунцы, студэнт можа і пройдзе гэтыя кіламетры, а зімой?! А што рабіць старым, хворым, нямоглым. Вельмі крыўдна за такія адносіны да нас, вяскоўцаў. Дапамажыце нам вырашыць гэта балючае пытанне! Надрукуйце наша калектыўнае пісьмо на старонках газеты.

З павагай і надзеяй ад імя пасажыраў прыпынку Палевачэ Глыбоцкага раёна настаўніца роднай мовы Алена Вацлаваўна КІШКУРНА.

Па просьбе рэдакцыі зварот быў разгледжаны кіраўніцтвам Віцебскага аддзялення Беларускай чыгункі.

«Інфармуем вас, што пры распрацоўцы новага графіка руху пасажырскіх цягнікоў з 25 мая 2008 года адменены прыпынак цягнікам № 675/676 Мінск — Полацк і № 690/689 Віцебск — Друя — Лынтупы на прыпыначным пункце Палевачэ. Прычына такога рашэння — нізкі пасажырапаток, які змяншаецца з кожным годам. Згодна са статыстычнымі данымі, за 12 месяцаў 2007 года з п/п Палевачэ адпраўлены 121 пасажыр (ці 0,3 чалавека ў суткі), а за першы квартал 2008 года адпраўлена толькі 16(!) пасажыраў (ці 0,1 чалавека ў суткі). У такіх умовах выдатку на дызельнае паліва для прыпынення цягнікоў у памеры 90 млн рублёў у год намі прызнаны немэтазгоднымі і неапраўданымі. Акрамя таго, шэраг такіх неапраўданых прыпынкаў значна запавольваюць хуткасць руху цягніка, а гэта негатыўна адбіваецца на прыцягальнасці нашай паслугі.

У адпаведнасці з прынятай ва ўсіх краінах СНД практыкай, маладзейшыя пункты, не абстаўляваныя вакзаламі (такія, як Палевачэ), абслугоўваюцца звычайнымі прыгараднымі цягнікамі, а прыпынкі пасажырскіх цягнікоў арганізуюцца ў населеных пунктах са значным пасажырапатокам (у дадзеным выпадку гэта бліжэйшая станцыя Зябкі). Захаванне згаданага правіла агульнапрынятае. У адваротным выпадку ўявіце, у што ператворыцца транспартная паслуга па перавозцы пасажыраў, калі пасажырскі цягнік будзе мець прыпынкі ва ўсіх спадарожных населеных пунктах? Каму будзе цікавай паездка з Полацка ў Мінск, якая будзе доўжыцца каля 10 гадзін замест 5?

Лічым неабходным праінфармаваць жыхароў вёскі Празаркі і рэдакцыю пра тое, што для аўкцыёнавання паездак у Мінск ці Віцебск належыць скарыстацца паслугамі бліжэйшай станцыі Зябкі (адлегласць — 5 км), дзе маюцца вакзал, зала чакання, білетная каса, інфармацыйныя матэрыялы, туалет».

СУПЕРМАРКЕТЫ З'ЯВЯЦЦА Ў РАЙЦЭНТРАХ

У райцэнтрах Гродзенскай вобласці з'явяцца супермаркеты. Аб гэтым паведаміў старшыня праўлення Гродзенскага абласнога саюза спажывецкіх таварыстваў Станіслаў Мікша.

У гэтым годзе іх пачнуць будаваць у Лідзе, Іўі і Ашмянах. На гэтыя мэты спажывецкая кааперацыя Гродзеншчыны выдзяляе Br2 млрд уласных і пазыковых сродкаў. Здача аб'ектаў намечана на 2009 год.

Аналагічныя гандлёвыя аб'екты плануецца пабудаваць да канца 2010 года ў Мастах, Слоніме і Навагрудку. «Гэта будзе асноўны напрамак работы Гродзенскага саюза спажывецкіх таварыстваў», — адзначыў Станіслаў Мікша.

З мэтай павелічэння аб'ёмаў продажаў у 2008 годзе ў вобласці адкрыты 5 новых магазінаў спажывецкай кааперацыі. Акрамя таго, адрэстаўраваны і ўведзены ў дзеянне больш як 30 спецыялізаваных гандлёвых кропак, якія гадоў 10 таму не прыносілі прыбытак і ў сувязі з гэтым былі «законсерваваны». Усяго цяпер у сістэме Гродзенскага абласнога спажывецкага саюза дзейнічае каля 1,5 тыс. магазінаў, расказаў кіраўнік саюза.

«ГАРАЧЫ» ТЭЛЕФОН «ЗВЯЗДЫ» 287 17 41

ПРАБЛЕМА З АГАРОДЖАЙ УЗНІКЛА ПАСЛЯ ВЫСЕЧКІ КУСТОЎ. АЛЕ НОВАЯ ТУТ І НЕ ПЛАНАВАЛАСЯ...

Генадзь Аляксандравіч Раманаў з вёскі Уселюб Навагрудскага раёна — чалавек ва ўсіх сэнсах заслужаны. Агульны стаж працы аграномам у яго складае 34 гады, ён выбіраўся дэпутатам сельскага, раённага і Вярхоўнага Савета СССР адзінаццатага склікання. Напэўна, таму па-людску ён і адчувае сябе зараз моцна пакрыўджаным, чаму яшчэ, як мы зразумелі, моцна «садзейнічаюць» кпіны аднавяскоўцаў. Вось быў ты, маўляў, дэпутатам, а глянь як цяпер, з табой абышліся... А прычынай такога стану чалавека стаў... плот. Паслухаем самога заяўніка, які звярнуўся ў рэдакцыю пасля ўсіх сваіх папярэдніх і безвыніковых скаргаў у мясцовыя, раённыя інстанцыі.

— Летась у нашай вёсцы ўзводзілі аграгарадок, праводзілі добраўпарадкаванне вуліц, і нашай у тым ліку: ставілі новы плот. Мой дом стаіць недзе пасярэдзіне вуліцы, недалёка, дарэчы, ад будынка сельскага Савета, але крыху на ўзвышшы. Калі б тут ставілі новую агароджу, давялося б падрэзаць зямлю на 20—30 сантыметраў. Але ўстаноўкі я не дачакаўся — лёг у бальніцу. А плот так і не ўстанавілі. Кажуць, яго побач з тваім домам увогуле ў каштарысе не было. Як гэта: уся вуліца была, а майго дома пасярэдзіне — не? Звяртаўся з гэтай нагоды і ў сельскі Савет, і ў райвыканкам з месяц таму ездзіў, дзе абяцалі разабрацца, — тлумачыў Генадзь Аляксандравіч. — У выніку ўсё скончылася тым, што мне прапанавалі былы ў карыстанні драўляны плот, які я павінен буду ўстанаўліваць самастойна. Пакольскі самя я пасля аперацыі, жонка — таксама пенсіянерка, а дзеці ўжо даўно жывуць асобна, значыць, трэба будзе наймаць людзей, плаціць грошы. Усім, значыць, паставілі новую агароджу і бясплатна, а мне старую і за грошы?..

Старшыня Ўсялюбскага сельскага Савета Васіль Кароль зараз у водпуску, таму па маёй просьбе сітуацыю (а яна, відавочна, ужо даўно тут на слыху) пракаментавала сакратар Жана Вежаль. Ні ў якім разе не ставім пад сумненне словы Генадзя Аляксандравіча, але версія, выкладзеная Жанай Аляксандраўнай, некалькі адрозніваецца ад інфармацыі нашага заяўніка.

— Новая агароджа сапраўды не даходзіць да дома Раманава, але гаварыць, што ён «выпаў» якраз пасярэдзіне, не выпадае: за ім стаіць дом сына-інваліда, які ўстанаўліваў агароджу за свой кошт, потым ідуць будынкі праўлення СВК «Усялюб» і сельскага Савета, а за імі ўжо фактычна пачынаецца іншая вуліца з іншай агароджай, — патлумачыла Жана Вежаль. — Дом вашага заяўніка стаіць крыху вышэй вуліцы і раней побач з ім раслі кусты, за якімі ўласная агароджа Раманава не была нават бачная. Потым ён іх высек і, натуральна, агароджа стала бачная. Драўляная, яна сапраўды не вельмі новая, але, лічу, вялікага кантрасту, пакольку стаіць некалькі ўбаку, з раней устаноўленай новай няма. Па якой прычыне гэты кавалак вуліцы некалі не трапіў у каштарыс, я вам сказаць не магу, пакольскі яго заказвалі раённыя ўлады, а выконвала праектнае бюро з Навагрудка.

Як сказала далей Жана Аляксандраўна, гаворка можа ісці пра 13 секцый агароджы па тры метры кожная (гэта драўляны плот) і 14 жалезабетонных слупкоў. Колькі гэта можа каштаваць, сураз моўца не ведала. Але можна здагадацца, што не вельмі мала. Між тым, бюджэт сельскага Савета практычна не мае сродкаў, прынамсі, пад такія мэты, як устаноўка памянёнага вышэй «кавалка» агароджы (нагадаем, на іншай працягласці вуліцы новая агароджа ўстанаўлівалася падчас узвядзення аграгарадка, адпаведна, фінансаваліся гэтыя работы зусім з іншых крыніц). Таму ўсё, што сельскі Савет можа зрабіць для Генадзя Аляксандравіча — гэта прапанаваць яму былы ў карыстанні драўляны плот, ад якога, як мы ўжо ведаем, наш чытач, мякка кажучы, не ў захапленні...

Пасля гэтага мы патэлефанавалі намесніку старшыні Навагрудскага райвыканкама Юрыю Калановічу. Апошні ўжо быў у курсе справы, бо дагэтуль мы тэлефанавалі ў прыёмную старшыні выканаўчага камітэта. Пакольскі, як заўважыў Юрый Аляксандравіч, на ўласныя вочы той агароджы Раманава не бачыў, дык паабяцаў выехаць у вёску да нашага заяўніка, каб можна было прыняць нейкае рашэнне, абапіраючыся на канкрэтную сітуацыю на месцы.

Недзе праз тры гадзіны мы зноў звязаліся з Юрыем Аляксандравічам, які за гэты час паспеў пабываць у вёсцы. Сапраўды, пацвердзіў суразмоўца, пасля таго як Раманаў высек кусты, яго агароджа «вылезла» на ўсеагульны агляд. Выгляд у яе стараваты.

— Грамадзяніну будзе прапанаваны наступны варыянт: сельскі Савет можа яму выдзеліць сем пралётаў абсалютна новай драўлянай агароджы з бетоннымі слупкамі, якія засталіся пасля добраўпарадкавання аграгарадка. Чалавек мае трох дарослых дзяцей, якія маглі б дапамагчы яму ўстанавіць гэтую агароджу. Яшчэ варыянт, які мы яму можам падказаць: няхай звернецца ў мясцовае СВК як ветэран працы па дапамогу ва ўстаноўцы. Праўда, якое рашэнне па гэтай просьбе будзе прынята, я спрагназаваць не магу.

— Але, як мне паведамілі ў сельскім Савеце, там патрэбна не сем, а трынаццаць пралётаў...

— Значыць, яму могуць выдзеліць сем пралётаў новай агароджы, а астатнія — былыя ў карыстанні. Хоць гэта агароджа і прастаяла ўсяго два гады, калі пафарбаваць і новую, і старую — нічога не будзе бачна. Вось такую прапанову грамадзяніну можа зрабіць сельскі Савет.

...У прамежку паміж дзвюма размовамі з Юрыем Калановічам я яшчэ раз патэлефанаваў Генадзю Аляксандравічу. Між іншым у размове ён сказаў, што, маўляў, будзе лічыць добраўпарадкаванне ў аграгарадку цалкам завершаным толькі пасля ўстаноўкі яму новай агароджы. Не хацелася б нікога асуджаць і нечым папракаць, але, здаецца, нашаму заяўніку варта было б прыслухацца да прапаноў, якія прагучалі. Паважаны Генадзь Аляксандравіч чамусьці высек кусты ўздоўж старой сваёй агароджы, хоць некаторыя мае суразмоўцы казалі, што яны былі тут да месца. Уласна, праблема з'явілася з іх знікненнем. А «смалы ў агонь», магчыма, падлілі некаторыя аднавяскоўцы, прымусіўшы чалавека пакрыўдзіцца на ўвесь белы свет...

P.S. Назаўтра мы зноў патэлефанавалі Генадзю Аляксандравічу. Прапановы ад сельскага Савета яму яшчэ не было. Мы пераказалі яе сутнасць. Наколькі зразумелі, заяўніка яна не задаволіць. З яго вуснаў прагучалі словы адносна прынцыпу — як з боку сельскага Савета, так і з яго ўласнага. Ці будзе карысць ад гэтай «вайны прынцыпаў»?

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні;

АНІКЕЕВА Л. А., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце;

САСОНКА М. П., член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце;

СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292 21 03.

Простая мова

ЛЮДЗІ І ПТУШКІ

...Знаёмы колісь, ну зразумела ж, пажартаваць хацеў: на адной з маіх папак для пісьмаў-папер (кардоннай такой, з завязкамі... Помніце?) перад словам «дело» вывеў яшчэ адно — «Нашли»...

Над тым, што атрымалася, можна было пасмяяцца (пяць хвілін). А вось думаць — ці не ўсё жыццё. Бо пісанне — яно ж і насамрэч справа вельмі спецыфічная (і каму патрэбная? Асабліва цяпер...).

Думала так, пакуль не прыхварэла, дакладней — пакуль, прыхварэўшы, не палезла па лекі і не знайшла сярод іх прапаліс і мёд з Бярэзіншчыны, шалфей з Рагачоўшчыны, настойку аніса з Мінска. І зноў жа — ад чытачкі...

Піла — усё па чарзе, цэлы дзень. Вечарам — ужо нешта пісала. Для тых самых чытачак і чытачоў, якім (дурань думай багацее. — Аўт.) гэта — патрэбна.

КУФЭРАК ПРОСТА АДЧЫНЯЎСЯ

Горад, раніца, выхадны. На вуліцы, лічы, што пуста — кожнага відаць. Тым больш...

Мужчынка насустрач — бы са споведзі ідзе: твар прасветлены, вочы гараць... Нясе штось — аберуч, да грудзей прытуліўшы.

Думала: сабачку маленькага ці катка...

Не, памылілася — чатыры бутэлькі гарэлкі: ручкі ў пакеце парваліся.

НЕ ПРА БОТЫ

Зручна — побач з домам «Рамонт абутку». Па дарозе на працу забегла — чаргі аніякай.

— Што у вас? — спытаў майстар-каўказец.

— Боты...

— Это сапоги? — усміхнуўся ён і, пазначыўшы крэйдай «аб'ём работы», сказаў, калі іх забраць.

Забегла яшчэ раз. Здаецца, назаўтра, па дарозе дамоў. Аднак майстра таго ўжо не было — другі працаваў, тутэйшы (на твары напісана). Што цікава, акурат тым жа тонам ён запытаў:

— Что у вас?

Тым жа словам яму адказала:

— Боты.

— Это что — сапоги? — з'едліва прамовіў ён, «не зразумеўшы».

— Гэта — боты, — адказала я і таксама не разумеючы...

Зручна, як быццам: побач з домам майстэрня, — абутак жа правіць трэба недзе далей.

ЛЮДЗІ І ПТУШКІ

Брат — чалавек памяркоўны. Напрадвесні вось пасядзеў, «памеркаваў» і замест двух шпакоўняў зрабіў адну — двухпавярховую. Эканоміў пядзю-другую дошкі, час...

Праўда, затым давялося памагатых склікаць, каб выраб павесіць...

Да таго ж і птушкам задачку задаў: дзе лепей жыць — уверсе? Ці ўнізе?

Лётали, бедныя, між сабой ваявалі...

Хоць з пункту гледжання людзей гэта і няварта, бо і першы паверх, як вядома, не мёд, і апошні — не рэдзька: і ў тым, і ў тым нават перавагі ёсць. Ну вось «убачце»...

Двор, як двор (гарадскі) і дом, як дом — свечачкай: адзін пад'езд, 12 паверхаў. На апошнім, штораніцы, фортка адчыняецца, з яе — вытыркаецца галава (чорная, мужчынская), выдыхае цыгарэтны дым, паварочваецца, пазіраючы вакол, хаваецца ў пакой (відаць, па чарговую зацяжку?), зноў высоўваецца...

І тым самым — ну вельмі нагадвае шпакаву!..

Адно — птушачка, высунуўшы голаў з дамка, тут жа наспявала б песень.

Чалавек — надыміў. Напляваў. Кінуў уніз недакурак.

Homo sapiens.

ГЕНЫ — СІЛА!

Мінск, універмаг. Не сказаць, каб дужа шматлюдны, але ж на рынкі пайшлі не ўсе: многія, па старынцы, абноўкі шукаюць тут. На ногі, у прыватнасці.

Аддзел абутку, значыць. У цэнтры — двое: маладзіца (а ўжо пышнавалосая, пышнацелая!..), прыпадняўшы падол, круціцца перад люстэркам — мерае басаножкі, мужчына (яўна чужы ёй, сталы, каржакаваты) побач сядзіць, «балдзее» — ад усяго: ад жаночай пекнаты, ад таго, што тут і цяпер ён, відавочна, за спонсара... А галоўнае — ад таго, што гэта прыгажуня, агаліўшы круглыя калені, глядзіць не столькі ў люстэрка, колькі ў вочы яму: ну як, маўляў, басаножкі? Бяром? За табой апошнія слова...

А таму — спонсары, мужчыны народ грунтоўны — гучаць папярэднія:

— По ноге нормально? Твой размер?

Жанчына, прыгожа чырванеючы, згодна ківае.

— А удобные? Каблук — не высокий?

— Нет... Я такой все время ношу.

— І не жмут нигде?.. Не... **муляют**?

...Здалося: нехта з продкаў таго мужыка (мо, з самых высокіх нябёсаў) стаміўся замілавана глядзець на парачку і «спусціўся» сюды, у гандлёвую залу... Каб асвяціць яе. Сваёй добрай усмешкай.

БАГАЧ-БЯДАК

Адзін з герояў Шукшына, калі помніце, «вераваў» — «у механізацыю, электрыфікацыю», у тое, што людзі пазбіваюцца ў вялікіх смярдзючых гарадах. А пасля — разбягуцца... У чыстае поле.

...Наконт поля — пакуль не скажу, а вось у вёсках-хутарах — гарадскіх цяпер шмат: хаты купляюць, новыя навіны вязуць, кшталту — заміж гародчыкаў-град там ужо і газоны, заміж кветнікаў — альпійскія горкі, у садах — басейны, гамакі, шашлыкі, а над усім — «музон», прычым з ранку да вечара...

Ваван рашыў далей пайсці — у вёску петардаў навёз. Ноч-апоўнач з сябрамі, з сяброўкамі, сталі ўзрываць: свята першай радыскі, феерверк — у іх...

А ў сяле — пярэпалах: людзі, ды спрасонку, рашылі, што вайна. І ў сподніх... З хат...

Хто выскачыў, — маладзец: убачыў (даслоўна. — **Аўт.**), «як грошы гараць», плюнуў ды назад пайшоў, дасыпаць, хто не...

Бабка Марыля — абязножыўшы: гадоў з пяць ужо на двор не выходзіць і адна жыве... Прачнулася ад тых выбухаў, — рашыла, што ў некага хата гарыць, шыфер трашчыць.

А руку ў вёсцы — ніякага. І пажарных няма, не едуць.

Да ранку чакала, да ранку — не спала: пра бедных пагарэльцаў думала.

І таму Ваванаў феерверк, безумоўна, запомніла.

...Хоць яна.

ЛЮБЫ — НЕ ЛЮБЫ

Ґастраном — месца спецыфічнае і, зразумела ж, не лепшае для сустрэч. Але мы — згаварыліся. А таму пакорліва стаю (ля ўвахода), чакаю: каб не так самотна было, разглядаю тавары ў блізкім шапіку, потым кветкі на клумбе, хоць-нехаць (вушы ж не заткнеш) чую паблізу:

— Э-э, у цябе грошы ёсць?

Пытаюць гэта, дзякуй Богу, не ў мяне, пытаюць у... многіх. Двое выпівох такім чынам — шукаюць трэцяга. Шукаюць, відаць, даўно (у адказ ім нехта адмахваецца, нехта кажа, што і сам бы выпіць не дурны...), але ж не марна (!), бо адзін з мужыкоў раптам выдае:

— Грошы?.. Ды не бяды — зараз будуць.

— А дзе ты возьмеш? — з недаверам пытаюць аматары.

— Жонка прынясе.

— ?!

— Вось убачыце!

Мы — глядзім. Глядзім, як ён выцягвае з кішэні мабільнік, як, прыклаўшы да вуха, загадвае: «Э-э... Адна нага там, другая — тут. Шэсць тысяч гані. Я ля гастранома».

Хлопцы здзіўлена маўчаць, а «Астапа ўжо панесла»:

— Яна ў мяне во дзе, во дзе! — крычыць ён, падымаючы ўверх кулак. — Бо я — зарабляю, бо я ёй на стол кожны месяц штуку кладу. Ты — тысячу долараў кладзеш? Не... А мяне, яна ведае, з такімі бабкамі — любая прыме.

...Любая — мо і сапраўды? Прыме. А вось любая...

АД ПРАЕКТА ДА АБ'ЕКТА

Сталіца. Дарога. Затор. Прычына вядомая — напарадзе ідзе рамонт. Гэта значыць, новымі плітамі высцілаюцца ходнікі, мяняецца бардзюрны камень, а ў завяршэнне і асфальт на праезнай частцы. Што, зразумела ж, добра. З аднаго боку...

Дрэнна — з другога: праект, відаць, «малявалі» даўно, тады — дзвюх палос для праезду хапала. Сёння — не. Не кажучы ўжо пра заўтра...

А гэта значыць, што праз год-другі тут зноў пачнецца рамонт: зноў будзе мяняцца плітка, бардзюрны камень, асфальт. У будаўнікоў — зноўку будзе работа.

Дасць бог, тады — з разлікам. На перспектыву.

КАЛІ Б...

«Это было недавно, это было давно»: без блату — ні жыць, ні памерці. А ўжо каб потымды помнік заказаць!.. Мы (гэта так, да слова...) — дзе толькі ні былі!.. Каліць...

Цяпер, у трох прыпынках ад дома, аж тры майстэрні. Камень — любых памераў, хочаш — белы, хочаш чорны, хочаш зялёны ў крапінку, можна — з партрэтам альбо медальёнам, можна — з якім заўгодна малюнкам і тэкстам, з пастаментам, з кветнікам, абгародкай, лавачкай і нават столікам побач. Зробяць, завязуць (хоць за блізкі свет) і паставяць. Толькі плаці.

Выбраўшы, зразумела ж, каму...

Прыяцелька «ў працэсе» цяпер: ходзіць, ездзіць, прыкідвае што па чым — выбірае.

Каб лягчэй было, у адной з майстэрняў ёй далі каталог (дакладней — вялікі альбом са здымкамі ўжо гатовых помнікаў з партрэтамі, імёнамі, датамі...). Разгарнула і ледзь не самлела: на адным з медальёнаў быў... Ён, хлопец, якога некалі, так моцна кахала, якога некалі так доўга чакала з арміі і які, вярнуўшыся, пабраўся не з ёй.

Ад гора, ад крыўды як не звар'яцела... Тады.

І цяпер... Пакутуе. Бо першае, жахліва: «Не можа быць!.. Гэта што — я ўдавою была б?!» змяніла на не менш балючае: «А мо са мной ён жыў бы і жыў?».

ПЕРАД ЗАЗІМКАМ

...У школу мальца збіралі ўсе разам: з матуляй яны доўга намяралі першы касцюм, з дзедам і бабуляй — расшукалі ў ГУМе самы круты палітончык.

Праўда, малы тады, прыбраўшыся і ўбачыўшы сябе ў люстэрка, выдаў ці не класічнае: «А я што — і зімой буду ў школу хадзіць?»...

Пасля той, самай першай зімы, лічы, куляй праляцелі дзесяць школьных і аж тры студэнцкія... Пасля якіх, па вясне, ён прывёў у сям'ю жанчыну з дзіцем і сказаў: «Пазнаёмцеся. Гэта — жонка...».

Што было рабіць — пазнаёміліся і, напэўна, нідзе не дзеліся б — прынялі (і яе, і тое малое), калі б да яго, хваравітага, ледзь не праз дзень, не сталі прыязджаць то родны бацька, то дзяды і бабулямі, то цёткі... Калі б малая, пасля чарговага іх візіту, не сказала гэтай, новай сям'і: «Я вас — не юблю... Вы мне не ёдныя»...

Стаць першымі, любімымі, шанц у іх яшчэ быў і нават застаўся, а вось другімі...

Так трэба жыць.

І перажываць ужо новыя «зімы».

ПАРАДАК СПРАЎ

...Звычная рэч — каляндар. Звычна і называецца — перакідны. Гэта значыць, дзень перажыў — лісток «перакінуў».

З імі, з лісткамі (і — згадзіцеся — зусім неўпрыкмет!) «перакінуўся» месяц, два, тры...

Акурат таксама «перакінецца» год (ці колькі там Богам «адмерана»?), пакуль...

Пакуль у той жа нябыт, не адправішся сам.

Валянціна ДОЎНАР.

Пінскі раён. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«ЧАРТАР» З ДАБРАСЛАЎКІ

Людзі ў форме сталі больш ветлівымі

Ноў-хаў Віцебскай вобласці па вывучэнні грамадскай думкі аб дзейнасці міліцыі сябе добра апраўдвае.

— Мы маем прамую сувязь з насельніцтвам, — адзначыў начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама Леанід Фармагей. — Кожны, хто звяртаецца ў міліцыю па дапамогу, атрымлівае спецыяльныя анкеты з 7 пытаннямі. Крытычныя заўвагі вельмі ўважліва вывучаюцца. У выніку мы аператыўна ўносім карэкціроўкі ў кадравай рабоце і па пытаннях навучэння супрацоўнікаў. Як высветлілася, у Прыдзвінскім рэгіёне найбольш давяраюць міліцыі ў Дубровенскім раёне — больш за палову апытаных. Найгоршы паказчык у Шумілінскім — менш як 25 працэнтаў.

Амаль кожны пяты апытаны грамадзянін не задаволены аператыўнасцю рэагавання міліцыі на заяву. Затое ў параўнанні з вынікамі анкетавання, што правялі летась, значна павялічылася колькасць грамадзян, якія адзначылі ветлівасць і ўважлівасць супрацоўнікаў — з 22,4 да 36 працэнтаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Трашчалі сцены ў гаражах

Адной і той жа раніцай у Рэчыцкі райаддзел унутраных спраў звярнуліся два жыхары горада з заявай: знайдзіце зладзеяў, якія ноччу праламалі сцены іх гаражоў і ўгналі легкавушкі, у баках якіх знаходзілася 50 і 60 літраў дызельнага паліва. Міліцыя ў пошуках, але вось пытанне: чаму і «Аўдзі-80», і «Форд-Галаксі» не былі абсталяваныя ні сігналізацыяй, ні іншымі супрацьугоннымі сродкамі?

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Рашэнне Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь

АБ ДАПАЎНЕННІ РЭГЛАМЕНТУ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., намесніка Старшыні Марыскіна А.У., суддзяў Бойка Т.С., Ісоткі У.П., Козыравай Л.Р., Падгрушы В.В., Рабцава Л.М., Сяргеевай В.Г., Цікавенкі А.Ґ., Чыгрынава С.П., Шукліна В.З. у мэтах рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 чэрвеня 2008 г. № 14 «Аб некаторых мерах па ўдасканальванні дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь» разгледзеў справы аб праверцы канстытуцыйнасці закона ў парадку абавязковага папярэдняга кантролю ажыццяўляецца ў пісьмовай форме ў адпаведнасці з пунктам 3 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 чэрвеня 2008 г. № 14 «Аб некаторых мерах па ўдасканальванні дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь» без запрашэння ў судовае пасяджэнне прадстаўнікоў палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Па выніках праверкі канстытуцыйнасці закона ў парадку абавязковага папярэдняга кантролю Канстытуцыйны Суд прымае рашэнне, якое афармляецца ў выглядзе асобнага дакумента.»

2. Гэта рашэнне ўступае ў сілу з дня прыняцця.

3. Апублікаваць гэта рашэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Старшынствуючы —
Старшыня Канстытуцыйнага Суда
Рэспублікі Беларусь П.П. Міклашэвіч
30 чэрвеня 2008 г., г. Мінск
№ Р-205/2008

ВЫРАШЫЎ:

1. Дапоўніць Рэгламент Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, прыняты рашэннем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 18 верасня 1997 г. № Р-58/97, артыкулам 43^2 наступнага зместу:

«Артыкул 43^2. Асаблівасці разгляду пытанняў аб праверцы канстытуцыйнасці законаў у парадку абавязковага папярэдняга кантролю

Канстытуцыйны Суд ажыццяўляе абавязковы папярэдні кантроль канстытуцыйнасці ўсіх законаў, прынятых Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і адобраных Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ці прынятых Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у парадку, прадугледжаным часткай пятай артыкула 100 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, — да падпісання дадзеных законаў Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Добрыя людзі

ВОВА І ШЫЛЬДА

Жонка замовіла шыльду на наш новы дом «Вуліца БЭЗАВАЯ, дом № 7». Зараз жыву я на Чырвонай, а буду жыць яшчэ і на Бэзавай. Мне падабаецца, як гучыць адрас, і ўнук Вова лёгка запомніць: «Вёска Сёмкава, Бэзавая, сем».

РАКІЦКІ І ЭТАЖЭРКА

Рэстаўратар Ракіцкі, пабачыўшы мой фотаальбом з дзіцячымі здымкамі, звярнуў увагу на адну картачку, дзе я двухгадовы сяджу каля этажэркі з кніжкамі. Рэстаўратар пачаў разважаць на тэму майго мастакоўскага жыцця: «Табе, каб стаць мастаком, трэба пазбавіцца ад вобраза, які склаўся на гэтай фотакартачцы. Трэба адкінуць прэч пісьменніцкую пыху, што была ў цябе з дзяцінства. Толькі выйшаўшы з вобраза пісьменніка, ты зможаш стаць мастаком...» Я паслухаў Ракіцкага і паспрабаваў пазбыцца таго вобраза, што быў зафіксаваны фатографам. Чым болей я спрабаваў аддаліцца ад этажэркі з кнігамі, тым больш яна вабіла мяне. Пэўна, я так і не стаў тым мастаком, якога бачыў у ва мне рэстаўратар Ракіцкі, але я не нараканю на лёс, які назаўсёды звязаў мяне з кніжнымі паліцамі.

ЮНГЕР І РАДАСЛОЎНАЯ

У 1956 годзе Эрнст Юнгер заўважыў: «...менш за ўсё падазрэнняў выклікае чалавек без якасцяў. Нельга дапусціць, каб цябе аднеслі да арыстакратаў, да памешчыкаў, капіталістаў, кулакоў, цыганоў, яўрэяў ці нават проста да гараджанаў. Таму сёння правадыры народных дзяржаў імкнуцца мець як мага больш нязначную радаслоўную». Разважаючы ўслед за Юнгерам, варта сказаць, што толькі чалавек з малазначнай радаслоўнай можа выглядаць у вачах народа як асоба ні ў чым не вінаватая і са спакойным сумленнем.

ВОЛЬГА І ДАВЕДКА

Атрымаць даведку праз сваю хваробу значна лягчэй, чым засведчыць сваё здароўе. Чамусьці дактары з большай радасцю гаворацъ пра паталогіі і з меншай пра нармальнасць і здароўе. Калі ты адчуваеш сябе добра, дык чаго прыйшоў у паліклініку? Вольга вырашыла атрымаць вадзіцельскія правы, таму і наведалася да доктара ды папрасіла сваю медыцынскую карту. А карта не знайшлася. Доктар ураўзліва агледзеў наведніцу і змрочна сказаў: «Вашых дакументаў у нас няма, бо вы памерлі». — «Якое глупства! Я сяджу перад вашымі вачыма жывая і здаровая. Заўважце, я не толькі не мёртвая, я — цалкам здаровы і адэкватны чалавек. А вы што мне гаворыце? Вы набраліся нахабства і сказалі, што я памерла...» — «Не трэба хвалявацца. Нічога страшнага не здарылася...» — «Вы яшчэ здзекуецеся з жанчыны? Забаўку знайшлі?» — «Я не здзекуюся, я дзейнічаю па інструкцыі. Колькі гадоў вы не звярталіся ў паліклініку?» — «Не памятаю...» — «Вось так. Вы больш за пяць гадоў не звярталіся ў паліклініку, а таму дакументаў вашых больш няма. Калі чалавек пяць гадоў не звяртаецца ў паліклініку, значыць што? Значыць, ён памёр!» — «Выдатна, я памерла, а цяпер нарадзілася. Што мне трэба зрабіць, каб атрымаць даведку пра сваё добрае здароўе?» — «Усе прышчэпкі ад розных воспаў мы вам рабіць не станем, але супрацьслупнякоўы ўкол давядзецца зрабіць!» І зрабілі! А толькі потым выдалі Вользе даведку, што яна жывая і здаровая.

ГАНДЛЯР І ЖОНКА

Сытатвары гандляр брыльянтамі паскардзіўся: маўляў, працуе ён два гады ў амстэрдамскай краме, а сказаць уласнай жонцы пра сваю работу нічога не можа, бо скажы, і захоча яна каштоўны камень. А так не ведае і не хоча. На расповед лысаватага гандляра я і ўвагі не звярнуў, бо заняты быў падлікамі. Якая мне справа да жаданняў чужой жонкі, калі я выбіраю брыльянт у падарунак для любай дачкі? У мяне свае праблемы, а ў яго свае перажыванні, бо бачымся мы першы і апошні раз. Выйшаў я з брыльянтавай крамы з пярсцёнкам у кішэні і забыўся пра мяккакрукага гандляра. Успомніў я пра яго выпадкова, у віленскай рэстарацыі глянуў на руку дачкі, брыльянт востра бліснуў мне ў вока, і згадаўся гандляр з аповедам пра жонку. Тут і падумалася: гандляр ілгаў мне пра тое, што ён не можа набыць камень. Зразумела, расповеды побытавых казак — ягоная праца, але мне ад той даўняй прафесійнай хлусні чамусьці стала кепскавата.

СВЕТА І ПАШТОЎКІ

Мае аднакласніцы збіралі паштоўкі з тварамі савецкіх кінаартыстаў. Яны б з радасцю куплялі паштоўкі з тварамі замежных артыстаў, але ў савецкіх шапіках «Саюздруку» прадаваліся адно эсэсэраўскія кіназоркі. Толькі ў адной Светы былі паштоўкі з усмешкамі замежных кіназорак. Тыя паштоўкі ёй дасылалі сваякі з Польшчы. Усе дзяўчаты зайздросцілі Свеце, ад зайздрасці яны казалі, што сама яна — брыдкатварая.

АРЫСТОЦЕЛЬ І ГНЯЎЛІВАСЦЬ

Каб супакоіць ды абразуміць раз'юшанага цара, Арыстоцель напісаў Македонскаму так: «Раздражнёнасць і гняўлівасць павінна накіроўвацца не супроць ніжэйшых, а супроць вышэйшых. Роўных табе няма». Не буду казаць пра тых, хто крыўдзіць слабейшых ды нікчэмнейшых за сябе, іх не ўратуем. Скажу пра тых, хто скіроўвае неўтаймоўную гняўлівасць на вышэйшых за сябе. Выглядаюць яны гнюсна, не раўнучы — падлалюбівыя гіены побач з ільвом. На мой розум: у спрэчках і змаганнях павінна быць адпаведнасць, мусіць быць роўны шанец, як на перамогу, так і на паразу. Выказванне Арыстоцеля ў сутнасці сваёй нагадвае нам пра роўнасць, а не пра ніжэйшасць ды вышэйшасць.

Адам ГЛОБУС.

У Беларусі адкрываюцца новыя хоспісы

Колькасць хоспісаў — устаноў сістэмы аховы здароўя, дзе аказваюць медыцынскую, сацыяльную і псіхалагічную дапамогу пацыентам у апошняй стадыі хваробы і псіхалагічную падтрымку іх сваякам, папоўніцца ў гэтым годзе сямю новымі.

Аб гэтым паведаміла Таццяна Мігаль, намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі, начальнік аддзела спецыялізаванай медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя.

У сталічнай вобласці хоспіс на 30 ложкаў адкрыецца на базе Рудзенскай раённай бальніцы. Першых пацыентаў падобныя медустановы прымуць таксама ў Віцебскай (45 ложкаў), Гомельскай (20), Брэсцкай (20), Магілёўскай (30) абласцях, а таксама ў Магілёве (20 ложкаў) і Гродне (10).

У Мінску дзейнічае хоспіс са стацыянарам на 28 ложкаў, аддзяленнем дзённага знаходжання на 20 наведванняў у дзень і выязной службай у складзе з 5 урачэбна-сястрынскіх брыгад.

Таццяна БІЦЮК,
«Мінск—Навіны».

Парламенцкая трыбуна

Дэпутацтва: місія выканальная

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 8 ліпеня.)

Сяргей КАСЦЯН адзначыў, што ідзе збор інфармацыі па рабоце судоў, пракуратуры:

— Мяркую, наступнае скліканне прыме рашучыя меры для таго, каб суд сапраўды абараняў інтарэсы грамадзян, а не кругавую паруку. У нас толькі ў адным-двух працэнтах выпадкаў вышэйстаячыя суды адмяняюць рашэнні падначаленых ім устаноў. Усё астатняе штампуецца. Я аб гэтым не раз казаў: сёння шмат людзей сядзіць па надуманых абвінавачваннях. Вы ж паглядзіце, у нас ужо турмаў не хапае!

— Дэпутат падкрэсліў, што, на яго думку, беларускія законы ў судовай галіне неабходна карэктаваць. І нават прапанаваў падыход:

— Мы ўсё ўзмацняем і ўзмацняем адказнасць, а на прафілактыку забываемся. Ніхто не інфармуе, не папярэджвае, выхаваўчая праца спрэс адсутнічае.

Ёсць у дэпутата і свой арыгінальны спосаб барацьбы з тымі, хто кідае смецце проста сабе пад ногі:

— Літаральна днямі ішоў з работы, напарадзе шпацыруюць дзве маладыя дзяўчыны. Мала таго, што паляць, дык яшчэ і недакуркі на асфальт кідаюць. На заўвагі яны не рэагуюць. А чаму б са схаванай камерай за такімі не пасачыць і не паказаць потым на ўсю краіну?! Хто ж іх замуж потым возьме: мужчыны ж усе крыху мяшчане — любяць, калі ўтульна. А яна сёння недакурак выкінула, а заўтра ў яе ў кватэры — чорт нагу зломіць. Вось гэта было б лепш за тысячу лекцый!

Беларускую парламенцкую сістэму дэпутат ацэньвае ў параўнанні з замежным вопытам:

— Ці можна назваць моцным парламент у тых краінах, дзе яго склад мяняецца праз год—паўтара, як, скажам, у Італіі, Сербіі, ва Украіне? Парламенту там няма калі займацца эканамічнымі пытаннямі, інтарэсамі сваіх грамадзян — яго пастаянаюць палітычныя звады. А вось наш парламент сапраўды моцны, — упэўнены Сяргей Касцян. — Моцны сваёй працаздольнасцю, тым, што дэпутаты не адарваныя ад сваіх выбаршчыкаў — у нас жа такая актыўная праца ў акругах. Штомесяц у мяне ад 10 да 20 сустрэч з выбаршчыкамі — у працоўных калектывах, клубах, крамах, на мехпадворках — там, дзе збіраюцца людзі. Разгляраны прыём па асабістых пытаннях. Абавязкова з'яўляецца інфармацыя ва ўсіх чатырох раённых газетах маёй акругі. Бяру ўдзел у мерапрыемствах, сустракаюся з моладдзю.

Процілеглыя погляды ў дэпутата на партыйную сістэму:

— Беларусы кажуць «умела гатаваць, але не ўмела падаваць» — гэта якраз пра нашы партыі. Партыя — перш за ўсё лідар, якому вераць не толькі паплечнікі, але і масы. У нас зарэгістравана 17 партый, аднак такіх лідараў я сёння не бачу, і наогул не ведаю, чым займаюцца гэтыя партыі.

Дарэчы, сам дэпутат — член Камуністычнай партыі Беларусі:

— Гэта адзіная арганізаваная партыя. Аднак і там няма лідара, якога б ведала краіна, да якога б выбаршчыкі цягнуліся і прыслухоўваліся. Ну і як жа нам праводзіць выбары па партыйных спісах? Бессэнсоўна, гэта будзе правал! Ну вось «Белую Русь» там стваралюць, я нічога не хачу сказаць аб тых, хто яе ўзначальвае. Але хіба іх ведае краіна? Чым і як яны вылучыліся? А ў кожнага з іх такая магчымасць была! Людзі не бачаць лідараў, таму і ў партыі не вераць!

Пра неабходнасць пашырэння паўнамоцтваў беларускага парламента Сяргей Касцян выказаўся так:

— Хіба што ў адным — узгадняць з дэпутатамі ўсе інструкцыі, усе падзаконныя акты. Мы ўносілі такую прапанову ў законапраект аб Нацыянальным сходзе. Неабходнасць абумоўлена тым, што нашы законы нярэдка выпустошваюцца інструкцыямі, якія складаюць чыноўнікі. Яны паміж сабой дамаўляюцца і робяць так, як зручней ім. У выніку краіна пачынае жыць не па законах, а па інструкцыях.

Сяргей Касцян выбіраўся дэпутатам тройчы і восенню плануе зрабіць чацвёртую спробу. Місію дэпутата ён бачыць у тым, каб служыць інтарэсам народа.

«ТРАЦЕЙСКІ СУДДЗЯ»

Вольга АБРАМАВА, дэпутат ад Калінаўскай выбарчай акругі № 108, член Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце, адзначыла, што выбаршчыкі часцей за ўсё скардзяцца на работу службаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі. У дапамогу ім яна ініцыявала падрыхтоўку законапраекта аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг. Яго на гэтай сесіі, дарэчы, прынялі ў двух чытаннях у Палаце прадстаўнікоў і ўхвалілі ў Савеце Рэспублікі.

— Калі людзі скардзяцца на дрэнную работу нейкіх сантэхнікаў, ніхто не бярэ ў разлік, што гэта не мае ніякага дачынення да дзейнасці дэпутата, — падкрэсліла Вольга Абрамава. — Аднак са шматгадовай практыкі ў мяне склалася перакананне, што без асветніцкай работы дзяржавы ў гэтай накірунку сітуацыя не зменіцца. Людзі лічаць па старынцы, што менавіта дэпутат павінен вырашыць усе праблемы. На пытанне, ці звярталіся яны ў ЖЭК або ЖРЭА, я часцей атрымліваю адмоўны адказ. Праўда, многія маё выбаршчыкі з часам прызвычаіліся да таго, што перш чым прыйсці да мяне на прыём, яны павінны паказаць, што зрабілі самі. Я не падтрымліваю «спажывецкі» падыход, і з многімі выбаршчыкамі мы знайшлі ўзаемаразуменне. Выключэнне складаюць толькі пенсіянеры, ветэраны вайны, інваліды. Тут я адкладаю ўбок усе свае перакананні і дапамагаю ім незалежна ад таго, прыкладалі яны дагэтуль уласныя намаганні ці не. Я лічу, што гэтая катэгорыя выбаршчыкаў мае патрэбу ў асаблівай абароне.

Дэпутат глядзіць у корань камунальных праблем сваёй акругі:

— Гэта мясцовасць пераважна старой забудовы, ёсць нават даваенныя дамы — сама жыву ў адным з такіх. Натуральна, на рашэнне жыллёва-камунальных праблем у гэтай акрузе патрабуецца больш сродкаў. Трэба ўвесці істотны павышаючы каэфіцыент пры выдзяленні сродкаў на бягучы і капітальны рамонт у такіх мікрараёнах. Я многія гады спрабую перакнаць у гэтым гарадскую адміністрацыю, аднак пакуль беспаспяхова.

Вольга Абрамава акрэсліла таксама кола спраў, якімі яна прынцыпова не займаецца:

— Не ў маёй кампетэнцыі вырашаць пытанні наконт судовых разбораў і задавальняць просьбы людзей дапамагчы ім атрымаць кватэру. Гэтым займаюцца адпаведныя ведамствы, а не дэпутаты парламента.

Прызначэнне ж дэпутата, на думку Вольгі Абрамавай, у тым, каб быць гэткім трацейскім суддзёй — выслухоўваць меркаванні канфліктуючых бакоў і прапаноўваць рашэнне, якое б задаволіла і тых, і другіх:

— Удзельнік канфлікту можа ўспрымаць сітуацыю ў скажоным выглядзе, таму неабходны погляд збоку. Часцей звяртаюцца па ўстанаўленне справядлівасці ў адносінах з органамі дзяржаўнай улады. Калі я бачу, што справядлівасць сапраўды парушана, то, закасаўшы рукавы, пачынаю займацца вырашэннем праблемы. Часам для таго, каб удзейсць сітуацыю, патрабуецца да пяці паслядоўных зваротаў у розныя інстанцыі.

Як дэпутату са стажам, Вользе Абрамавай не раз даводзілася праяўляць майстэрства дыпламата ў вырашэнні канфлікту:

— Памятаю сітуацыю, калі жыхары дома, у якім размяшчалася піцэрыя, былі незадаволеныя рэжымам яе работы. Я звяла разам у сваёй грамадскай прыёмнай прадстаўнікоў дамавога камітэта і той камерцыйнай структуры, якая дастаўляла жыхарам нязручнасці. Пры гэтым я прапанавала ім шэраг узаемных саступак, якія ў задаволілі абодва бакі. Канфлікт быў вычарпаны. Тое ж было і са стаянкамі ў дварах жылых дамоў, і з мадэрнізацыяй старых жылых дамоў шляхам надбудовы. Звоздзіла бакі, выступала арбітрам, прапаноўвала ўласныя шляхі вырашэння праблемы.

Дэпутат падкрэслівае, што замест зафіксаванага заканадаўствам аднаго прыёму ў месяц, яна праводзіць пяць — гэта дазваляе «не зарастаць праблемамі» і прымаць рашэнні аператыўна. Вользе Абрамавай, між іншым, давялося дапамагаць і жыхарам іншых акруг.

— У 2004 годзе да мяне звярнуліся жыхары прылеглых да Севастопальскага парку вуліц, якія стварылі ініцыятыўную групу, каб абараніць тэрыторыю ад прэтэнзій камерцыйнай арганізацыі забудоўшчыкаў. Планавалася, што частка дрэў будзе знесена, а на іх месцы — узведзены жылыя дамы павышанай камфортнасці. Людзі даволі доўга спрабавалі самі вырашыць гэта пытанне. А потым звярнуліся да мяне, хоць я і была дэпутатам не іх акругі, а суседняй. Той дэпутат не ўключыўся ў абарону іх інтарэсаў, і меў на гэта поўнае права. Дэпутат не абавязаны працаваць у рэжыме пажарнай машыны, калі ён не лічыць пытанне важным і правамоцным. Ён даў згоду на тое, каб гэтым займалася я. Сумесна з жыхарамі мікрараёна мы паспяхова вырашылі пытанне. Будаўніцтва згорнута, не паспеўшы пачацца. Я тады звярталася асабіста да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта і атрымала неабходную падтрымку выканаўчай улады, паколькі Севастопальскі парк адносіцца да ландшафтна-рэкрэацыйнай зоны. Аднак дагэтуль людзі самі добра папрацавалі для абароны сваіх правоў.

Аднак праз два гады шматпакутны парк чакала яшчэ адна недарэчнасць. Мясцовым жыхарам стала вядома, што праз тэрыторыю любімай зоны адпачынку збіраюцца пракласці дарогу. І зноў звярнуліся да дэпутата. Вольга Абрамава тады была ўжо абраная менавіта ад гэтай, аб'яднаній з ранейшай, акругі.

— Мікраасяроддзе ўсяго раёна пацярпела б ад гэтага вельмі істотна — быў прадугледжаны знос зялёных насаджэнняў. Ну і, зразумела, якая ўжо тут зона адпачынку, побач з машынамі і іх выхлапамі. Як чалавек, экалагічна занепакоены, я поўнасцю падзяляла асцярогі выбаршчыкаў у гэтай сітуацыі і зрабіла неабходны запыт, — запэўнівае Вольга Абрамава. — Сёння пагрозы для парку няма.

Свае паўнамоцтвы, на думку дэпутата, парламент выкарыстоўвае поўнасцю, а вось кантрольных функцый недастаткова.

— Я заўсёды казала, што правы парламента варта пашыраць. Ёсць, як я кажу, элементы кантрольных функцый: практыка адказаў Урада падчас сумеснага пасяджэння абедзвюх палат, Пасланне Прэзідэнта, згода на прызначэнне некаторых службовых асобаў. Пры тым, што дэпутаты часта ставяць такія п

Фота Генадзя СЯМЁНАВА, БЕЛТА

ПЯМЁНАМІ выдатных дзеячаў Беларусі будуць названы паркі і плошчы ў гарадах Венесуэлы. Аб гэтым паведаміў кіраўнік дыпламатычнай місіі Венесуэлы ў Беларусі Амерыко Дыяс Нуньес на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця мемарыяльнай дошкі нацыянальнаму герою гэтай краіны Сімону Балівару ў мінскім скверы, які носіць імя венесуэльскага героя. Дыпламат назваў гэту падзею, якая адбылася ў час правядзення Дзён Венесуэлы ў Беларусі, асабліваым жэстам беларускага боку. Дні прымеркаваны да нацыянальнага свята Венесуэлы і ўпершыню праходзяць у Мінску. У бліжэйшы час у скверы плануецца ўстанавіць помнік Сымону Балівару. А дружба Мінска і Каракаса будзе падмацавана дакументам аб пабрацімскіх сувязях, які ў цяперашні час рыхтуецца да падпісання.

На здымку: у час цырымоніі адкрыцця мемарыяльнай дошкі. Міхаіл ЦІЦЯНКОЎ і Амерыко Дыяс НУНЬЕС.

Муз-news

Дэбют святочных «Катоў»

Малады гурт «Каты» толькі нядаўна заявіў аб сабе ў радыёэфіры прэм'ернай кампазіцыяй «Модная». А ў Дзень Незалежнасці адбылося і «баявое хрышчэнне» — выступленне ў вялікім канцэрце ў кампаніі зорак беларускай эстрады.

Маладыя артысты і раней бралі ўдзел у зборных канцэртах, у клубах часта працавалі, але на такім маштабным канцэрце былі заяўленыя ўпершыню. Таму, па агульным прызнанні, надзвычай хваляваліся. Адна справа — калі прыйшла падрыхтаваная аўдыторыя, якая ведае, што будзе слухаць. І зусім іншая — трапіць у праграму паміж імёнамі Іны Афанасьевай, Ісхуі Абалян, Ядзвігі Паплаўскай і Аляксандра Ціхановіча ды іншых. «Спадзяёмся, у нас атрымалася калі не запомніцца, то спадабацца публіцы», — перажываюць маладыя людзі.

Музыка з'ехала, артысты засталіся

Пераважная большасць артыстаў чакае дэбютнага альбома, як першынца — замілавана, клапатліва і трывожна, хоць, здавалася б, прадугледжаныя ўсе нюансы. Звычайна ўсё адбываецца па звыклым сцэнарыі — выпусцілі, прэзентавалі, аддалі ў продаж, падтрымалі канцэртамі. Але не ва ўсіх. Некаторыя выканаўцы і тут знаходзяць на сваю галаву прыгоды. Напрыклад, гурт «Разбітае сэрца дзецюка» свой першы альбом… згубіў.

Яшчэ летась увосень гурт цалкам скончыў запіс альбома ў студыі — засталося толькі выдаткаваць сродкі і выбраць кампанію, якая выдала б дыск. Хлопцы адправілі майстар-дыск у Расію, каб там надрукаваць тыраж. Але ў Маскве дыск выдаў памылку, і яго папросту выкінулі. Іншых якасных матрыц у гурта не было. Другі і апошні дыск з канчатковай версіяй альбома трапіў у Амерыку — таксама цалкам выпадкова. Адзін з музыкаў праводзіў туды сваю дзяўчыну, і чамусьці пакінуў дыск у яе багажы…

Цяпер музыкі спахапіліся, і ў хуткім часе запіс або бандэроллю, або праз Інтэрнэт будзе перададзены ў Мінск. Пакуль на прэзентацыя «Руковага захаду» — менавіта так называецца першы дыск гурта — пераносіцца на нявызначаны тэрмін. Выканаўцы, праўда, сцвярджаюць, што прыхільнікам давядзецца чакаць не больш як месяц.

Новы штуршок для жывых сэрцаў

Працягваецца дабрачынны музычны праект «Сэрца жыве», які мае на мэце збор грошай для перасадкі сэрца Мішу Ларыну. На мінулым тыдні на сайце serca.tut.by выклаў для бясплатнага скачвання свой хіт «Яна не будзе тваёй» Аляксей Хлястоў, цяпер з'явіўся дуэт "Без цябе" гурта "Крамбамбуля" і спявачкі Русі (гурт "Indiga").

Як паведамляюць ініцыятары праекта, цяпер на дабрачынным рахунку — толькі дзесятая частка неабходных сродкаў (а ўсяго патрэбна 350 тысяч еўра). Аднак Аляксей Хлястоў упэўнены, што сабрацъ усю суму цалкам рэальна, варта толькі аб'яднацъ намаганні. «Незалежна ад сацыяльнага статусу, перад хваробай мы ўсе роўныя. Мішу ўсяго 23 гады, і мне вельмі хочацца верыць, што самыя радасныя моманты ў яго жыцці яшчэ наперадзе, — разважае спявак. — У Беларусі жыве амаль 10 мільёнаў чалавек. Калі хоць бы дзесятая частка пералічыць на рахунак 50 цэнтаў, мы здолеем выратаваць Мішу жыццё».

Пералічыць грошы для Мішы вельмі проста — дастаткова зайсці ў любое аддзяленне «Беларусбанка», маючы пры сабе рэквізіты рахунку. Квітанцыю запаўняць не трэба, пашпарт таксама не патрэбны. Уся дадатковая інфармацыя пра Мішу Ларына і ход акцыі змяшчаецца на сайце serca.tut.by. Акцыя будзе доўжыцца ўсё лета, і кожны тыдзень вядомыя поп- і рок-музыканты будуць змяшчаць на сайце свае кампазіцыі для бясплатнага скачвання. Распрацоўваюцца таксама іншыя варыянты актывізацыі дабрачыннага праекта.

«Лекі ад меланхоліі» трапяць на Галапагосы

Лідар гурта Яўген Салдаценка ў кампаніі музыкаў з «Da Vinci» атрымаў сертыфікат па дайвінгу PADI. І цяпер гарыць жаданнем выпрабаваць атрыманыя веды на практыцы. У лістападзе артыст адправіцца ў складзе вялікай экспедыцыі на Галапагоскія выспы.

Паводле сертыфіката, Салдаценку дазволена самастойна апускацца ў мора ці акіян на глыбіню да 18 метраў. Але гэтага артысту здалося мала, і ў хуткім часе ён пяройдзе на наступную кваліфікацыйную прыступку, пасля чаго замацуе навыкі ў Ціхім акіяне. «Я ўвогуле многа падарожнічаю па свеце, — расказвае Яўген Салдаценка, — і з задавальненнем асвойваю новыя асяродкі. Няўжо гэта не цікава — даследаваць патанулыя караблі, знаходзіць скарбы? А раптам мы ўсё-ткі наткнёмся на Атлантыду?». Нашамрэч каманда дайвераў плануе вывучаць на Галапагосах — запаведніку, куды можна трапіць толькі па спецпрапусках — асабліваі мясцовай прыроды.

Акрамя навукова-даследчай працы, гурт «Лекі ад Меланхоліі» не забываецца на справы творчыя. У падтрымку альбома, выпушчанага нядаўна, вядуцца здымкі кліпа на песню «Асоль», рэжысёрам якога выступае Аляксандра Бутар.

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Прамая лінія

БЕЗ ЦЫРОЗУ І ГАСТРЫТУ, ЯЗВЫ І ПАНКРЭАТЫТУ

На пытанні чытачоў адказвае дацэнт 2-й кафедры ўнутраных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук Мікалай КАПРАЛАЎ.

(Працяг. Пачатак у нумарах за 5, 8 ліпеня.)

☎— Дзень добры! Турбуе Ала Іванаўна з Мінска. Дазвольце распытаць вас аб цырозе печані. Мая сяброўка памерла нядаўна ад гэтага захворвання, ёй было 58 гадоў… Цела, ногі нібы набрынялі вадой, але ў бальніцу яе класці не хацелі, блізкім нічога дакладна не патлумачылі… Вядома, што цыроз — сур'ёзнае захворванне, якое звязана з ўжываннем алкаголю, але пасля гібелі знаёмага чалавека засталося шмат пытанняў…

— У апошнія гады назіраецца істотны рост хваробаў печані, і ў першую чаргу, выпадкаў цырозу, што пагражае не толькі працаздольнасці, але і жыццю хворых. Літаральна за дзесяцігоддзе колькасць хворых на цыроз печані выраслa ў 1,5—2 разы. Прычына цырозу вядомая — празмернае ўжыванне алкаголю. Не сакрэт, што некаторымі міжнароднымі інстытутамі ўстаноўлены максімальна дапушчальныя нормы ўжывання алкаголю, або, як мы кажам, этанолу — спірту, і яны досыць малыя: для мужчын гэта 40-60 г, для жанчын — 20-30 г у суткі. Большая колькасць выклікае пашкоджанне пячонкавай тканкі, а ў далейшым — і яе гібель. У нашай краіне паказчыкі колькасці алкаголю, які ўжываюць насельніцтва, імклівa растуць, а значыць, расце і колькасць выпадкаў алкагольнага гепатыту, які папярэднічае цырозу, і ўласна цырозу. Падчас апошняга захворвання печань перараджаецца, замяшчаецца грубай, фібрознай тканкай, страчвае сваю функцыю. Дарэчы, клетка печані — унікальная, у здаровага чалавека ў ёй адбываецца звыш тысячы складаных хімічных рэакцый. Падчас цырозу клетка страчвае сувязь з сасудам, і печань губляе сваю функцыю. Захворванне праяўляецца, бадай, адным, даволі познім сімптомам — жаўтухай склер або яшчэ пазней — скуры. Толькі на гэтым этапе пацыент, як правіла, і звяртаецца да ўрача. На больш ранніх сімптомы — дыскамфорт у правым падрабрынні, зоне лакалізацыі пячоначнай тканкі, горыч у роце, парушэнне страваванння, схільнасць да расстройства кішэчніка, хворыя проста не звяртаюць увагі, яны праходзяць незаўважна для таго, хто злоўжывае алкаголем.

☎— Марына, Брэст. Скажыце, якім чынам перадаюцца гепатыты? Ці не з'явіліся яшчэ прышчэпкі ад іх?

— Апісана некалькі відаў гепатыту — A, B, C, Д, E, F, G. Заражэнне вірусам гепатыту А адбываецца, галоўным чынам, праз прадукты харчавання, і дарэчы, гэты від гепатыту сустракаецца цяпер радзей. Разам з тым гэта самы бяспечны вірус, пакольки такое захворванне заканчваецца звычайна выздараўленнем. А вось інфіцыраванне вірусам гепатыту В і асабліва С фарміруе хранічны працэс. Звыш 20 працэнтаў хворых на гепатыт С хварэюць на цыроз.

Так званая актыўная імунізацыя — прышчэпліванне, ажыццяўляецца сёння, на жаль, у дачыненні толькі да гепатыту В. Вакцына для папярэджвання пранікнення і развіцця ў арганізме віруса гепатыту С пакуль не распрацавана. А гэты вірус, як было заўважана, найбольш каварны. Яго яшчэ называюць «ласкавым забойцам», таму што за кароткі час ён прыводзіць да развіцця цырозу.

Гепатыты перадаюцца, напрыклад, палавым шляхам, асабліва вірус гепатыту В, радзей такім чынам перадаецца вірус гепатыту С, яго асноўны шлях перадачы — праз кроў. Тэарэтычна заражэнне магчымае нават у цырульні, аднак санітарна-гігіенічныя нормы цяпер досыць жорсткія. Што датычыцца медустаноў, то абсалютнай бяспекі ў гэтым сэнсе там няма, пакольки аднаразовым з'яўляецца далёка не ўвесь інструментарый. Дарэчы, мне давялося папрацаваць у час выкарыстання шматразовых шпрыцаў, і я павінен заўважыць, што гэта была прымітыўная сістэма «абароны», пакольки вірус гепатыту В гіне толькі пасля кіпячэння на працягу ад 45 хвілін да 1 гадзіны.

Большасць вірусаносьбітаў гепатытаў — гэта шпрыцавыя нарказалежныя. Важна яшчэ заўважыць, што колькасць інфіцыраваных гепатытамі ў нашай краіне высокая, але хварэюць далёка не ўсе яны: адзін з чатырох, калі гаварыць пра носьбітаў вірусу С. Праўда, вірус здольны пачаць імклівае размнажэнне ў любы момант. Гэта можа справакаваць і ўжыванне алкаголю, і пераахалоджванне, і стрэс. Вось у гэты востры перыяд чалавек найбольш небяспечны для навакольных, паколькі вірус можа выпучацца з любым біялагічным кампанентам — кроўю, слінай, слязамі, спермай, мачой.

— А сам інфіцыраваны ці хворы адчувае што-небудзь?

— Можа адчуваць пэўнае недаманганне.

— У нас можна выявіць захворванне на любой стадыі?

— Можна, з дапамогай сералагічнай маркёрнай дыягностыкі. Гэта вялікае дасягненне ў сусветнай практыцы. У нашай краіне яна таксама праводзіцца.

— А наколькі паспяхова лечацца гепатыты?

— У інфекцыйных клініках ёсць антывірусныя сучасныя прэпараты, якія здольны прыпыніць размнажэнне віруса, нівеліраваць яго паталагічнае ўздзеянне. Аднак поўны працэс вывядзення віруса з арганізма нават з іх дапамогай праблематычны.

☎— Аляксандр з Мінскага раёна непакоіць. У мяне часта бывае дыскамфорт у кішэчніку. Што б ні з'еў — жывот успушваецца. Як пазбавіцца непрыемных адчуванняў?



— Усе прадукты, якія вы ўжылі, рыхтуюцца ў арганізме да ўсмоктвання. Спрыяюць гэтаму спецыяльныя ферменты. Калі ў чалавека паўнацэннае ўтварэнне ферментаў, то, як правіла, усё адбываецца без газаўтварэння і бурчання. Каб парэкамендаваць вам штосьці канкрэтнае, неабходна дакладна ўстанавіць прычыну такога вашага стану — даследаваць функцыю падстраўнікавай залозы з дапамогай ультрагуку або лабараторнай дыягностыкі — біяхімічнага аналізу крыві. Важна даследаваць і капраграму, што вось ужо некалькі гадоў як выдалена з рэестра абавязковых даследаванняў і робіцца толькі па паказаннях. Падчас капраграмы даследуецца кроў, слёз, ператраўліванне клятчаткі і іншыя кампаненты. Непасрэдна лячэнне такіх станаў адбываецца з дапамогай адпаведных лекавых прэпаратаў — панкрэатыну, крыёну, якія варта прымаць падчас ежы.

— Скажыце, а па якой прычыне кажуць, што печань можа аднаўляцца?

— Гэта здольнасць — рэгенерацыі, вырастання да свайго ранейшага аб'ёму — праяўляецца пасля ранення, аперацыйнага ўмяшання. Печань рэгенеруе і падчас цырозу, але ў «няправільным», паталагічным выглядзе. І гэта вельмі небяспечна, пакольки орган разрастаецца проста да гіганцкіх памераў.

☎— Тамара Васільеўна, з Мінскага раёна непакою. У мужа была анкалогія, поўнасцю выдалілі страўнік. Цяпер у яго — пастаянная пякотка. Раней прымалі венілін, але ён знік з аптэчнай сеткі. Парэкамендуйце, калі ласка, чым яго замяніць.

— Страўнік, вядома ж, патрэбны чалавеку. У гэтым органе адбываецца першапачатковы працэс страваванння. Уявіце сабе, што гэта страваванне выпадае з працэсу перапрацоўкі ежы, і ўся яна са стрававода трапляе ў тонкі кішэчнік, дзе павінна быць гатовая да ўсмоктвання. Саляная кіслата, якая непакоіць людзей з гастрытам, язвай, выпрацоўваецца ў страўніку… А ў вашага мужа ідзе закід не салянай кіслаты ў стрававод, а жоўці з тонкай кішкі. Гэта не кіслы, а шчолачны рэфлюкс. Таму звычайныя прэпараты, якія перамагаюць пякотку, напрыклад, алмагель, будуць неэфектыўнымі. Мы павінны змагацца з самім закідам — рэфлюксам, накіраваць жоўць у тонкую кішку. У адваротным жа выпадку можа нават развіцца эзафагіт — запаленне стрававода. Вашаму мужу трэба прыстасёўвацца да той сітуацыі, у якой ён апынуўся. Харчавацца трэба дробнымі порцыямі і часцей. Ні ў якім разе не пераядаць. Што датычыцца прэпаратаў, то можна прыбегнуць да пракінетыкаў — метаклапраміду, мацііліуму, мозаксу. Любы з іх валодае добрым антырэфлюксным дзеяннем.

☎— Аліна, Старыя Дарогі. Мне зрабілі фібрагастраскапію. Выявілі дэфармаваную лукавіцу 12-перснай кішкі з канвергенцыяй складак. Ці можна ў вас пракансультавацца?

— Распрабуйце ўзяць па месцы жыхарства накіраванне ў 9-ю клінічную бальніцу, гастраэнтэралагічнае аддзяленне.

☎— Калінкавічы на провадзе, Валянціна. Дыягназ — постхалецыстэктамічны сіндром, хранічны біліярны панкрэатыт са знешнесакраторнай недастатковасцю, рэфлюксная хвароба з дыярэяй. Пастаянна пакутую ад апошняй. Прымаю крыён-25 тройчы ў дзень падчас яды. Без прэпарата — не магу. Як доўга яго трэба прымаць?

— Такая хвароба нярэдка ўзнікае пасля выдалення жоўцевага пухіра, калі ўзнікае так званы постхалецыстэктамічны сіндром, калі парушаны пасаж натуральнай жоўці. Ранняе выдаленне жоўцевага пухіра дазваляе пазбегнуць горшых ускладненняў. Але развілася рэфлюксная хвароба і вышэйпамянёны сіндром, бо жоўць аддзяляецца цяпер няроўнымі порцыямі і закідваецца пры гэтым у стрававод, дасягае ротавай паласці. Але ёсць пэўныя рэгулятары для паляпшэння аддзялення жоўці, напрыклад, адэстон — па 1 таблетцы на працягу 2—4 тыдняў у залежнасці ад самаадчування. Патрэбны і антырэфлюксны прэпарат. Я параіў бы матыліўм. Яго эфектыўнасць вышэйшая ў параўнанні з метаклапрамідам. Таксама варта прымаць з месяц. З улікам дыярэі, высокай нагрузкі, абумоўленай ужываннем медпрэпаратаў, варта паспрабаваць аднавіць кішэчную мікрафлору, напрыклад, лінэксам — біяпрэпаратам, які можна прымаць таксама на працягу месяца. Мяркую, што гэта дасць свой станоўчы эфект. Надзвычай важная пры гэтым дыета — харчавацца трэба дробнымі порцыямі. У вашым рацыёне не павінна быць тлушчу, інакш жоўць актыўна будзе закідвацца ў стрававод. І ежа не павінна быць сакагоннай — выдаліце з рацыёну вострае, салёнае. Пазбягайце і цэльных малочных прадуктаў, ужывайце толькі кісламалочныя.

«Прамую лінію» рыхтавалі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.

(Працяг будзе.)

ДВУМ БАНКАМ ПРЫПЫНЕНЫ ЛІЦЭНЗІІ

ААТ «Міжнародны рэзервовы банк» на новы тэрмін (з 1 ліпеня 2008 года да 1 ліпеня 2009-га) і ЗАТ «Дэльта Банк» яшчэ на год (з 1 ліпеня 2008-га па 30 чэрвеня 2009 года ўключна) прыпынена дзеянне ліцэнзій на банкаўскія аперацыі па прыцягненні грашовых сродкаў фізічных асобаў ва ўклады (дэпазіты), а таксама на адкрыццё і вядзенне банкаўскіх рахункаў фізічных асобаў, паведаміў прэс-сакратар галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч.

Ігар ГРЫШЫН.

«Няхай даруюць за праўду»

У свет выйшла кніга, якая распавядае пра падзеі афганскай вайны вачыма яе ўдзельніка. Аўтар Уладзімір Гаркавы, былы супрацоўнік Камітэта дзяржаўнай бяспекі БССР, назваў яе «Афганістан: без грыфа «сакрэтна». Дакументальна-мастацкі твор выдадзены РУП «Міжнародны цэнтр інтэграцыйнай інфармацыі. Грамадскі прэс-цэнтр Дома прэсы».

«Даўно вырашыў расказаць аб тым, што ж на самай справе адбывалася ў Афганістане, паказаць, як цяжка было выжыць нашаму салдату на той, ужо многімі забытай, вайне… Іх дасюль яшчэ аплакваюць. Бацькі, матулі, былыя нявесты». Уладзімір Гаркавы правёў на той вайне чатыры гады, займаўся падрыхтоўкай разведвальных даных для рэзідэнтуры КДБ СССР, потым працаваў дарадцам. Норавы маджахедаў, гісторыя далёкай краіны і побыт яе народа, становішча савецкіх салдатаў, якія знаходзіліся ў палоне, прозвішчы удзельнікаў афганскай кампаніі, лёсы якіх і да сёння невядомыя — загінулі яны, ці (было і такое) перайшлі ваяваць на бок талібаў… Аб гэтым распавядае Уладзімір Гаркавы. Часам ён зусім не шкадуе чытачоў, апісваючы падзеі. Піша праўдзіва, так, як і было на самай справе. Гэтым кніга і каштоўная. Факты аб дзейнасці спецыяльных падраздзяленняў Камітэта дзяржаўнай бяспекі СССР на тэрыторыі Афганістана, якія апісаны ў кнізе, былі доўгі час засакрэчаныя.

«Я спадзяюся, што кніга нікому не прынясе таго болю, які адчувалі мы. Няхай мне даруюць за праўду, але інакш я не мог», — сказаў на прэзентацыі свайго твора Уладзімір Гаркавы.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

ЛІХТАРЫ «ПРЫЗЯМЛІЛІСЯ» Ў АКЦЯБРСКІМ

Фота Яўгена ПРАСЕЦКАГА.

Куды знікаюць электрычныя ліхтары, якія адслужылі свой час? Гаспадарлівы чалавек здасць іх, як металалом. А калі гаспадар да таго ж яшчэ вынаходлівы — непатрэбнае жалеза ператворыцца ў нешта новае, ізноў карыснае.

Пацвярджэннем гэтаму — фотаздымак, зроблены на вуліцы гарадскога пасёлка Акцябрскі. Белыя лебедзі (у мінулым ліхтары) «прызямліліся» на пешаходнай зоне і сталі прыкладам таго, як можна танна і па-мастацку ўпрыгожваць свой кут.

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении повторного открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – Верхнедвинский районный исполнительный комитет

Месторасположение земельного участка, кадастровый номер участка, арендодатель	Ограничения в использовании участка	Площадь земельного участка, га	Срок аренды, лет	Назначение участка	Условия продажи	Начальная цена объекта, руб. / сумма задатка, руб.
г. Верхнедвинск, ул. Ленинградская в районе магазина «Князёўна», кадастровый номер 221005010000101905 Арендодатель – Верхнедвинский районный исполнительный комитет	на площадь 0,0060 га — водоохранная зона водного объекта (река Западная Двина) вне прибрежных полос	0,0060	5	для размещения объекта розничной торговли	осуществление в 2-х месячный срок после принятия решения райисполкома о передаче в аренду земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; в течение 6 месяцев со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию участка в соответствии с целью его предоставления.	58415 / 5800

1. Аукцион состоится 18 июля 2008 г. в 15 часов в здании Верхнедвинского райисполкома по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1 (малый зал заседаний).

2. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица всех форм собственности, индивидуальные предприниматели и граждане. Участнику необходимо подать заявление и подписать установленной формы соглашение с Верхнедвинским райисполкомом.

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; **гражданином представляются** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о госрегистрации индивидуального предпринимателя; **представителем гражданина (индивидуального предпринимателя)** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем (уполномоченным должностным лицом) юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о госрегистрации юридического лица, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем (уполномоченным должностным лицом) иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком (иной кредитно-финансовой организацией), с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык. А также предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 14 июля 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1, кабинет 22. Заключительная регистрация участников 18 июля 2008 г. с 14.00 до 14.45 по тому же адресу. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Сумма задатка перечисляется на р/счет 3602313001039 в ф. 206 АСБ «Беларусбанк» г. Верхнедвинска, МФО 638. Получатель – финансовый отдел Верхнедвинского райисполкома. УНП 300062641. Назначение платежа 04002.

5. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

6. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: **подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка в сумме 196 тыс. рублей, а также затраты на подготовку и проведение аукциона (включая расходы на опубликование настоящего извещения в средствах массовой информации), внести плату за право заключения договора аренды земельного участка; не позднее 12 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка заключить с арендодателем договор аренды земельного участка.**

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

8. Контактный телефон в Верхнедвинске: 8 (02151) 5 23 05.

УНП 300063038

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

РАШЫ ДЛЯ ДУШЫ

Марыя Лічко — майстар спорту, чэмпіёнка Беларусі 1998 года. У якасці задання № 4 бліцконкурсу-39 яна прапануе чытачам адвесці душу на наступным прыкладзе з партыі першынства Мінскай вобласці па перапісцы:



БЕЛЫЯ (Высоцкі): b2, c1, c5, d2, d4, e1, f2, g1, h2, h4 (10). ЧОРНЫЯ (Лічко): a7, b6, c7, d8, e7, f6, g5, g7, h6, h8 (10). Ход і выйгрыш чорных.

Пераможцаў конкурсу чакаюць сюрпрызы ад нашага шчодрага чытача Анатоля Пярхальскага (Глыбокае) — яго зборнікі звяздоўскай шашачнай рубрыкі №№ 3—5 за 2005—2007 гады ў добрым афармленні мясцовага «ФОТАцэнтра». Свае адказы накіроўвайце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

Марыя Яўгенаўна Лічко жыве ў вёсцы Возера Уздзенскага раёна і працуе настаўнікам фізічнай культуры ў сельскай школе. Яна і яе вучні Яўген Казлоў, Анжэліка Кашкан, Джон Мамедаў, Аляксей і Аляксандр Яраховічы ўдзельнічаюць у нашых бліц-конкурсах. Паза конкурсам разгледзьце і такія моманты з партый:

№ 1. БЕЛЫЯ (Лічко): a1, a3, a5, c1, c3, d2, d4, e3, f4, h2, h4 (11). ЧОРНЫЯ (Высоцкі): a7, b6, b8, c5, c7, d6, f6, f8, g5, h6, h8 (11). Чорныя вымушаны былі пайсці 1. ... fe5, на што белыя адрэагавалі 2. d:f6! 3. ed4 4. h:d8x.

№ 2. БЕЛЫЯ (М. Лічко): e3, g3, h4 (3). ЧОРНЫЯ (майстар спорту Украіны А. Навумава): d6, f6, h6 (3). Чэмпіянат СССР 1980 года, г. Омск: у пазіцыйным сэнсе ў чорных становішча некалькі лепшае, але ўсё ж такі ў белых ёсць рэсурсы для раўнавагі. Пашукайце за іх нічыю самастойна. Таксама будзем рады вашай знаходлівасці.

КЛУБ ШКЛУДАВА

Як вядома, у футболе існаваў сімвалічны «Клуб Фядотава». Яго членамі з'яўляліся тыя нападаючыя, якія здолелі ў чэмпіянатах СССР забіць больш за 100 галоў. У іх лік уваходзіў і мінскі тандэм Эдуард Малафееў — Міхаіл Мустыгін і інш. Наш жа чытач з Пінска Аляксандр Кагоцька на аналогіі пачаў падлічваць заліковыя акі, якія атрымалі шашачныя кампазітары ў першынствах Беларусі, пачынаючы з першага (1976 г.). І вось што ў яго атрымалася на прыкладзе самага папулярнага раздзела камбінацыйных праблем-64. Аказваецца, рубеж у 100 ачкоў першым узяў яшчэ ў 1989 годзе майстар з Наваполацка Пётр Шклудаў. Таму і заслужыў, каб падобны клуб атрымаў яго імя. Акрамя таго, ён і сёння пасля 14-га першынства ўзначальвае спіс лепшых праблемістаў рэспублікі ў гэтым жанры, набраўшы ўжо не 100, а 257,75 ачка (!). Далей рэйтынгліст з 1976 па 2007 гады выглядае так: майстры з Мінска Іван Наўроцкі (245,75), Барыс Іваноў (217,25), Віктар Шульга (162,5), майстры Аляксандр Сапегін з Мсціслаўскага раёна (154), вядучы звяздоўскай рубрыкі «Шашкі» Мікалай Грушэўскі (143,5), Дзмітрый Камчыцкі з Магілёва (127), сам А. Кагоцька (122), гросмайстар СССР Леанід Вітошкін з Гомеля (117,5) і майстар Аляксандр Ляхоўскі з Жодзіна (109,5). Прэтэндуюць стаць членамі «Клуба Шклудава» М. Вяргейчык (82), А. Акуліч (70,25), В. Грабенка (69), Р. Краўцоў (63,25), П. Кажаноўскі і В. Свізінскі (па 62,5), У. Малашэнка (59,25), Д. Сухарукаў (54), Г. Горбач (53), А. Перавознікаў (52,75), а ўсяго — 76 складальнікаў.

Архіварыус А. Кагоцька зараз працягвае працу над раздзелам эцюдаў. Тут Л. Вітошкін у сваім любімым відзе кампазіцыі з'яўляецца безумоўным лідарам. Хутка мы даведаемся, хто ж стане членам яго клуба.

ШЭДЭЎРЫ СУАЙЧЫННІКАЎ

Як мы абяцалі, заканчваем публікацыю шэдэўраў на 100-клетачнай дошцы беларускіх аўтараў, якія міжнародныя гросмайстры расіяне Барыс Шкіткін, Уладзімір Матус і ўкраінец Сяргей Юшкевіч уключылі ў сваю кнігу «Мир миниатюр» (Харьков, «Фолио», 1994):

№ 1 (А. Ляхоўскі). БЕЛЫЯ: 13, 15, 18, 23, 24, 36, 43 (7). ЧОРНЫЯ: 7, 17, 20, 21, 22, 27, 33 (7).
9, 31, 2 (10, 38, 49) 35x.

№ 2 (Уладзімір Малашэнка, Ліда). БЕЛЫЯ: 28, 33, 35, 36, 38, 43, 47 (7). ЧОРНЫЯ: 1, 9, 11, 19, 21, 24, 30 (7).
29 (42) 4 (48) 27!, 7, 42x.

№ 3 (Юрый Марквардэ, Мінск). БЕЛЫЯ: 22, 24, 33, 37, 41, 42, 44 (7). ЧОРНЫЯ: 7, 11, 12, 13, 16, 34, 38 (7).
19, 6 (11, 21, 39) 18 (50) 31, 27, 37x.

№ 4 (наш зямляк Міхаіл Цветаў, зараз жыве ў Ізраілі). БЕЛЫЯ: 11, 16, 17, 25, 39, 41, 42 (7). ЧОРНЫЯ: 1, 2, 19, 22, 23, 28, 36 (7).
7 (38) 33, 29, 24, 32x.

№ 5 (Леанід Чарноў, Мінск). БЕЛЫЯ: 7, 16, 33, 39, 41, 48 (6). ЧОРНЫЯ: 8, 11, 24, 25, 31, 35 (6).
1 (36) 7, 2, 30, 40!, 50x.

№ 6 (П. Шклудаў). БЕЛЫЯ: 11, 17, 21, 34, 36, 42, 43 (7). ЧОРНЫЯ: 1, 13, 18, 23, 24, 25, 39 (7).
29, 20, 31, 7, 10x.



№ 7 (В. Шульга). БЕЛЫЯ: 9, 11, 14, 19, 22, 28, 31 (7). ЧОРНЫЯ: 5, 6, 17, 29, 33, 39, 42 (7).
10, 3, 27 (17 A) 23 (19 B) 29x. A (21) 32, 43x. B (21) 16 (39) 49x.

Рэгіён

Не Давос — Ліда!

На думку некаторых удзельнікаў Міжнароднага эканамічнага форуму, які адбыўся ў рамках Дзён эканомікі Лідскага рэгіёна і IV прэзентацыі-выстаўкі «Ліда-рэгіён-2008», у будучыні гэты форум можа стаць «беларускім Давосам». І не нейкай яго копіяй, а са сваёй спецыфікай: устойлівае эканамічнае развіццё асобных тэрыторый. Менавіта Лідчына і паказвае прыклад таго, якіх вынікаў можна дасягнуць дзякуючы эфектыўнаму выкарыстанню свайго патэнцыялу і дзелавому партнёрству з іншымі беларускімі і замежнымі рэгіёнамі.

— Менавіта ў сярэдніх гарадах ёсць рэзервы, якія трэба задзейнічаць, — лічыць намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Леанід Анфімаў. — Цэлы шэраг дастойных прадпрыемстваў прадставілі сваю прадукцыю і тут, на выстаўцы «Ліда-рэгіён-2008». Столькі ідэй, навінак і жадання наладжваць супрацоўніцтва...

І сапраўды, інтарэс да Дзён эканомікі Лідскага рэгіёна ўзрастае з кожным годам. Сёлета сярод удзельнікаў і гасцей — прадстаўнікі 26 краін, каля 70 прадпрыемстваў, 17 пасольстваў, 11 паслоў. Толькі ў дэлегацыі дзелавых колаў Германіі налічвалася каля 40 чалавек з 13 прадпрыемстваў, якія ўдзельнічалі не толькі ў пленарнай сесіі эканамічнага форуму, але і ў кантактна-каапэрацыйнай біржы разам са сваімі патэнцыяльнымі партнёрамі па бізнэсу з Беларусі.

— Ужо ў чацвёрты раз у нашым горадзе праводзіцца прэзентацыя-выстаўка «Ліда-рэгіён» і ў другі — Міжнародны эканамічны форум, прысвечаны ўстойліваму развіццю асобных тэрыторый, — гаворыць старшыня Лідскага райвыканкама Андрэй Худык. — У 2005 годзе, каб наглядна ўявіць магчымасці будучага сектара эканомікі, мы выбралі такі дзелавы спосаб кантактаў дзяржаўных дзеячаў, палітыкаў, бізнэсменаў, вучоных, як выстаўка прамысловай прадукцыі. Час паказаў, што мэты былі пастаўлены правільна.

Назапашаны станоўчы вопыт дапамог лідчанам стварыць магчымасці для арганізацыі сумесных прадпрыемстваў, развіцця малога і сярэдняга бізнэсу, шырокага ўкаранення навуковых дасягненняў, прыцягнення замежных інвестыцый у мясцовую вытворчасць. Аб дынамічным развіцці раёна сведчыць той факт, што за чатыры гады экспартны патэнцыял павялічыўся амаль удвая. У гэтым годзе экспарт «плюсуе» на 29 працэнтаў. Геаграфія знешняга гандлю — гэта больш чым 40 краін. На тэрыторыі раёна паспяхова працуюць каля 50 прадпрыемстваў з замежным капіталам самага рознага профілю дзейнасці — ад хлебапячэння да вытворчасці складанай апаратуры і аптычных прыбораў. Асноўнымі гандлёва-эканамічнымі партнёрамі Лідскага рэгіёна з'яўляюцца Расія, Украіна, Германія, Літва, Польшча, Казахстан, Малдова, Францыя, Азербайджан і іншыя. Асабліва цесныя эканамічныя адносіны склаліся ў лідчан з г. Нёман Калінінградскай вобласці, Геакчайскім раёнам Азербайджана, Харошава-Мнеўніцкім раёнам Масквы, рэгіёнамі Літвы.

— Двухбаковыя кантакты паміж дзяржавамі, інвестыцыйнае супрацоўніцтва будуць прырастаць менавіта рэгіёнамі. І Ліда з'яўляецца адным з яскравых прыкладаў таго, як гэта трэба рабіць. Толькі за мінулы год капітал, які прыйшоў з Літвы, дазволіў стварыць у Лідзе каля 200 рабочых месцаў, дзе сёння актыўна вырабляецца прадукцыя з пастаўкай на экспарт у краіны Еўрапейскага Саюза. Лідчане інтэнсіўна развіваюць супрацоўніцтва з Вільнюсам, Алітусам, Шальчынінкаем, Друскінінкаем, — падкрэсліла намеснік кіраўніка раёна Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Літве Уладзімір Дражын.

У мінулым годзе ў эканоміку Лідскага раёна прыцягнута больш за 145 мільёнаў долараў інвестыцый.

— Замежныя інвестары стабільна адчуваюць сябе ў раёне і зацікаўлены ў далейшым развіцці бізнэсу на нашай тэрыторыі, — адзначае намеснік старшыні Лідскага райвыканкама Іван Клімовіч.

У гэтым ёсць заслуга і дзяржавы (у прыватнасці, згодна з беларускім заканадаўствам, статутны фонд фірмы, што фарміруецца замежным інвестарам, не падлягае падаткаабкладанню), і, безумоўна, мясцовай улады, якая аказвае дзейсную падтрымку ў размяшчэнні новых вытворчасцяў. Першае — для вас падбяруць памяшканне альбо будынак (для гэтага створаны каталог размешчаных на тэрыторыі раёна свабодных вытворчых плошчаў, а за інвестарам выбар — арэнда альбо пакупка нерухомасці). І другое — выдзеляць зямлю пад новае будаўніцтва, выходзячы з вашых інтарэсаў. Пры гэтым трэба ўлічваць і такія плюсы Лідчыны, як выгаднае геаграфічнае становішча, развітая сістэма транспартных камунікацый, вытворчая інфраструктура, значныя зямельныя і лясныя рэсурсы, сучасны ўзровень банкаўскай сферы, у тым ліку з удзелам замежнага капіталу, наяўнасць добрай базы для падрыхтоўкі маладых спецыялістаў (чатыры прафесійна-тэхнічныя вучылішчы і каледж — філіял Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы).

На сёння Лідчына рэалізуе каля дзесятка інвестыцыйных праектаў. Сярод прапаноў інвестарам — будаўніцтва завода па вытворчасці легкавых аўтамабіляў, арганізацыя вырабу спажывецкіх тавараў з ільновалакна, стварэнне домабудаўнічага прадпрыемства з высокатэхналагічнай вытворчасцю будматэрыялаў. Рэгіён таксама зацікаўлены ў рэалізацыі сумесных праектаў па выкарыстанні мясцовых відаў паліва і аднаўляльных крыніц энергіі, развіцці агратурызму, гатовы разгледзець і аказаць падтрымку прапановам па будаўніцтве аб'ектаў сэрвіснага абслугоўвання аўтамабіляў вядомых сусветных вытворцаў, аквапарка, новай гасцініцы. На парадку дня і арганізацыя на тэрыторыі раёна свабоднай эканамічнай зоны, а таксама будаўніцтва ў Лідзе бізнэс-цэнтра.

...Міжнародны эканамічны форум, які прайшоў у Лідзе, сабраў прадстаўнікоў дзелавых колаў, бізнэс-асацыяцый і навукоўцаў з Беларусі, Літвы, Расіі, Германіі, Італіі... У сваіх рэкамендацыях удзельнікі форуму выказаліся, у прыватнасці, за актывізацыю супрацоўніцтва парламентаў, урадаў і дзелавога супольніцтва ў мэтах міжнароднага абмену вопытам і практыкай распрацоўкі Нацыянальных стратэгій устойлівага развіцця. Прызнана мэтагодным штогадовае правядзенне ў Лідзе Міжнароднага эканамічнага форуму, прысвечанага гэтай праблематыцы. Хто ведае, магчыма, у не надта далёкай будучыні ён і сапраўды не будзе саступаць па папулярнасці эканамічным форумам у Санкт-Пецярбургу ці Давосе.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Стэнд ААТ шклозавод «Нёман», г. Бярозаўка.

Фота БЕЛТА.

«БАЗАР» ПРОЙДЗЕ СПАКОЙНА

«Удзельнікам і гасцям міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», які распачынаецца на днях, баяцца разгулу крыміналу не варта, — заявіў начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама Леанід Фармагей. — Што датычыцца магчымасці паўтарэння «мінскай гісторыі», калі адбыўся выбух самаробнага выбуховага рэчыва, ужо прымаюцца і будуць прыняты ўсе неабходныя меры, каб нічога такога не адбылося».

— За доўгія гады правядзення фестывалю мы маем добры вопыт аховы гэтага масавага свята, — расказвае палкоўнік Фармагей. — Яшчэ да «мінскай гісторыі» з нашай падачы былі надрукаваны спецыяльныя памяткі, дзе апісваюцца неабходныя дзеянні грамадзян пры выяўленні падазроных прадметаў і ўзнікненні выбуху. Яны будуць раздавацца гасцям «базару» і не толькі. Перад пачаткам масавых мерапрыемстваў адпаведныя тэрыторыі будуць вывучацца супрацоўнікамі сапёрна-піратэхнічных груп. Сабакі, натрэніраваныя на пошук выбуховых рэчываў, у складзе патрулёў будуць нашымі памочнікамі ў гэтай справе. Пры ўваходзе ў Летні амфітэатр, як і ў мінулым годзе, устаноўлены спецыяльныя рамкі для выяўлення металічных прадметаў. Акрамя гэтага ў супрацоўнікаў міліцыі будуць ручныя «металашукальнікі». Больш за тое, 50 відэакамер кругласутачна будуць фіксаваць усё, што адбываецца ў месцах масавага знаходжання людзей. І камеры на міліцэйскіх аўто, якія нічым не адрозніваюцца ад грамадзянскіх, будуць таксама працаваць...

Усяго ахову грамадскага парадку падчас правядзення фестывалю будуць забяспечваць больш за 1,3 тысячы супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, у тым ліку непасрэдна амфітэатра — каля 300, плюс 30 самых лепшых дружыннікаў Віцебска.

Як запэўнілі кіраўнікі УУС, пры гэтым на ўскраінах і «спальных раёнах» колькасць патрульных не зменшыцца. А ўсё таму, што віцебскім міліцыянерам дапамагаюць сачыць за парадкам у фестывальныя дні прыезджыя калегі. У іх складзе і прадстаўнікі ўнутраных войскаў.

— Упершыню мы запланавалі правесці «Дзень здароўя» на фестывалі, — адзначыў палкоўнік Фармагей. — Наша ініцыятыва ўжо атрымала вядомасць, як «Дзень цвярозасці»...

Каб знізіць верагоднасць стаць ахвярай злачынстваў пасля завяршэння канцэртаў, спецыяльныя калоны аўтобусаў і тралейбусаў будуць развозіць грамадзян па накірунках грамадскага транспарту.

Летась ніхто з удзельнікаў «базару» не стаў ахвярай злачынных дзеянняў. І самі «базарныя людзі», як адзначылі ва УУС, не ўступалі ў канфлікт з законам. Што датычыцца «зорак» мастацтваў першай велічыні, то і яны не сталі выключэннем. Дарэчы, умовы іх аховы абмяркоўваюцца з прадзюсарамі, дырэктарамі, начальнікамі асабістых службаў бяспекі. Непасрэдна з боку беларускай міліцыі з імі працуюць супрацоўнікі віцебскай спецыяльнай роты хуткага рэагавання.

Ёсць упэўненасць, што і сёлета «базар» пройдзе без непрыемных сюрпрызаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Ивенецкий поселковый исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 3 (трех) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

Лот 1 — земельный участок № 5 в г.п. Ивенец, ул. Ивенецкая, площадь участка 0,1622 га, начальная стоимость 2 027 500 белорусских рублей; **Лот 2** — земельный участок № 7 в г.п. Ивенец, ул. Ивенецкая, площадь участка 0,1622 га, начальная стоимость 2 027 500 белорусских рублей; **Лот 3** — земельный участок № 8 в г.п. Ивенец, ул. Ивенецкая, площадь участка 0,1520 га, начальная стоимость 1 900 000.

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома. Имеется в непосредственной близости газ и центральное водоснабжение. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3600614020009 в филиале № 605 МОУ «АСБ Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, назначение платежа 04901 УНП 600037277, ОКПО 04432328 Ивенецкий поселковый исполнительный комитет. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня получения протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 15 августа 2008 г. в 15.00 по адресу: г.п. Ивенец, пл. Свободы, 2, 2-й этаж, зал заседаний.** Заявления на участки и необходимые документы принимаются до 17.00 22 июля 2008 г. по адресу: г.п. Ивенец, пл. Свободы, 2, кабинет секретаря.

Контактные телефоны: 801772 53367, 53587.

УНП 600037277.

Зачапіла

ХТО БЫЎ НІЧЫМ — НІЧЫМ І ЗАСТАЕЦЦА?

У кожнага чалавека ёсць пачуццё годнасці, але ў аднаго яно за ўсё жыццё можа і не праявіцца, а ў другога выліваецца ў амбіцыі і нічога тут зрабіць нельга.

Сёння з нашага лексікону пачало знікаць слова «калгаснік», а мы памятаем, што яго часта выкарыстоўвалі, каб абразіць чалавека. Гэта было звязана з тым, што ў тыя часы вясковы жыхар знаходзіўся на самай нізкай сацыяльнай сходцы. І насамрэч селянін у тагачасным калгасе быў бясправ'ем — ён поўнасцю залежаў ад старшыні калгаса ці нават брыгадзіра.

І тым не меней пачуццё годнасці было і ў калгасніка, хоць праяўлялася яно даволі рэдка. Цяжка было запярэчыць начальніку, адстаяць праўду, бо ведаў, якія наступствы могуць быць для яго сям'і. А так хацелася быць чалавекам...

Перад смерцю адзін нямоглы папрасіў, каб на яго памінках на сталах стаяла толькі купленая гарэлка. «Што я, не заслужыў? — нясхай людзі выпʼюць», — заявіў дзед. Цягнуў усё жыццё лямку, жонка на яго крычала, дзеці выраслі неслухамі, а вось хоча чалавек, каб хоць за памінальным сталом пра яго добрае слова сказалі.

А іншы імкнецца аб сабе заявіць пры любым выпадку, хоць сам і ні на што не здольны.

Як паказваюць міліцэйскія зводкі, сумесныя п'янкі, а затым скандалы і бойкі звязаны не толькі з гарэлкай. Алкаголь, безумоўна, падштурхоўвае да агрэсіўных дзеянняў, але канфлікты, як правіла, разгараюцца з-за таго, што нехта пачынае «качаць правы», даказваць, што ён не басяк і выпівоха, а «імя адушаўлёнае».

Гарэлка дапамагае часта адчуць сябе асобай, а працверазіцца чалавек, і становіцца цікім і непрыкметным.

Аднойчы мне давялося чатыры гадзіны праехаць у аўтамашыне, у якой акрамя вадзіцеля знаходзіўся яшчэ адзін пасажыр — ехалі па справе. За гэты час ад пасажыра ніводнага слова не пачулі. Затым вярталіся назад, і толькі калі спыніліся перакусіць і зрабілі па чарцы, мужчына ажыў і пачаў гаварыць, гаварыць...

У прыродзе існуе адсеў (адбор) і самыя слабыя ў жывёльным свеце гінуць. І ў кожным грамадстве ёсць пэўны працэнт людзей, непрыстасаваных да жыцця, да барацьбы за выжыванне, але яны нікуды не знікаюць, а жывуць сярод нас і часта не згодныя са сваім становішчам у грамадстве і прэтэндуюць на большае.

Сумнавядомы кліч «хто быў нічым, той стане ўсім» нарабіў бяды. Успомнім, што ў тыя часы «адсеў» аказаўся запатрабаваным. Вось чалавек быў самым апошнім у вёсцы, нават каня не меў, а апынуўся за сталом, у прэзідыуме, як і той парабак, які ўжо атрымаў права асудзіць, зганьбаваць свайго гаспадара.

Новая ўлада на пэўным этапе гэтых людзей выкарыстала, і яны сталі непатрэбнымі, бо нават брыгадзір у калгасе павінен умець чытаць і пісаць. Ды і кіраўнікамі гаспадарак і прадпрыемстваў станавіліся людзі больш адукаваныя.

Але ўсё гэта было даўнавата, а сёння, здавалася б, у нас хапае кадраў, каб узначальваць тыя ж сельгаскааператывы, установы, аддзелы...

Пры сустрэчы адзін кіраўнік раёна паскардзіўся: «Вунь дзве вакантныя пасады старшынь СВК, а няма каго ставіць».

— Няўжо ва ўсім сельгаскааператыве няма чалавека, які хацеў бы пакіраваць гаспадаркай?

— Такія ёсць, але што з іх толку. Заатэхнік не супраць, ды які сэнс яго прызначаць, калі ён не ведае, колькі кароў на ферме і чым іх кормяць. Вось старшынёй сельскага Савета паставілі маладога. Педагог, думалася, справіцца, а ён у касцюмчыку прыходзіць на працу і сядзіць у кабінеце. Хоць справа не ў касцюме, а ў крапіве, якая расце каля плота насупраць сельскага Савета. «А што, я павінен яе касіць?» — кажа. А чаму б і не махнуць касой? Вярнулі з пенсіі былога старшыню, і той хутка навёў парадак, — выказаў сваю пазіцыю старшыня райвыканкама.

Сёння ў нашым грамадстве з'явілася цэлая праслойка людзей, якія аказаліся за «бортам», як правіла, гэта беспрацоўныя.

— Няма работы, — галоўнае іх апраўданне, але ў беспрацоўныя яны трапілі найперш з прычыны, што не прыстасаваліся да гэтага жыцця, у якім перамагаюць больш здольныя і дзелавыя.

І трэба адзначыць, што ў гэтай праслойцы найбольш людзей, якія асабліва да работы не рвуцца, аматары выпіўкі, без спецыяльнасці. Толькі ніхто з іх ва ўсім гэтым сваёй віны не бачыць і сваё «я» трымае высока. А тое, што ён апынуўся ў такім становішчы — вінаваты начальнік з апошняга месца работы, акружэнне, улада...

І тут да слова.

Сёння кожны мастак выжывае як можа. Многія не здолелі выстаяць і, маючы за спінай мастацкі інстытут, сталі бамжамі — спіліся. А добра знаёмы мне мастак у адной арганізацыі стварае музей, у другой афармляе нейкую аўдыторыю, не грэбуе планшэтамі і не творчай працай, выстаўляе на продаж пейзажы і яшчэ некалькі гадзін мае ў сярэдняй школе. Гэта — прыклад выжывання. Дарэчы, у чалавека сёлета дзве дачкі закончылі ўніверсітэты.

Але ж і беспрацоўны беспрацоўнаму розніца. Вярнуўшыся да тых жа міліцэйскіх зводак, адзначаеш, што пераважная большасць правапарушэнняў на рахунку беспрацоўных. Толькі якая і тут разбежка!

Адны п'юць гарэлку, скандаляць і б'юцца, а другія едуць на заробкі, перавозяць нейкі тавар, гандлююць. Часта ў гэтай групы беспрацоўных тавар канфіскуюць, бо няма адпаведных дакументаў, але нягледзячы на такія процізаконныя дзеянні, гэтыя людзі не будуць ірваць на грудзях кашулю і крыўдаваць на ўвесь свет — яны стараюцца выжыць.

І калі ў горадзе такое расслабленне не так прыкметнае, то ў вёсцы ўсе людзі навідавоку. І там «дэкласаваны элемент» асабліва добра бачны. Сумна, што выправіць сітуацыю амаль немагчыма. Часта ў бацькоўскую хату вяртаецца нехта з горада, ствараюцца кампаніі, п'юць, бадзяюцца, крадуць па дробязі.

Сёння кожны павінен думаць пра сябе і прыкласці пэўныя намаганні, каб заняць сваю нішу ў грамадстве.

— А што гэтыя інжынеры! Я таксама змог бы інжынерам рабіць, — заявіў неяк сусед.

Можа і змог бы, але для гэтага трэба напачатку закончыць хоць бы дзесяць класаў.

Лозунг «Ад кожнага па магчымасці — кожнаму па патрэбнасці» ўжо даўно зняты з парадку дня.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Здарэнні, крымінал

МАЛОМУ МОЖА І ПАШЧАСЦІЛА

З шостага паверха дома па вул. Чырвонаармейскай у Пінску выпаў дзевяцігадовы хлопчык. Ён упаў на навес пад'езда і з траўмамі рознай цяжкасці быў дастаўлены ў гарбальніцу.

А ў Брэсце загінуў 44-гадовы беспрацоўны, які выпаў з балкона 5-га паверха.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗАГІНУЎ ТРОХГАДОВЫ ХЛОПЧЫК

У вёсцы Нябышына Докшыцкага раёна ўвечар у хаце ў выніку пажару загінуў 3-гадовы хлопчык. Яго 23-гадовая маці адправілася з грамадзянскім мужам у лес па ягады, закрыла дом, дзе ў адсутнасці дарослых адбыўся пажар. Канкрэтная прычына яго ўзнікнення ўдакладняецца.

Мясцовыя жыхары расказалі пажарным, што часта хлопчык такім жа чынам заставаўся без нагляду. Сям'я знаходзіцца на ўліку ў сельсавеце як цяжкая. Маці нідзе не працуе. Яшчэ двое дзяцей з гэтай сям'і выхоўваюцца ў інтэрнаце. Але маці не была пазбаўлена бацькоўскіх правоў. Лета часцей за ўсё старэйшыя дзеці праводзяць ў сваякоў. Вядома, што родны бацька дзяцей таксама вядзе амаральны лад жыцця.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАДЛЕТКІ «ЗАБАЎЛЯЛІСЯ». З ЛЕГКАВУШКАМІ

На працягу тыдня два вучні адной са школ Мазыра ўзростам 15 і 16 гадоў, якія знаходзяцца на ўліку ў інспекцыі па справах няпоўнагадовых і ўжо асуджаліся (адзін — за крадзяжы, другі — за рабаўніцтва), скралі чатыры легкавушкі, якія належалі жыхарам Рэчыцы, Мазыра і Гомеля. Характэрны факт: падлеткі цікавіліся аўтамабілямі толькі маркі «Жыгулі». Усе легкавушкі былі знойдзеныя ў тэхнічна спраўным стане, з чаго можна зрабіць выснову, што хлапчукі мелі намер пакатацца, павандраваць. Але гэта не знімае з іх адказнасці.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

А НА ВАДЗЕ ЗНОЎ БЯДА

За тры дні мінулага тыдня на Брэстчыне ўтапілася 5 чалавек.

У меліярацыйнай канаве каля в. Брылёва Кобрынскага раёна захлынулася трохгадовае дзіця. А дзень 4 ліпеня стаў трагічным для рыбаловаў. У р. Мухавец утапіўся беспрацоўны з Брэста. Не пашчасціла і жыхару в. Ласіцк Пінскага раёна — ён загінуў у р. Стыр.

Не знайшлі і рабочага рыбгаса «Лактышы», які пайшоў паплаваць на возера каля станцыі Люсіна Ганцавіцкага раёна.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЧЫМ ПРАВІНІЛІСЯ БІЯТУАЛЕТЫ?

Такое пытанне ўзнікла ў жыхароў Рэчыцы, калі яны даведаліся, што на набярэжнай ракі Днепр каля амфітэатра нехта падпаліў сем біятуалетаў. Камунальнае ўнітарнае прадпрыемства панесла страты больш як на 13 мільёнаў рублёў. Узбуджана крымінальная справа.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЯКАЯ МУХА ЎКУСІЛА ПЕНСІЯНЕРА

1930 года нараджэння, цяжка сказаць (гэтай справай цяпер займаецца пракуратура Савецкага раёна Гомеля), толькі вядома, што на світанні ён кінуўся з нажом на сваю нявестку і ўнучку. Першай нанёс удар у грудзі і спіну, у выніку чаго была параненая дыяфрагма і жанчына трапіла ў бальніцу, а другой — у правае прадплечча і левую лапатку. Вядзецца следства.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Простыя рэчы

КАЛЫСКА

Фота Антоля КПЕШНУКА.

Відаць, кожны свядомы беларус хоць аднойчы пабываў у Вязынцы (на рацэ, якая таксама называецца — Вязынка), тым месцы, якое звязана з дзяцінствам Янкі Купалы. Хата тая мае некалькі вянцоў ад сапраўднай, а ў хаце створана абстаноўка тагачаснай пары, канец XIX стагоддзя. І вось памятаецце — **калыска**. Так, у той хаце вісіць калыска. У ёй, напэўна ж, не люлялі паэта. Калыска ў музей прынесена з якой-небудзь вясковай хаты. Збіральнікі філіяла купалаўскага музея абыходзілі навакольныя вёскі, сябравалі і дружбіліся з іх жыхарамі, бралі-пазычалі, а то і куплялі патрэбнае, тое, што было самым неабходным у жыцці вясковай хаты.

Між іншым, на толькі што мінулым Купаллі ў Вязынцы была ўрачыстасць — адзначалася 60-годдзе музея, створанага тут. Але мы павяздзём далей размову пра калыску.

У хаце Купалы калыска найбольш распаўсюджаная на Беларусі, падвешаная да бэлькі вяроўкамі за чатыры канцы. Выраблялі калыскі з дошчачак, рэечак, плялі з дубцоў і за почапкі — да столі ці бэлькі альбо да спецыяльнай жэрдкі. Прывязвалі да калыскі вяроўку, а яе — да нагі ці рукі. Цяжка нарабіцца жанчына і ў час выкормлівання дзіцяці, а тут яно яшчэ ночы плача, турбуе. Каб не ўставаць па шмат разоў, і выкарыстоўвалі гэту вяроўку.

Часам калыскай быў проста кавалак палатна, нацягнуты на драўляную раму. Такую калыску бралі жанчыны з сабою ў поле. Што ж, лёс жанчыны быў яшчэ зусім нядаўна такім: што парадзіла — маладзец. Але тваёй работы ні ў хаце, ні ў полі ніхто выконваць не будзе. Аправілася трохі — і давай за справу. А малечу можаш з сабою ў калысцы панасіць. З калыскаю звязана шмат цудоўных народных песень.

Раса пала на травіцу,
Наша мама — парадзіца.
Раса пала на травіцу,
Наша мама — парадзіца.
Дзевяць сыноў нарадзіла,
Дзевяць сыноў нарадзіла,
А дзесятую дачушку.
Яе браты калыхалі,
Калышучы, прамаўлялі:
«Люлі-люлі, сястрыца,
Спі доўга, расі скора.
Сваёй маме на пацеху,
Чужым людзям на ўспамогу.

Увогуле ж, адпаведна Вацлаву Ластоўскаму, пасцельку для дзіцяці называлі **люлькай**. **Зыбкай** называлі калыску, павешаную на канец жэрдкі, якая, «зыбаючыся», калыша. А калыскай уласна называлі менавіта люльку, павешаную толькі на вяроўках, без зыбкі, у якой калыхалі, хібаючы ў бакі. З канца XIX стагоддзя з'яўляюцца ў беларускіх хатах **калыбкі** — дзіцячыя ложачкі, пастаўленыя на палазах, якія, ківаючы ці ў адзін ці ў другі бок, калыхалі. Ложачкі гэтыя ўжо стараліся зрабіць прыгожымі, з дэкорам. Былі яны і плеценыя. Ні я, ні мае сябрукі-аднагодкі, зразумела, ужо не зведалі ва ўзросце немаўляці калысак. Спалі-гадаваліся мы якраз у калыбках. Называлі іх нашы маці ці калыскамі, ці нават калыбелямі, што адпавядае рускаму. У народзе існавалі розныя формы. Вось як, напрыклад, на вяселлі адорвалі і прыгаворвалі-зычылі маладым:

Даю трыццаць рублёў на каравай:
Пяць на Івана,
Пяць на Сцяпана,
Пяць на Марынку,
Пяць на Арынку
Пяць на Дзяніску,
Пяць на калыску.

І ў той жа час прамаўлялася і так:

Даю рубель,
Каб была да году калыбель.

Існавала ў народзе і такое кплівае:

А ні лыжкі, а ні міскі —
Павесілі тры калыскі.

Што ж да маёй калыбкі, то бацька зрабіў яе ўласнаручна. Потым, як маці расказвае, слухала яна маладзейшым суседзям, перадавалася з сям'і ў сям'ю. А дзе знікла, у якім вогнішчы згарэла, ацяпляючы, невядома. Службу сваю саслужыла.

Калыска — гэта не толькі прылада для гадавання дзіцяці. Калыскай можа быць месца, дзе нешта ўзнікла, атрымала развіццё. Гэта ж і вісячы мост, для ўздымання чаго-небудзь на вышыню. У Алеся Звонака:

Вунь высока пад дахам ў хісткіх калысках
Аздабляюць фасады майстры-маляры.

Ад калыскі і такое паэтычнае, шчымлівае слова **калыханка**. У майго земляка Уладзіміра Дубоўкі: «І маці так застаўшыся з сынком, пакорміць і спявае калыханку».

Ад калыскі — устойлівы выраз, які азначае: змалку, з дзіцячых гадоў. Але нечакана выкарыстаў яго Кандрат Крапіва:

Ад калыскі да магілы
Выціскалі сокі,
Кроў пілі, цягнулі жылы
Каты-крывасмокі.

Увогуле можна заўважыць, што ў літаратуры старэйшых пакаленняў беларускіх стваральнікаў прыгожага слова калыска вельмі часта мае тужлівае адценне. Вось як піша яшчэ даваенны паэт (да 1939 года) Максім Танк:

Сумна з маладзіцай над малой калыскай
Ўсхліпвае песняй белая мяцель...

— Спі-засні, саколік! — быццам дождж гарачы
Так з вачэй у маткі
слёзы паплылі.

А ў Якуба Коласа таксама сумнавата:

Мяне матка не люляла,
Казак, песень не спявала.

Увогуле ж **люляць** — вельмі прыгожае слова. Люляць немаўляці адно, а можна люляць і параненую руку, як вычытаў у некага з беларускіх пісьменнікаў, можа ветрык люляць на хвалях вады гарлачыкі, як таксама недзе вычытаў. Ці як у Анатоля Вялюгіна:

Рыпіць пад ветрам дом.
Над ім люляе дрэва
дуплянку са шпаком.

Дзяцей яшчэ і гушкалі, ад гэтага пайшла **гушкалка**. Ці наадварот. Але з цягам часу гушкалкамі сталі называць і прыстасаванні, на якіх дзеці бавіліся ў летні час. Мы не ведалі слова **арэлі**. А вось гушкалку малымі прасілі сабе зрабіць. А, пасталеўшы, рабілі іх самі. Ідэальная гушкалка альбо качэлі ці яшчэ арэлі: два слупы моцна ўкапаныя ў зямлю, на іх перакладзіна, а ўжо да перакладзіны прывязана вяроўкай лавачка. Можаш раскачацца-разгушкацца сам. А можаш папрасіць каго-небудзь з сяброкоў. Дарослых праціць не дараіць. Яны будуць пакрыкваць. А без іх разгушкаешся так, што аж дух займае. Ды і дарослыя любяць гэту дзіцячую забаву. Дарэчы, любяць гушкалку кінарэжысёры. Бо прысутнічае такое раскачванне дарослых у многіх фільмах. Відаць, падабаецца рух у кадры.

Неяк шмат гадоў назад летам пачуў ад мясцовай дзятвы, сярод якой была і дачка:

— Пайшлі на «тарзанку».

Пайшоў паглядзець і я. Нічога асаблівага. Тая ж наша гушкалка. Толькі прывязвалі мы яе да дрэва над возерам ці рэчкай, замест дошчачкі ручка, за якую трымаешся рукамі. Разгойдаешся — і ляціш у ваду. Таксама дух займае, асабліва, калі вада халодная. У нашым рачным і азёрным краі калі гэтыя гушкалкі ўзніклі — невядома. Бавіліся імі і мы, а вось назву нашы дзеці прыдумалі, нагледзеўшыся замежных баевікоў і мультфільмаў. І тут успомніўся Пімен Панчанка, яго любімая мною кніга «Пры святле маланак». Ён назірае за дзецьмі і разважае:

Амаль з калыскі дакранавецца
Да цудаў веку гэты люд...
А мы раслі пад песні жніўныя,
З бярозавіку пілі квас.
І першы трактар
дзіва-дзіўнае —
На ўсё жыццё уразіў нас.

Калыску тут паэт выкарыстаў сімвалічна. Наша пакаленне ў маленстве яшчэ сустракала на местачковай вуліцы аўтамабіль, ну, не як цуд, але як вялікую рэдкасць. Але, стаўшы бацькамі, мы і не думалі выкарыстоўваць калыскі ці нават зыбалкі. Усё замянялася **калыскамі**, у якіх прыдатна было зыбаць дзіця. У ёй жа і прагульваць яго на вуліцы. Двойчы давялося ў калясцы таемна адвозіць спачатку сына, потым дачку на канспіратыўную кватэру. Так-так. Канец сямідзесятых, я працую ў рэдакцыі раённай газеты. А як жа ахрысціць? Збіралася некалькі чалавек з нованароджанымі, дамаўляліся з бацюшкам. Везлі дзяцей у калясках на такую канспіратыўную кватэру. Туды прыязджаў і свяшчэннік. Хрысціў агулам. Потым застолле.

Калі дзеці падрасталі — ставіліся для іх невялікія ложачкі. Але — крыж божа — самаробныя. На ўсё прыходзіла свая мода.

У гэтым артыкуле пра простыя рэчы зашмат вершаў. Тэма такая — калыска. І не ўтрымаюся, прывяду свой, тым больш ён крыху пра Купалле — тое, з чаго пачынаў. Верш называўся «Мінск. 1982». І пачынаўся так:

Праз фіранку бачым:
Караткевіч
Закурыў і выйшаў на балкон.
Веснавога ветрыка павевы.
П'ём віно. І нешта піша ён.
Мабыць пра калыску.
Што хваліцца —
Так і не даўмеўся прачытаць.
Вісусы вясковыя ў сталіцы,
Як мы праглі
час свой марнаваць.

Сапраўды была вясна 1982-га. Пілі мы віно ў доме насупраць тагачаснага ЦК Кампартыі Беларусі. І ў акно бачылі, як на балкон ва ўнутраны двор выходзіў на перакуры Уладзімір Караткевіч. Пісаў ён тады п'есу пра Янку Купалу, «Калыска чатырох чараўніц». Пішучы, спрабаваў дазнацца ў мінскіх знаёмых — ці ідзе дзе п'еса. Нібыта ідзе, нібыта пад іншай назвай.

Алесь КАСЦЕНЬ.

г. Паставы.

Карысны прадукт

МЁД — гэта маладосць

З даўніх часоў людзі выкарыстоўвалі мёд і іншыя пчалапрадукты для лячэння многіх захворванняў і падтрымкі свайго здароўя.

Апітэрапія (лац. apis — пчала) — гэта выкарыстанне прадуктаў пчалярства ў лячэбных і прафілактычных мэтах. Да прадуктаў пчалярства адносяцца пчаліны яд, пропаліс, пчаліны мёд, матачнае малачко, пылок, пярга, пчаліны воск. Яны прымяняюцца ў натуральным выглядзе або ў сумесях, а таксама ў выглядзе лекавых прэпаратаў.

Паводле сцвярджэння адной старажытнай кітайскай медыцынскай кнігі, «працяглае ўжыванне мёду загартоўвае волю, надае лёгкасць целу, захоўвае маладосць, павялічвае працягласць жыцця».

Мёд валодае бактэрыцыдным (антысептычным) дзеяннем, аказвае супрацьзапаленчае ўздзеянне, валодае танізуючым эфектам, нармалізуе работу страўнікава-кішачнага тракта, стымулюе функцыю ўнутраных органаў, паляпшае харчаванне скуры, нармалізуе сон, стымулюе імунітэт. У яго склад уваходзяць многія неабходныя для арганізма чалавека мікраэлементы: натрый, кальцый, магній, калій, жалеза, марганец, медзь, фосфар. Неабходна памятаць, што вартасці мёду страчваюцца падчас яго падагрэву або вытрымцы на сонцы. Не рэкамендуецца награваць мёд да тэмпературы звыш 40 °С. Водар мёду з цягам часу слабее і нават знікае, асабліва, калі мёд захоўваецца няправільна. Ягоны лепей трымаць у герметычна закрытым шкляным або керамічным посудзе пры тэмпературы 5—10 °С. Мёд хутка насычаецца рознымі пахамі, таму яго нельга захоўваць побач з прадуктамі, якія маюць востры пах.

Мёд утрымлівае неабходныя элементы для лячэння захворванняў сэрца. Мёд і пярга, ужытыя нашча, зніжаюць артэрыяльны ціск. Мёд шырока ўжываецца пры прастудных хваробах. Асабліва карысны ліпавы мёд, які выклікае невялікі патагонны эфект. Пры прастудзе рэкамендуецца ўжываць мёд з не надта гарачым чаем або цёплым малаком на ноч, з сокам лімону, малінай і іншымі лекавымі раслінамі, якія валодаюць патагонным дзеяннем. Мёд і лекавыя расліны ўзмацняюць лячэбны эфект адзін аднаго.

Для лячэбных мэтаў мёд лепей за ўсё прымаць у растворанным выглядзе, паколькі гэта аблягчае праніканне яго складных частак у клеткі і тканкі арганізма.

Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

ЧАТЫРЫ ПРАВІЛЫ СЯМЕЙНАГА ШЧАСЦЯ, альбо Як знайсці мужа па зорках?

777

Бацькі даюць нам фізічнае цела, а ўнутраную «начынку», духоўнае напаўненне закладаюць нашы бабулі і дзядулі

Ёсць легенда, згодна з якой, чалавек некалі быў цэласным, самадастатковым і шчаслівым. Аднак пасля пранікнення ў свет зла чалавека падзялілі на мужчыну і жанчыну, развялі іх па свеце, разлучылі. З таго часу кожны з нас шукае сваю палавіну для аднаўлення гармоніі і адзінства. Некаторым парам шанцуе, але далёка не ўсім. Часта шлюб завяршаецца разводам. Як гэтага пазбегнуць? Як стварыць моцную гарманічную сям'ю? Як не памыліцца ў выбары партнёра?

— Імкненне чалавека быць у пары, стварыць сям'ю прайшло тысячагадовую праверку і даказала сваю жыццяздольнасць, — тлумачыць астролаг Уладзімір Васюк. — Былі ў чалавечай гісторыі і патрыярхат, і матрыярхат, аднак усё гэта перакосы, абумоўленыя выключнымі сацыяльнымі ці прыроднымі фактарамі (войнамі, жорсткім клімatам і г.д.). Увогуле, кожны з нас мае права на шчасце, на з'яднанне са сваёй палавінай, на ўтварэнне гарманічнай сям'і. Звярніце ўвагу на само слова сям'я, якое мае сакральны сэнс, — сем-Я. «7» здаўна лічылася магічнай лічбай: 7 бачных планет на небе, 7 дзён у тыдні і 7 членаў сям'і, асноватворных структур, якія ствараюць гарманічную паўнацэнную сям'ю, — дзеці (як адзін структурны элемент), маці, бацька, бабулі і дзядулі з абодвух бакоў. Кожную з гэтых структур можна супаставіць з пэўнай планетай ці знакам задыяка. Калі ведаць гараскоп чалавека і гараскоп яго сям'і, можна дакладна апісаць розныя галіны яго жыццядзейнасці яго «грамадскай ячэйкі». Гараскоп сям'і складаецца на момант заключэння шлюбу і дае інфармацыю, у якіх бытавых умовах будзе жыць маладая пара, якія ўзаемаадносіны будуць панаваць паміж мужам і жонкай, паміж бацькамі і дзецьмі, з якімі праблемамі давядзецца сутыкнуцца сям'і, наколькі даўгавечным будзе шлюб, калі могуць узнікнуць перыяды абвастрэння адносінаў. Быў асобы раздзел астралогіі, які вывучаў праекцыю гараскопаў членаў адной сям'і на іх месца жыхарства. Калі ведаць гараскопы бацькоў, іх дзяцей і гараскоп сям'і, можна падабраць найбольш гарманічныя ўмовы пражывання, каб сям'я надоўга магла застацца сям'ёй (які зрабіць рамонт, якую каляровую гаму выбраць, на якім паверсе набываць жыллё, у якім населеным пункце пасяліцца і г.д.).

— Раскажыце, калі ласка, пра астралагічнае значэнне і ролю сям'і.

— З пункту гледжання астралогіі, наш свет пабудаваны наступным чынам: усё, што ў ім знаходзіцца, аб'яднана прынцыпам аналогіі. Чалавек (мікракосм) — ёсць адлюстраванне макракосма (Сусвету), адпаведна ўсе галіны яго жыцця — сям'я, працоўны калектыў, краіна, дзе ён жыве, — таксама з'яўляюцца праекцыяй макракосма. Кожны чалавек трапляе ў тое асяроддзе, якое аб'ектыўна для яго найбольш спрыяльна, хоць сам ён можа яго ўспрымаць як негатыўнае і агрэсіўнае. Любое асяроддзе прызвана выявіць усе закладзеныя ў асобе якасці. Карацей кажучы, кожны атрымлівае тое асяроддзе (сям'ю, працоўны калектыў, краіну і г.д.), якое ён заслугоўвае і якое максімальна раскрывае яго ўнутраны патэнцыял, накіраванасць, дазваляе рэалізаваць амбіцыі, мэты, задачы.

— Лічыцца, што асноўнымі матывамі для выбару сямейнага партнёра з'яўляюцца любоў, павага, выгада, фізічнае прыцягненне...

— ...аднак гэта якасці, якія сфарміраваліся як вынік нашых папярэдніх учынкаў. Тое, што мы адчуваем і перажываем сёння, ёсць вынік некалі закладзеных намі патэнцый. І кожны дзень, кожным сваім учынкам мы выбіраем патэнцыі на будучыню. Калі выкарыстаць прынцып аналогіі, то можна сказаць, што характар чалавека, яго ближэйшае асяроддзе (сям'я, калектыў) — з'яўляюцца вынікам яго ўнутраных праяўленых якасцяў. Чалавек, як частка гэтага свету, у залежнасці ад яго ўзроўню развіцця, мае некалькі прыступак уключэння ў вялікае цэлае. Ближэйшы ўзровень — гэта ён сам, больш аддалены — яго сям'я, наступны — калектыў, грамадства, потым — краіна, планета Зямля. Сям'я — адзін з самых бяспечных спосабаў уключэння чалавека ў вялікае адзінае цэлае.

Сям'я — адзін з самых бяспечных спосабаў уключэння чалавека ў вялікае адзінае цэлае.

Доказам справядлівасці гэтага пастулата можа служыць прамая залежнасць паміж стаўленнем дзяржавы да сямейных каштоўнасцяў і яе здольнасцю дасягаць сваіх стратэгічных мэтаў. У асобных краінах, напрыклад, у Індыі, сёння сямейная традыцыя з'яўляецца не толькі часткай іміджу дзяржавы, але і адным з дзяржаўных прыярытэтаў. Такая палітыка забяспечвае ёй гарманічнае развіццё і планамернае ажыццяўленне пастаўленых перад сабой задач. Ісламскі Усход і амерыканскі Захад маюць два процілеглыя перакосы. Увогуле, за сям'ю ў астралогіі «адказвае» Рак. Яго задыякальная процілегласць — Казярог, які «курыруе» сістэму дзяржаўнай улады і вертыкалі. Адпаведна: калі парушана раўнавага ў сям'і, то дзяржава не можа мець дакладна вызначаных мэтаў, а значыць, і дасягнуць іх. На Захадзе, дзе апошнім часам назіраецца занадта лёгкае стаўленне да сямейных каштоўнасцяў, другаснасць інстытута сям'і, яго намінальнасць, узнікаюць пытанні з выбарам дзяржаўных мэтаў і курсу. Увогуле, па суадносінах колькасці шлюбаў і разводаў можна меркаваць, наколькі правільна канкрэтная дзяржава ставіць мэты і рэалізуе іх.

— Многія вераць у Лёс, Фатум, Наканаванасць. Наколькі жорстка ўсё загадзя вызначана ў нашым жыцці, у тым ліку і магчымасць пабрацца шлюбам?

— Для ўсіх сказаць немагчыма. Ёсць гараскопы, дзе адназначна ўказана неабходнасць стварэння сям'і і магчымасць эвалюцыі чалавека менавіта ў межах сямейнага жыцця. Іншым людзям сям'я патрэбна ў меншай ступені, трэцім — яшчэ менеш. Наколькі жорсткай з'яўляецца неабходнасць у стварэнні сям'і, залежыць ад гараскопа канкрэтнага чалавека. Увогуле, у гараскопе можна прачытаць, якія асноўныя тэндэнцыі могуць мець месца ў сямейным жыцці асобы, вызначыць — будзе шлюб раннім ці познім, і ці будзе ён увогуле, адзін будзе шлюб ці некалькі, наколькі гарманічнымі ці напружанымі будуць сямейныя адносіны, колькі ў чалавека будзе дзяцей, апроч іншага — што мы атрымалі ў спадчыну (у сямейным плане) ад продкаў. Напрыклад, калі маці занадта пестуе дзіця, гэта адаб'ецца не толькі на самім малым — яго ініцыятыўнасці, уменні самастойна прымаць рашэнні, спраўляцца з праблемамі, — але і на аддаленых пакаленнях нашчадкаў. У прыватнасці гэта акажа адмоўны ўплыў на здольнасці ўнукаў праяўляць свае эмоцыі (унукі могуць быць вельмі «закрытымі», «заціснутымі»), на адносіны з процілеглым полам у праўнукаў (якія з ранняга ўзросту могуць адчуваць занадта актыўную цягу да інтымных кантактаў), на ўзаемадзеянне прапраўнукаў са сваім кіраўніцтвам (нашчадкі могуць паводзіць сябе занадта агрэсіўна і дзёрзка ў адносінах да начальства). Унук занадта тыранічнага дзеда, які заўсёды падаўляў ініцыятыву дачкі (маці ўнука), будзе мець падсвядомы страх перад больш моцнымі жанчынамі. У яго могуць узнікнуць праблемы з уступленнем у шлюб — па прычыне паталагічнай нерашучасці. У яго ўнукаў з'явіцца адваротная тэндэнцыя — неадольная прага выразіць сябе, любымі метадамі і сродкамі, вельмі верагодна, што яны будуць хуліганамі. Унукі іх унукаў могуць мець сур'ёзныя праблемы ва ўзаемаадносінах са сваякамі, а таксама праблемы з назваснікам і нервовай сістэмай.

Гараскоп сям'і складаецца на момант заключэння шлюбу і дае інфармацыю, у якіх бытавых умовах будзе жыць маладая пара, якія ўзаемаадносіны будуць панаваць паміж мужам і жонкай, паміж бацькамі і дзецьмі, з якімі праблемамі давядзецца сутыкнуцца сям'і, наколькі даўгавечным будзе шлюб, калі могуць узнікнуць перыяды абвастрэння адносінаў.

Так можна распісаць наступствы паводзінаў у сям'і на 7—8 будучых пакаленняў. Як бачыце, будаванне гарманічнай сям'і — гэта выбар, які вызначае не толькі наш сённяшні дзень, але і будучыню нашых нашчадкаў.

— Ці існуюць нейкія агульна-астралагічныя законы будавання сям'і?

— Ёсць шэраг касмічных законаў, якія згодна з прынцыпам аналогіі, могуць быць перанесены на план сямейнага жыцця. Самы галоўны з іх — закон адзінства і ўзаемадзеяння процілегласцяў. Бацька — заўсёды Інь, маці — Янь, вынік іх узаемадзеяння на сямейным узроўні — дзеці. Пры адсутнасці энергіі Інь ці Янь раўнавага ў сям'і парушаецца. Астралогія ведае, як правільна аднавіць недахоп той ці іншай энергіі, можа прадаставіць шанц адзінокім маці ці бацьку стварыць гарманічную сям'ю, а маці — ідэалагічнай перыферыяй, якая фарміруе асноўныя тэндэнцыі, што закладваюцца бацькам. Месяцам кіруе знак Рака, Сонцам — Леў і Дзева. Фактычна ўсе структуры сямейных адносінаў звязаны з трыма гэтымі знакамі. Як і ў космасе, у сям'і нехта павінен быць дамінантам, нехта падпарадкоўвацца, нехта цэнтрам, нехта — на перыферыі.

— Іерархія ў сям'і — абавязковая ўмова гармоніі?

— Менавіта так. Адзначу, што занадта эмансіпіраваная жонка, і занадта падабцасны муж — праявы парушэння раўнавагі. Іх сям'я будзе развівацца па негарманічным сцэнарыі.

— Раскрыйце сакрэт, як выбраць правільнага партнёра для шлюбу і сапраўды стварыць гарманічную сям'ю?

— Пачаць трэба з вывучэння вопыту сваіх продкаў, іх біяграфій, паспрабаваць разумець узаемасувязь іх учынкаў са сваім асабістым жыццём. На падсвядомым узроўні гэтая інфармацыя адкладзецца і дапаможа ў далейшым пазбегнуць многіх памылак. Заўважу, што бацькі даюць нам фізічнае цела, а ўнутраную «начынку», духоўнае напаўненне ў асноўным закладаюць нашы бабулі і дзядулі. Калі мы будзем ведаць біяграфію і лад жыцця продкаў, мы зможам пазбавіць сябе ад многіх цялесных і духоўных праблем і хвароб.

Другі крок на шляху стварэння гарманічнай сям'і — вывучэнне сямейных адносінаў патэнцыяльнага партнёра, яго сямейнага асяроддзя. «Скажы мне, хто твае сваякі, і я скажу, хто ты». Ісціна простая, але вельмі дзейсная. Маладыя пары часта грэбуюць абазначанымі вышэй правіламі, спасылаюцца на «натхненне», на каханне, якое аслепіла іх, а потым скардзяцца на нявдалы шлюб. Вось для таго, каб разабрацца — што гэта — каханне, страсць, фізічная прыцягальнасць — трэба датыкнуцца «каранямі», сямейнымі традыцыямі. Трэцяе важнае правіла пошуку сямейнага шчасця — вывучэнне самога сябе. Кожны чалавек перад тым, як ствараць сям'ю, павінен дакладна ведаць, кім ён з'яўляецца. Актыўная жанчына павінна ўраўнаважыць сваю актыўнасць пасіўным мужчынам, моцны характар павінен ураўнаважвацца слабым, мяккі — цвёрдым і г.д. Трэба прэтэндаваць на тое, што неабходна менавіта вам, а не тое, што прапагандуюць СМІ. Мас-медыя стварае шмат перашкод для ўтварэння нармальнай гарманічнай сям'і, штампуе ўзоры для пераймання, якія грунтуюцца ад чалавека яго сапраўдную існасць і патрэбы. Апошняе, чацвёртае правіла: пазбаўцеся ад ілюзій, што партнёра можна перавыхаваць. У кожнага члена сям'і ёсць свае ролі. Майце на ўвазе, што тая роля, якую іграў чалавек на пачатку вашых адносінаў, застанецца з ім і ў шлюбе.

Інга МІНДАЛЁВА.

Чытайце ў наступным нумары

Дыплом — без кандыдацкай...

Цяпер вядзецца работа над законапраектам, у якім прадугледжваецца, што маладыя людзі, якія скончылі аспірантуру і паспяхова прайшлі выніковую атэстацыю, але па нейкіх прычынах не абаранілі кандыдацкую дысертацыю, будуць атрымліваць дыплом даследніка. Акрамя таго, разам з дыпломам у праекце прадугледжана і матэрыяльная стымуляванне — надбаўка да заробку ў памеры двух ставак першага разраду.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.50	21.39	16.49
Віцебск —	4.32	21.37	17.05
Магілёў —	4.40	21.29	16.49
Гомель —	4.45	21.17	16.32
Гродна —	5.07	21.53	16.46
Брэст —	5.16	21.45	16.29

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Георгія, Давыда, Дзяніса, Івана, Ціхана.*
К. *Веранікі, Зянона, Мікалая.*

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	КІЕЎ	РЫГА	
+25..+27°С	+16..+18°С	+23..+25°С	
ВІЛЬНЮС	МАСКВА	С.-ПЕЦЯРБУРГ	
+22..+24°С	+22..+24°С	+18..+21°С	

9 ліпеня

Дзве даты

1939 год — Уінстан Чэрчыль заклікаў брытанскі ўрад неадкладна заключыць ваенны дагавор з СССР. Яго заклік не быў пачуты, і крыху больш, як праз месяц у Маскву прыляціць Рыбентроп. СССР знайшоў сабе іншага саюзніка.

1717 год — на Стаўбцоўшчыне заснавана Налібоцкая шкляная мануфактура князёў Радзівілаў, у якой выраблялася больш як 100 відаў высокамастацкіх вырабаў (дзейнічала да 1866 года).

Цытата дня:

«Мараль вучыць не таму, як стаць шчаслівым, а таму, як стаць дастойным шчасця».

Імануіл Кант (1724—1804), нямецкі філосаф.

РАКІ «НАСВІСТАЛІ» КРЫМІНАЛЬНУЮ АДКАЗНАСЦЬ

Дзяржінспектары з Барысаўскай міжрайінспекцыі сумесна з міліцыянерам асобнай роты палка ППСМ УУС Мінаблвыканкама на старым рэчышчы ракі Пліса затрымалі трох браканьераў.

Імі аказаліся слесар МПУ «Мінаблгаз», электрык-наладчык РУПС «Колермет» і непрацуючы грамадзянін. З дапамогай забароненых прыладаў рыбалоўства яны здабылі 51 асобіну вузкапалага рака, а лоўля яго забаронена да 15 ліпеня. Урон нанесены на суму амаль 2,7 мільёна рублёў. У Барысаўскім РУУС накіраваны матэрыял для разгляду пытання аб узбуджэнні крымінальнай справы. Дарэчы, правапарушэнне было выяўлена дзякуючы паведамленню па тэлефоне «гарачай лініі» інспекцыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Усміхнёмся!

З аднаго боку на ёй была шыкоўная вячэрняя сукенка, а з іншага боку таксама практычна нічога.

☺

Сэкс па тэлефоне.

— Я адчуваю твае вусны і рукі, аксаміт тваёй скуры. Я задыхаюся... яшчэ трохі і...

— Пачакайце хвіліначку! У мяне чайнік закіпеў!

☺

— Што ты можаш сказаць аб нашым новым начальніку?

— Шматгранная асоба!

— Так. Мне ён таксама шклянку нагадвае...

☺

Галоўная інтрыга дэтэктыва заключаецца ў тым, каб да самага канца не было зразумела, хто забойца. Галоўная інтрыга серыяла заключаецца ў тым, каб да самага канца не было зразумела, хто чыё дзіця.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении открытого аукциона по продаже права аренды земельных участков

Номер лота	1	2	3
Наименование объекта	Право аренды земельного участка	Право аренды земельного участка	Право аренды земельного участка
Местонахождение объекта	г. Сморгонь, ул. Ленина	г. Сморгонь, ул. Железнодорожная	Сморгонский район, трасса Минск—Вильнюс в районе АЗС, вблизи д. Клышки
Кадастровый номер	425650100001003318	425650100001003316	425682700001000005
Площадь участка (га)	0,1043	0,1250	1,1368
Форма проводимого аукциона	Аукцион с условием		
Срок аренды	51 год	51 год	50 лет
Условия продажи	1. Строительство детского кафе в течение 2 лет. 2. Благоустройство прилегающей территории в течение 2 лет	1. Строительство производственного здания по выпуску окон ПВХ в течение 2 лет. 2. Благоустройство прилегающей территории в течение 2 лет	1. Строительство объекта придорожного сервиса в течение 2 лет. 2. Благоустройство прилегающей территории в течение 2 лет
Начальная цена (руб.)	20352998	10034500	240618
Сумма задатка (руб.)	2035300	1003450	24062

Лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3602526000007 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 504, УНП 500108330, получатель платежа – финансовый отдел Сморгонского райисполкома.

Гражданин – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (паспорт).

Индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования.

Представителям гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

Юридическое лицо – представителям или уполномоченному должностному лицу юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о гос. регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь – представителю или уполномоченному должностному лицу иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

Представитель иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Платеж за объект осуществляется единовременно по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка Республики Беларусь.

В случае победы расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона, возмещает покупатель объекта.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

Аукцион состоится 20 августа 2008 года в 11.00 по адресу: г. Сморгонь, ул. Ленина, 5 в малом зале заседаний.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Сморгонь, ул. Ленина, 5, каб. 302 в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Телефоны для справок в г. Сморгони: 8 01592 3 23 41, 3 17 23, 3 23 91.

Заявления принимаются по 14 августа 2008 года до 17.30 включительно.

УНП 500108328

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении открытого аукциона по продаже в собственность земельных участков для индивидуального жилищного строительства

Номер лота	1	2	3
Наименование объекта	Земельный участок, 95 «В»	Земельный участок, 95 «А»	Земельный участок, 92
Местонахождение объекта	г. Сморгонь, ул. Гагарина	г. Сморгонь, ул. Гагарина	г. Сморгонь, ул. Молодежная
Кадастровый номер	425650100001003319	425650100001003317	425650100001003275
Площадь участка (га)	0,1373	0,1375	0,1376
Форма проводимого аукциона	Аукцион с условием		
Срок аренды	Продажа в собственность		
Условия продажи	Строительство и обслуживание жилого дома в течение 3-х лет с момента принятия решения райисполкома о передаче участка в частную собственность		
Начальная цена (руб.)	2843414	2847556	2869648
Сумма задатка (руб.)	284341	284756	286965

Лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в частную собственность;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3602526000007 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 504, УНП 500108330, получатель платежа – финансовый отдел Сморгонского райисполкома.

Гражданин – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (паспорт).

Индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования.

Представителям гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

Юридическое лицо – представителям или уполномоченному должностному лицу юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о гос. регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Платеж за объект осуществляется единовременно по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка Республики Беларусь.

В случае победы расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона, возмещает покупатель объекта.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

Аукцион состоится 20 августа 2008 года в 11.00 по адресу: г. Сморгонь, ул. Ленина, 5 в малом зале заседаний.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Сморгонь, ул. Ленина, 5, каб. 302 в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Телефоны для справок в г. Сморгони: 8 01592 3 23 41, 3 17 23, 3 23 91.

Заявления принимаются по 14 августа 2008 года до 17.30 включительно.

УНП 500108328

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказнага за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.791 Індэкс 63850. Зак. № 3603. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12